# «Наша Ніва»: новая старонка

«Наша Ніва» атрымала першы падарунак да 100-годзьдзя. Яе могуць выключыць з падпіснога каталёгу. Калі гэта здарыцца, будзе адгорнута яшчэ адна старонка ў гісторыі газэты. «НН» пачне па-іншаму выдавацца і распаўсюджвацца. Як атрымліваць «Нашу Ніву» ў новай сытуацыі? Старонка 3. **Аляксандар Фядута:** Няхай выкажуцца тыя, хто заўжды маўчаў. **Пётра Рудкоўскі ОП:** Пераможаныя аказваюцца пераможцамі. Старонка 4.

**№ 43 (449)** 18 лістапада 2005 **www.nn.by**

# Наша Ніва

П Е Р Ш А Я  Б Е Л А Р У С К А Я  Г А З Э Т А

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы




**Зьлева направа кіраўнікі ідэалягічных службаў: Лідзія Ярмошына, міністар адукацыі Аляксандар Радзькоў, міністар інфармацыі Ўладзімер Русакевіч, старшыня БРСМ Міхаіл Арда, рэдактар «Беларуси сегодня» Павал Якубовіч, намесьнік кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Алег Праляскоўскі.**

## Хто вы?

Думкі ў рэанімацыі пра «маўклівую большасьць» і «думаючую меншасьць». Артыкул Віталя Тараса.

Нават калі згадзіцца з тэзай аб адсутнасьці патрэбы ў аб'ектыўнай інфармацыі, і тады застаецца пытаньне: навошта? Калі насельніцтва, паводле публікацыі, ня верыць недзяржаўным мас-мэдыя, а верыць выключна дзяржаўным СМІ, навошта перасьледаваць недзяржаўныя выданьні? Навошта іх зачыняць, спаганяць фантастычныя штрафы, выкідваць з сыстэмы падпіскі ды распаўсюду? Навошта тады разрываць дамовы на распаўсюд, рызыкуючы займець судовыя працэсы ды скаргі падманутых чытачоў? Навошта тады патрэбны гучныя заявы МЗС пра недапушчальнасьць умяшаньня ва ўнутраныя справы краіны ў сувязі зь меркаванымі (!) плянамі ЭЗ наладзіць замежнае вяшчаньне на Беларусь? **Старонка 15.**

## Дзень Патронкі Беларусі



16 лістапада — Дзень іконы Маці Божай Вастрабрамскай.

Маці Міласэрнасьці з Вострай брамы ў Вільні ўшаноўваецца ўсімі хрысьціянамі як заступніца Беларусі і Літвы.

Адсюль пачынаецца Вільня. Гонар звацца сьвятым месцам брама заслужыла дзякуючы абразу Маці Божае, што быў падораны князем Альгердам сваёй жонцы, віцебскай князёўне Марыі. Штогод 16 лістапада сюды прыбываюць пілігрымы на сьвята Маці Божае Вострабрамскае з усяе Беларусі й цэлага сьвету. Яе абраз ёсьць шмат у якіх беларускіх цэрквах і касьцёлах.

## Пінігін паставіў Коласа

19 лістапада — прэм'ера касмаганічнага «Сымона-музыкі» ў пастаноўцы Пінігіна ў Купалаўскім.

Старонка 12.



## Францыя перад люстэркам

Беларусі варта ўжо цяпер ствараць дзейсную сыстэму інтэграцыі эмігрантаў у грамадзтва. Вось навука з францускіх падзеяў. З Бэрліна — **Алесь Кудрыцкі.**

Рэпартажы з Францыі абуджаюць школьныя ўспаміны. Пагледаючы на мапу на экране тэлевізара, міжволі прыгадваеш гістарычны атляс, у якім месцы галоўных бітваў былі пазначаныя маленькімі пажарамі. Што ні горад — то агеньчык. **Старонка 11.**

# Правядзеньне выбараў у Беларусі пад пагрозай

мяркуе пасол ЗША **Джордж Крол.**

Круглы стол у амбасадзе ЗША з удзелам Джорджа Крола распачаўся з жорсткай заявы пасла з нагоды шэрагу скандальных заяваў прадстаўнікоў улады і тэлеканалаў на адрас ураду ЗША і супрацоўнікаў амэрыканскай амбасады.

Паводле словаў амэрыканскага пасла, «амаль штодзённа дзяржаўныя мэдыі заяўляюць, што Злучаныя Штаты нібыта жадаюць дэстабілізаваць сытуацыю ў Беларусі, распаліць тут рэвалюцыю і падпарадкаваць амэрыканскай «імпэрскай волі». Іншыя прадстаўнікі ўраду робяць заявы пра тое, што ЗША нібыта распрацавалі плян дэстабілізацыі Беларусі ажно да інтэрвэнцыі. «У той жа час дзяржаўныя мэдыі малююць амэрыканскіх дыпляматаў як злавесных шпіёнаў. Гэтая стандартная хітрамудрая канструкцыя скажэньняў і хлусьні часоў халоднай вайны. Мая краіна адкрыта выступае за свабодныя і справядлівыя выбары ў Беларусі, вольныя СМІ, свабоду ад прымусу, запалохваньня і пагрозаў на адрас грамадзянаў ці арганізацыяў, якія імкнуцца мірна ўдзельнічаць у палітычным жыцьці нацыі».

Сп. Крол падкрэсьліў, што ЗША й надалей будуць няўхільным і актыўным фактарам па падтрымцы свабоднага выбару беларускага народу. «Гэта праверанае часам, сьвядомае абавязацельства ЗША», — сказаў ён. Гэта азначае, што дачыненьні афіцыйнага Менску й Вашынгтону перад выбарамі будуць толькі ўскладняцца. Прайшоў год з таго часу, як Злучаныя Штаты прынялі Акт аб дэмакратыі ў Беларусі. Як паведаміў пасол Крол, крокі й рашэньні ўраду ЗША, зьвязаныя з гэтым законам, знаходзяцца зараз на стадыі актыўнага разгляданьня ва ўрадзе. Рыхтуецца, напрыклад, інфармацыя пра рахункі й маёмасьць прадстаўнікоў беларускага кіраўніцтва.

ЗША, словамі Крола, будзе спрыяць незалежнаму інфармаваньню беларускага грамадзтва й незалежнаму назіраньню за выбарамі, што ўлады Беларусі задаволіць ніяк ня можа. Больш за тое, Крол адкрыта кажа, што «правядзеньне выбараў у Беларусі знаходзіцца пад пагрозай, і мы павінны праліць сьвятло ўвагі на гэта разам з Эўразьвязам». «Мы працягнем сваю працу незалежна ад умоваў і сытуацыі», — адзначыў амбасадар, жартоўна дадаўшы, што ён — вэтэран халоднай вайны.

Сп. Крол патлумачыў журналістам сытуацыю зь нявыдачай амэрыканскай візы Мікалаю Чаргінцу, які мусіў ляцець у Амэрыку па лініі ААН. Ён паведаміў, што Чаргінец падчас папярэдняга знаходжаньня ў ЗША займаўся дзейнасьцю, якая знаходзілася па-за межамі дазволенай візай, і разгляд яго наступнай заяўкі запатрабаваў больш часу. «Але МЗС Беларусі забрала заяўку на атрыманьне Чаргінцом візы да таго, як у нас была магчымасьць скончыць апрацоўку гэтай заяўкі», — сказаў Дж.Крол.

**Зьміцер Дрыгайла**

## ПОШТА РЭДАКЦЫІ

### Горадня працягвае змагацца

«Хто цяпер мае ўладу? Былыя старшыні райвыканкамаў з магілёўскай глыбінкі. Што яны бачылі? Вось і думаюць, што плітка — гэта паказчык культуры, а асфальт — цывілізацыя».

Надрукаваны ў «НН» артыкул В.Руселіка «Горадня падае SOS» (№39, 21 кастрычніка) прабіў дзірку ў маўчаньні вакол «рэканструкцыі» гістарычнага цэнтру самага прыгожага гораду Беларусі. Піша Янка Лялевіч з Горадні.

**Працяг на старонцы 14.**

## АНДРУСЬ ХРАПАВІЦКІ

### Наперадзе можа быць толькі свабода

*Імпрэсіі з інтэрнэт-форумаў-2005*

Лесьвіцы нават у неба ламаюцца
Леналы зь Ленінамі змагаюцца
Беларусі Вялікае Княства
«Паганства» рымуецца з «хрысьціянства»
Мосар гарэлкі ня п'е для турыстаў
Шыза калі ў кожным бачыш гэбіста
Эўра падае рубль стабільны
Хто ня выключыў у клясе мабільны

Мілінкевіч Пазьняк Гайдукевіч
Калякін Лябедзька Бандарэнка Шушкевіч
Грыб Севярынец Казулін Статкевіч
Вячорка Кароль Грыб Міхалевіч
Нісьцюк Карняенка Карніенка Салаш
Яшчэ хто там быў у ноўтбуку што Балаш
Вёз праз мяжу глядзіце ў этэры
На кожным канале ружовае эры

Вожык у чырвона-зялёным тумане
Шукае навобмацак Вострую браму
З кнігаю Быкава і верай пад пахай
Ты ж вожык калючы ня трэба страху
Наперадзе можа быць толькі свабода
Гадо дачакаліся апатыі годзе
Выбары прыйдуць і Ярмошына скажа
Ды што б ні сказала выйграюць нашы

*Апалачы, ЗША*



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**З Масквы Аляксандар Мілінкевіч прыехаў наўпрост у Баранавічы. Пасьля накіраваўся ў Салігорск. Потым — у Полацак. Наведаў Паўла Севярынца ды сустрэўся з выбаршчыкамі ў Новым Сітне (на фота). Разам з палітыкам падарожнічаў карэспандэнт «НН» — старонка 6.**

## СЬЦІСЛА

### Юшчанка супраць ізаляцыі Беларусі

Прэзыдэнт Украіны выступіў супраць міжнароднай ізаляцыі Беларусі, зазначыўшы, што Ўкраіна гатова падтрымаць паўночную суседку на шляху да дэмакратыі. Пра гэта Віктар Юшчанка заявіў у Парыжы на сустрэчы з прадстаўнікамі дзелавых і палітычных колаў Францыі. «Я хачу бачыць Беларусь дэмакратычнай, квітнеючай краінай, і для гэтага як прэзыдэнт суседняй краіны зраблю ўсё, каб у нечым ёй дапамагчы».

### Velcom увёў тарыф «Адзіны»

Першы апэратар сотавай сувязі GSM у Беларусі, кампанія МЛС (гандлёвая марка Velcom) увёў плян «Адзіны». Плян прадугледжвае адзіны кошт званкоў на ўсе кірункі.

### Справу Аўтуховіча ў Вышэйшым гаспадарчым

У сераду адбылося падрыхтоўчае паседжаньне ВГС. Судзьдзя Кацярына Караткевіч прызначыла дату слуханьняў на 30 лістапада. Паўтара месяца таму Прэзыдыюм Вышэйшага гаспадарчага суду скасаваў папярэднія судовыя рашэньні адносна спагнаньня з ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча штрафных санкцыяў. Аднак Дэпартамэнт фінансавых расьледаваньняў па Гарадзенскай вобласьці 14 кастрычніка завёў у дачыненьні да прадпрымальніка крымінальную справу. М.Аўтуховіч быў адразу арыштаваны і абвесьціў галадоўку. Яна доўжыцца ўжо 34 дні.

### Марыніча прызналі інвалідам

Дактары адмысловай камісіі Міністэрства аховы здароўя прызналі экс-міністра Міхаіла Марыніча інвалідам II групы. Пра гэта журналістам паведаміла жонка палітыка Тацяна. Міхаіл Марыніч, асуджаны на 3,5 гады пазбаўленьня волі, цяпер праходзіць курс лячэньня ў турэмным шпіталі пры менскай калёніі.

### Наш адказ Білу Гейтсу

У Парку высокіх тэхналёгій будзе распрацавана апэрацыйная сыстэма — альтэрнатыва кампутарнай прадукцыі «Майкрасофт». Гэта паабяцаў гендырэктар Нацыянальнага цэнтру інфармацыйных рэсурсаў і тэхналёгій Акадэміі навукі Міхаіл Маханёк. Пасьля справа будзе за драбязой — напісаць кучу іншых праграм для кампутара, паколькі большасьць іншых праграм ствараецца пад «Windows».

### Мірны прайграў, моладзь — выйграла

На выніковым турніры найлепшых парных тэнісістаў сьвету, што праходзіць у Шанхаі, Максім Мірны і Юнас Б'ёркман прайгралі і другую сустрэчу групавога турніру. У сераду, 16 лістапада, яны саступілі французам Мішэлю Лядра і Фабрысу Сантаро — 6:7, 4:6. Затое парадавала ў сераду футбольных заўзятараў моладзевая зборная. У Белай-Падляскай гадаванцы Юр'я Пунтуса ў таварыскай гульні перамаглі пагодкаў з Польшчы — 3:1.

**АР, ЗД, svaboda.org**

# «НН»: новая старонка

«Нашу Ніву» не ўключылі ў падпісны каталёг. Мы даведаліся пра гэта ад чытачоў, якія 15 лістапада спрабавалі падпісацца на газэту. Праверылі: сапраўды няма. Пры гэтым ніякіх паведамленьняў ад «Белпошты» Рэдакцыя не атрымлівала і грошы за ўключэньне ў каталёг былі прынятыя ад газэты ў звычайным парадку. Спробы дабіцца адказу ў «Белпошце» посьпеху ня мелі.

### Што гэта азначае?

Рамкі дазволенага рэзка звужаюцца. Характэрна, што адначасова з «НН», таксама без патлумачэньня, у рэспубліканскі каталёг не ўключылі шэраг рэгіянальных выданьняў. Спыненьне распаўсюду незалежных выданьняў дзяржаўнымі манапалістамі азначае забарону любой інфармацыйнай палітыкі, альтэрнатыўнай дзяржаўнай. Іншадумства пакуль дазваляецца, але гэта апошняе, што аддзяляе краіну ад таталітарызму.

«Наша Ніва» ніколі не была рупарам пэўных палітычных сілаў ці палітызаваным выданьнем. Ідзецца не пра інфармацыйны ўплыў «НН». Забарона «НН» — гэта сыгнал пра западозраньне альтэрнатыўнае думкі як такой.

Прысуд незалежнай прэсе вынесены з адтэрміноўкай выканаўньня. Гэта нахабны і самаўпэўнены спосаб заляканьня. «А мы вось прыкрыем вашы газэты, і вы нам нічога ня зможаце зрабіць».

### Што будзем рабіць?

Газэты маюць права выходзіць і распаўсюджвацца. А чытачы маюць права чытаць тыя газэты, якія хочуць. Гэта натуральныя і законныя правы. Правы чалавека і правы культуры. З гэтага мы будзем зыходзіць. Галоўнае — стаяць на сваім і не ставаць на калені.

Нашы задачы застаюцца нязьменныя. «Наша Ніва» — гэта поле, на якім расьце нацыя, творыцца незалежная культура і ўзбагачаецца мова, на якім фармулююцца нацыянальныя інтарэсы.

Выданьне будзе публікавацца на цяперашніх умовах да апошняе магчымасьці і распаўсюджвацца праз любыя магчымыя каналы. Пакуль газэта даходзіць праз падпіску і «Саюздрукі», шукайце іх там. Калі такой магчымасьці раптам ня стане, будзем дастаўляць Вам газэту праз уласную сыстэму распаўсюду. Для гэтага толькі трэба, каб усе ахвотныя — і цяперашнія падпісчыкі, і непадпісчыкі — даслалі адрасы, на якія мусіць дастаўляцца газэта.

Таксама газэта мае інтэрнэтсайт www.nn.by зь люстэркам за мяжою www.bielarus.info. На Дзень герояў 27 лістапада адчыніцца яго новая вэрсія — у новым дызайне і з новымі функцыямі.

Паўстае новая ідэалягічная і тэхналягічная сытуацыя. Калі вы аднойчы не атрымаеце «Нашай Нівы», гэта ня значыць, што газэта перастала выходзіць. Гэта значыць, што вам трэба знайсьці новы спосаб яе атрыманьня.

### Пра што гэта сьведчыць?

Выгнаньне газэтаў з падпіснога каталёгу паказвае, што, пакуль будзе такі рэжым, у краіне ня будзе ніякіх правілаў і свабодных выбараў. Значыць, незалежнае грамадзтва можа ня быць асабліва пераборлівае ў пошуку сродкаў для ўласнага выжываньня.

Што ж датычыць «Нашай Нівы»,рэгіянальных беларускамоўных газэтаў, то гэта яшчэ й культурнае злачынства. Беларуская прэса, беларускамоўныя выданьні, складаюць 15% ад усіх выданьняў, але 60% ад усіх забароненых выданьняў. Ідзе вынішчэньне беларускай культуры.

### Як гэта адаб'ецца на палітычнай сытуацыі?

Зьнікненьне незалежнай прэсы і іншыя падобныя факты робяць свабодныя выбары немагчымымі. Стратэгічна гэта моцна аслабляе сам рэжым. Дагэтуль рэжым, як бы ён ні абмяжоўваў дэмакратыі, легітымізаваўся праз нібыта свабодныя выбары. Зараз гэтага ня будзе. І гэта прывядзе да аслабленьня яго легітымнасьці. Пры свабодных выбарах такі спосаб абыходжаньня з мэдыямі гарантуе крах прыўладнага рэжыму.

Чыноўнікі адміністрацыі, захопленыя дзяльбой маёмасьці і праяданьнем сваіх мільённых заробкаў, усё далей адрываюцца ад рэальнасьці. Калі раней улада Лукашэнкі ўспрымалася як дыктатарская меншасьцю, паступова як такою яна пачынае ўспрымацца ўсё большай доляй насельніцтва.

### Захаваць незалежнасьць ад такой дзяржавы

Хай выцісканьне «Нашай Нівы» ў падпольле будзе навукай і тым, хто гатовы да дамоваў з д'яблам. Маўляў, ну і што дэмакратыя, ну і што несвабода. Галоўнае, каб нам захавалі наша культурніцкае нацыянальнае гета.

Беларуская культура мусіць дзяліць лёс свайго народу. Нацыянальнае асяродзьдзе заплаціла дыскрэдытацыяй і прыніжэньнем за абслугоўваньне акупацыйных рэжымаў у XX стагодзьдзі. Таму самае галоўнае — захаваць незалежнасьць ад такой дзяржавы.

Для будучыні Беларусі важна, каб, побач з лукашэнкаўскімі, расейскімі і амэрыканскімі, у краіне захаваліся хоць якія і хоць у якім выглядзе беларускія незалежныя мэдыі.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Калі вы аднойчы не атрымаеце «Нашай Нівы», гэта ня значыць, што газэта перастала выходзіць. Гэта значыць, што вам трэба знайсьці новы спосаб яе атрыманьня.

### Як хто адрэагуе?

Мы ведаем, што нашае выданьне масава чыталі ў многіх дзяржаўных органах. Дэлегалізацыя незалежнай прэсы будзе сыгналам усім сумленным людзям у дзяржструктурах.

### Як пратэставаць

Адзіны пратэст, які меў посьпех за апошні час — гэта дасыланьне лістоў у Міністэрства інфармацыі (пр.Пераможцаў, 11, 220004, Менск). Гэта мела эфэкт у выпадку прыпыненьня «Рэгіянальнай газеты», калі людзі пачалі масава скардзіцца.

Тое, што адбываецца зь Беларусяй цяпер, — гэта расплата за маўчаньне пры савецкай уладзе, за адсутнасьць руху пратэсту. Гэта выкупленьне савецкае віны беларусаў. Але ніхто ня скажа, што беларусы не пратэставалі супраць Лукашэнкі.

З выключэньнем «НН» з падпіснога каталёгу будзе адгорнута новая старонка ў гісторыі газэты. «НН» пачне па-іншаму выдавацца і распаўсюджвацца.

А наш галоўны пратэст — беларуская мова. На якой мы мусім гаварыць усюды, дзе толькі можна. Мовы не забароніш. Мовы не заглушыш.

У Беларусі — доўгая ноч. Трымаймася мовы як сьвечкі. Сьвітанак непазьбежны.

### P.S. Памылка?

Увечары ў сераду ў Рэдакцыю патэлефанавалі зь «Белпошты» і папрасілі не друкаваць інфармацыі пра неўключэньне «НН» у каталёг. Маўляў, пытаньне вырашаецца на высокім узроўні. «Так, вашай газэты няма ў электроннай вэрсіі каталёгу, але гэта, магчыма, памылка». Канчатковы каталёг «яшчэ не аддрукаваны» і цяпер вырашаецца, ці будзе ў ім «Наша Ніва». А як жа з каталёгамі на поштах? «Гэта варыянты, раздрукаваныя з электроннай вэрсіі». Было чуваць, што каля супрацоўніцы «Белпошты» сядзіць нейкі мужчына і падказвае ёй, як гаварыць. Такім чынам, неўключэньне «НН» у падпісны каталёг можа аказацца «памылкай». Ці гэта сапраўды так, Вы дазнаецеся з наступнага нумару.

#### Шаноўныя падпісчыкі і чытачы!

Як бы ні вырашылася гэтая канкрэтная сытуацыя, *каб і надалей гарантавана чытаць* газэту, што налета адсьвяткуе 100-годзьдзе, *дашліце на адрас Рэдакцыі* свой дакладны паштовы адрас. Тыя, хто дашле свае каардынаты ў Рэдакцыю, будуць гарантавана атрымліваць газэту — у капэртах ці іншым чынам — нават калі б ёй прыйшлося друкавацца за мяжой і распаўсюджвацца самастойна. Гэта датычыць і тых чытачоў, што прызвычаіліся купляць газэту ў шапіках.

Той, хто гатовы ў разе патрэбы дастаўляць "НН" у свой раён ці квартал ці іншым спосабам пасярэднічаць у распаўсюдзе, хто мае ідэі й прапановы, калі ласка, таксама скантактуйцеся з Рэдакцыяй.

Т.: 8-017-284-73-29,
мабільныя: 8-029-707-73-29,
8-029-613-32-32
e-mail: nn@promedia.by
220050, Менск, а/с 537

«НН» мае ў агуле **1300 сталых падпісчыкаў**.

## Чытачы «НН» прапануюць акцыі пратэсту

Чуткі пра выключэньне «НН» з падпіснога каталёгу на першае паўгодзьдзе 2006 г. выклікалі хвалю чытацкіх водгукаў на нашым інтэрнэт-форуме. Чытачка Сьвятлана напісала: «Я прывыкла шточацьвер ісьці ў шапік па «НН» — гэта адзін з элемэнтаў майго асабістага шчасьця. Ніякія таўстамясыя ідыёты ня могуць лезьці ў мой сьвет і забіраць маю газэту».

Нямала прапановаў прыйшло наконт магчымасьцяў далейшага распаўсюду. Яны будуць у разе патрэбы ўсе ўлічаныя.

Чытач, які прыкрыўся псэўданімам «PDF nas vyratue», прапанаваў ня толькі варыянт распаўсюду, але і сваю дапамогу: «Я згодны заплаціць за «НН» у PDF і раздрукоўваць яе на сваёй друкарцы бясплатна накладам да 50 штук і дасылаць па пошце ў любы рэгіён Беларусі. Ад ахвотных атрымліваць газэту такім чынам спатрэбіцца толькі аплаціць паштовыя паслугі на рассылку. Адна тэхнічная праблема — прыйдзецца вярстаць газэту так, каб яе раздрукоўваць на А4. Калі такіх людзей знойдзецца хаця б 100, мінімум 5000 газэтаў будзе распаўсюджана».

Чытач akuj падсумоўвае: «Пра рассылку — вядома ж, гэта жорстка звузіць аўдыторыю, але гэта варыянт важны ва ўмовах аблогі і інфармацыйнага голаду. Гэта будзе рэальны клюб, а гэта зможа скансалідаваць чытацкую аўдыторыю. Цяпер — час вызначыцца: я з «НН» ці не, і на што я здольны пайсьці? Адначасова вызначыцца: «НН» — гэта толькі газэта ці нешта большае? Пра сябе скажу: буду імкнуцца атрымаць Вас у такім фармаце, у якім гэта толькі будзе дасягальна».

Чытачы таксама горача выступаюць за правядзеньне акцыяў пратэсту ў выпадку забароны. Гэтак, чытачка Сьвятлана прапануе: «Чытачам Нівы трэба сабрацца і з газэтаю ў руках прыйсьці ў галоўны офіс «Белпошты». Стаць там і маўкліва чытаць газэту. Паралізаваць ім працу. Нас тысячы, і мы добрыя грамадзяне гэтай краіны, няма чаго дазваляць згнюшчацца з нашых інтэлектоўных патрэбаў». «Забяруць і адпусьцяць, — падтрымлівае ідэю пра акцыі пратэсту Hedymin. — Іхнай галоўнай задачай зьяўляецца прадухіленьне грамадзкай агалоскі. А арышты могуць прывесьці да яшчэ больших акцыяў пратэсту».

Мы разгледзім гэтыя прапановы.

Чытач «Nas vyratue PDF» прапанаваў ціснуць на «Белпошту» ня толькі з гэтага, але і з таго боку дзяржаўнай мяжы: «Добра было б папрасіць Эўразьвяз забараніць уезд у яго межы адказным чыноўнікам «Белпошты», якія фармальна прынялі гэтыя рашэньні. Няхай адпачываюць на Нарачы».

А «Абураны» адгукнуўся вершам:

Вы ўмееце толькі душыць і рэзаць,
У скрайнім разе — пінаць нагой.
Я не забуду, таварыш цэнзар,
на забарону слова майго.

Я ня з каменю, не з жалеза —
Мяне, напэўна, лёгка забіць,
Але... Я не забуду, таварыш цэнзар,
І вам ня дам пра гэта забыць!

Дзякуем усім, хто выказаў нам падтрымку.

Падпісчыкі і распаўсюднікі могуць пакідаць свае адрасы або на Інтэрнэт-форуме, або дасылаць на e-mail: nn@promedia.by, або на звычайны паштовы адрас.

# Ніколі не здавайцеся!

Гэта — знак. Піша **Аляксандар Фядута.**

Выключэньне «Нашай Ніві» з падпіснога каталёгу — гэта знак таго, што больш ніякіх ілюзій ні ў кога з інтэлігентных людзей у Беларусі адносна сапраўднай сутнасьці цяперашняй улады проста не павінна заставацца. Змагаюцца не зь дзелавымі ці грамадзка-палітычнымі выданьнямі. Змагаюцца з іншадумствам як такім.
Я даўно чытаю «Нашу Ніву». Не заўсёды і не ва ўсім пагаджаўся — і пагаджаюся — зь яе пазыцыяй. Але заўсёды прызнаваў яе права і права яе аўтараў апэляваць да сваіх чытачоў — у тым ліку і да мяне, нязгоднага, несупадальнага, ня надта любімага (калі гаварыць пра Фядуту як пра аўтара). Гэта — прымета дэмакратыі.
Да ўлады ў асобах спадароў Ганчарэнкі (міністар сувязі) і Русакевіча (міністар інфармацыі) заклікаць бессэнсоўна. Спадар Праляскоўскі і іншыя гадаванцы латыпаўскай адміністрацыйнай школы таксама прадэманстравалі, на што яны здольныя. Таму іх пазыцыя мяне не цікавіць.
Мяне цікавіць пазыцыя зусім іншых людзей.
Успомнім іх пайменна.
1. Анатоль Лемяшонак, старшыня Саюзу журналістаў Рэспублікі Беларусь. Няхай выкажацца.
2. Павал Якубовіч, галоўны рэдактар самай тыражнай і самай прафэсійнай дзяржаўнай газэты краіны. Няхай выкажацца.
3. Леанід Екель, былы кіраўнік Саюзу журналістаў. Няхай і ён, які столькі гадоў маўчаў, выкажацца — калі засталося, чым выказваць, канечне, і каму.
Няхай выкажуцца. І калі яны мысьляць так, як улада, няхай цяпер падтрымаюць яе рашэньне публічна. Урэшце, усе мы самі вызначаем уласную будучыню. Яны — таксама. Няхай вызначаць яе цяпер.
Але — ня толькі пра іх гаворка. Цяпер, пакуль мы яшчэ атрымліваем газэту з рук паштальёнаў, прашу ўсіх, хто прачытае гэты мой тэкст, перадаць у рэдакцыю «Нашай Нівы» ўсе адрасы яе сёньняшніх падпісчыкаў і чытачоў. Газэта з такой гісторыяй не павінна памерці паводле пастановы нейкага паштмайстра. Яе лёсамі распараджаемся мы — чытачы. І я хачу і буду чытаць «Нашу Ніву», нават калі я ня згодзен зь яе пазыцыяй.
Гэта — маё права. І калі я здамся, адмоўлюся ад права чытаць, думаць, дыхаць, дык — як жыць тады?

## Зварот Беларускай асацыяцыі журналістаў

Дзяржаўны манапаліст у сфэры распаўсюджваньня перыядычных выданьняў па падпісцы РУП «Белпошта» выключыла з падпіснога каталёгу на 2006 год шмат якія незалежныя газэты. Сярод іх рэспубліканскія выданьні «Народная воля», «Салідарнасць», «Згода», «БДГ. Деловая газета», «Рэгіянальная газета», іншыя недзяржаўныя грамадзка-палітычныя выданьні.
ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»:
— выказвае свой пратэст у сувязі з парушэньнямі правоў чытачоў і рэдакцый перыядычных выданьняў, выключаных з падпіснога каталёгу;
— патрабуе ад «Белпошты» забясьпечыць выкананьне заканадаўства і ўключыць у падпісны каталёг выданьні без якой-кольвек дыскрымінацыі;
— нагадвае Міністэрству сувязі і інфарматызацыі як упаўнаважанаму дзяржаўнаму органу, што ў адпаведнасьці з законам «Аб паштовай сувязі» дзяржава гарантуе даступнасьць і якасьць паслуг паштовай сувязі, у тым ліку падпіскі на газэты, і просіць спыніць парушэньне «Белпоштай» правоў і інтарэсаў падпісчыкаў і рэдакцый.
ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» зьвяртаецца да чытачоў з заклікам выступіць у абарону сваіх правоў і ў падтрымку незалежных газэт. Пратэсты і звароты трэба накіроўваць генэральнаму дырэктару РУП «Белпошта» (пр.Незалежнасьці, 10, 220050, г.Мінск, тэл. 226-01-73, факс 226-11-70) і міністру сувязі і інфарматызацыі (пр.Незалежнасьці, 10, 220050, г.Мінск, тэл. 227-38-61, факс 227-21-57).
Лісты павінны ўтрымліваць пасаду адрасата, Ваша прозьвішча, імя, імя па бацьку і адрас, указаньне на парушэньне Вашых правоў выключэньнем выданьняў з падпіснога каталёгу, патрабаваньне забясьпечыць выкананьне беларускага заканадаўства, а таксама дата і подпіс. Акрамя таго, кожны можа зрабіць запіс у Кнігу заўваг і прапаноў у сваім паштовым аддзяленьні. У адпаведнасьці з прэзыдэнцкім дэкрэтам №2 ад 14 студзеня 2005 году «Аб удасканаленьні працы з насельніцтвам» гэтая кніга павінна быць прад'яўлена па першым патрабаваньні грамадзяніна, а прапановы і заўвагі — разгледжаны на працягу 15 дзён.
Надышоў той момант, калі трэба сказаць «не» свавольству. Разам абаронім сваё права на атрыманьне інфармацыі.

**Прынята на пасяджэньні Праўленьня грамадзкага аб'яднаньня «Беларуская асацыяцыя журналістаў» 10 лістапада 2005 г.**

# Сымбалічны момант

Няма акрэсьленага пляну дзеяньня, няма гатовых рэцэптаў, «што рабіць», але ўнутры нас існуюць сілы, незразумелыя ворагам свабоды. Гэтыя духоўныя сілы трэба цяпер любой цаной актывізаваць. Піша **Пётра Рудкоўскі** ОП.

Дагэтуль аналітыкі і палітолягі кваліфікавалі беларускі рэжым як «аўтарытарызм з таталітарнымі тэндэнцыямі». Вось надыходзіць час, калі гэтую складаную назву можна спрасьціць: *таталітарызм*. Так папросту і без удакладненьняў.
Сымбалічным пачаткам гэтае «трансфармацыі» можна лічыць закрыцьцё Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту, сымбалічным канцом — выдаленьне «Нашай Нівы» і рэгіянальных выданьняў з падпіснога каталёгу. У прамежку — расправа з дэмакратычным крылом Саюзу палякаў, дэлегалізацыя эвангельскіх цэркваў, судовыя працэсы супраць «Народнай волі» і «БДГ», наступ на «Студэнцкую думку», забарона незалежнай сацыялёгіі. Далей? Што далей будзе, няцяжка здагадацца, бо лёгіка таталітарызму надзвычай простая, у поўным сэнсе слова «жалезная». Пытаньне ў іншым: што рабіць?
Пэрыяд інтэнсыфікацыі зла і няпраўды называецца ў Дабравесьці грэцкім словам «крызіс». Эвангелічны «крызіс» — гэта момант жыццёвага рашэньня: мусіш тут і цяпер вырашыць, на чыім баку будзеш. Здольнасьць зрабіць такі выбар — гэта і ёсьць той «меч», які Хрыстос прыносіць на зямлю, меч, які выконвае функцыю расьсяканьня, аддзяленьня прыхільнікаў Хрыста ад паплечнікаў Псэўдахрыста.
«Калі не навернецеся, усе гэтаксама загінеце», — гэта словы, скіраваныя Хрыстом на адрас тагачасных маральна-духоўных аўтарытэтаў непасрэдна пасьля таго, як стала вядома, што Понцій Пілат зьмяшаў кроў галілеян з ахвярамі іхнімі. «Мабыць, так ім і трэба», — думалі тады духоўныя эліты Юдэі. «Можа, так ім і трэба», — думаюць сёньня цішком многія рэлігійныя і культурныя эліты ў Беларусі, гледзячы на парушэньні правоў чалавека і перасьлед грамадзка-культурных выданьняў. Не, панове, ня так. Калі не навернецеся, *усе* ўсё будзеце мець тыя ж праблемы, што і «Наша Ніва», «Студэнцкая думка», як эвангельскія цэрквы. Бо такая лёгіка таталітарызму.
Наш беларускі час характарызуецца адной жудаснай рысай: *палітызацыя сумленьня*. Ты ня маеш права чуць, гаварыць, бачыць, адчуваць і думаць так, як ты гэта насамрэч робіш, толькі *чуць, гаварыць, бачыць, адчуваць, думаць і верыць*, як таго патрабуе Ўлада. Нам усім пагражае страшэннае калецтва — атрафія розуму, сэрца і сумленьня. Ці паўстане чарговая генэрацыя славутых «гома саветыкусаў»? Мабыць, паўстане, толькі вось гэтым разам Царква наўрад ці зможа пахваліцца, што абараняла годнасьць чалавека, што адстойвала вобраз і падабенства Бога, упісаныя ў яго душу, што *плакала разам з тымі, хто плакаў*.

* * *

Нам трэба адкрыцца тым сілам, якія дрэмлюць глыбока ў нашай душы. Трэба зразумець сутнасьць гэтага парадоксу, калі «пераможаныя» аказваюцца *ўжо* пераможцамі сілай Праўды і Дабра, за якія яны выступаюць, а «пераможцы», якія зрабіліся ворагамі Праўды, — *ужо* марныя прайгранцы.
Няма акрэсьленага пляну дзеяньня, няма таксама гатовых рэцэптаў, «што рабіць», але ўнутры нас існуюць сілы і жыватворныя памкненьні, незразумелыя ворагам свабоды. Гэтыя духоўныя сілы трэба любой цаной актывізаваць. Беларусь цяпер — як ніколі — патрабуе *бескарысьлівай* любові. Карысьлівых залётнікаў яна адстрашвае, гоніць прэч. І гэта добра.

# Беларускі партызан у краіне Лу

Зважаючы на апошнія тэндэнцыі ў сфэры недзяржаўных СМІ, узрастае роля альтэрнатыўнага распаўсюду нецэнзураванай інфармацыі. Адной з такіх магчымасьцяў стаў Інтэрнэт. «НН» прапануе агляд шэрагу сайтаў, што адносна нядаўна пачалі сваю дзейнасьць.

Вядомы маскоўскі журналіст Павал Шарамет пайшоў у віртуальнае падпольле ды стварыў разам зь іншымі журналістамі расейскамоўны сайт **«Беларускі партызан» (www.belaruspartizan.org)**. Паводле слоў стваральнікаў, гэта народны сайт, які робяць не палітыкі, не рэвалюцыянэры і не партыйныя прапагандысты. Ягоная мэта — ведаць праўду аб усім, што адбываецца ў Беларусі, і абараніць сваё права на распаўсюд аб'ектыўнай інфармацыі, а таксама права людзей на яе атрыманьне. Дызайн падкрэсьлена партызанскі, назва ды выява вусатага партызана вытрыманы ў стылістыцы апошняй вайны. Сайт зьмяшчае некалькі разьдзелаў: апэратыўная інфармацыя пра падзеі ў сфэры грамадзка-палітычнага жыцьця і эканомікі, калекцыя кніг (пераважна пра Лукашэнку), нашумелыя мультфільмы, а таксама разьдзел пад назвай «Трыбунал», на старонках якога разьмешчаны кароткія зьвесткі пра асобаў, адказных за перасьлед палітычных актывістаў, — судзьдзяў, чыноўнікаў. Сьпіс увесь час папаўняецца.
Дзьвюхмоўны (расейская і ангельская) сайт **«Euramost.org»** — інфармацыйна-аналітычная інтэрнэт-газэта. Вынятак — навіны «Свабоды» тарашкевіцай. Прапануе шырокі спэктар навін ад палітыкі да культуры, багата зьвестак з рэгіёнаў (пераважна з Гарадзеншчыны).
Сайт **«Bel-Svoboda.net»** прапануе чытачам «праўдзівую і неангажаваную» інфармацыю пра Беларусь і яе суседзяў. Група стваральнікаў выданьня плянуе знаёміць чытачоў з матэрыяламі айчынных ды замежных журналістаў, аналітычнымі аглядамі і камэнтарамі, а таксама запрашае да супрацоўніцтва ўсіх ахвотных. Таксама на сайце ёсьць магчымасьць ужо цяпер прагаласаваць за свайго кандыдата ў прэзыдэнты. На момант напісаньня матэрыялу ў віртуальных выбарах перамагае А.Мілінкевіч (38,6%). Другое і трэцяе месцы займаюць А.Лукашэнка (26,2%) і З.Пазьняк (18,7%).
Нягледзячы на перасьлед «LLL-мультаў», сайтаў сатырычнага зьместу не паменела. Але часам сатыра абражае ня толькі пэўных асобаў, але і ўсё грамадзтва. Так сайт **«Extraland.net»** Беларусь называе Бульбарусіяй, а насельнікаў — бульбарусамі, што, забыўшыся на свае карані, жывуць у вёсцы, у хатах з краю, і адзіным заняткам маюць гадаваньне сала і вытворчасьць самагону. Кіруе краінай кароль Лу. Аднак у паветры носіцца пах паленага гною — хутка выбары…
Яшчэ што кідаецца ў вочы — частае ігнараваньне некаторымі парталамі афіцыйнай назвы дзяржавы. Добра, калі выкарыстоўваюцца расейскія навіны, аднак калі нават паважаны Павал Шарамет сам называе краіну «Белоруссией». Чым не падстава жартаўнікам з «Extraland.net» для зьдзеклівых кепікаў?
Прапанаваны сьпіс сайтаў далёка ня поўны. Кожны вольны сам выбіраць, зь якіх крыніц атрымліваць інфармацыю і якую інфармацыю лічыць праўдзівай і бесстаронняй.

**Сямён Печанко**

### «СтуДумка» пад арыштам

Глянцавы моладзевы часопіс «Студэнцкая думка» адначасова сканфіскаваны з усіх менскіх крамаў. У аўторак міліцыянты складалі на крамнікаў пратаколы й бралі расьпіскі, што тыя ня будуць браць на распаўсюд «СтуДумку» надалей. Маўляў, цяпер выданьне забаронена. Сытуацыя мае праясьніцца ў чацьвер.
«СтуДумка» — беларускамоўны незарэгістраваны часопіс, што пісаў на тэмы стылю жыцьця і культуры.




# «Тарпэда» не памрэ

Футбольнае і каляфутбольнае асяродзьдзе ўстрывожылася апошняй навіной пра тое, што сталічны клюб «Тарпэда» можа спыніць існаваньне.

Каманда, заснаваная ў 1947 г., празь фінансавыя праблемы ці нежаданьне кіраўніцтва МАЗу ўкладваць сродкі ў каманду, апошнім часам зазнала шмат праблем. У 2004 г. клюб даволі пасьпяхова выступаў у вышэйшай лізе нацыянальнага чэмпіянату, але празь фінансавыя праблемы апынуўся ажно ў другой лізе. Ня склаў рук, без аніводнай паразы прайшоў увесь турнір. Пераможнае шэсьце суправаджалася абяцаньнямі адрадзіць гонар заводу, вырашыць пытаньне маштабнай рэарганізацыі інфраструктуры. Нічога не адбылося.

І вось цяпер робіцца заява пра зьліцьцё «Тарпэда» зь іншым менскім клюбам (магчыма, «Зьменай»), зьмену назвы і адмову кіраўніцтва прадпрыемства ад апекаваньня клюбам.

Шматлікія заўзятары клюбу з такім развіцьцём падзей зусім ня згодны. Найбольш актыўныя зь іх 14 лістапада зладзілі акцыю пратэсту каля прахадной МАЗу. Час для правядзеньня пікету быў выбраны ўдала — заканчвалася працоўная зьмена. Рабочым раздаваліся ўлёткі з адпаведным зьместам і характэрным зваротам «Мужыкі!». Надпісы на расьцяжках заклікалі не дапусьціць зьнішчэньня «Тарпэда». Адна з расьцяжак была выканана па-беларуску: "Забіваючы «Тарпэда» — забіваеце нас!". Доўжыўся пікет каля 10 хвілін, пакуль заводзкая ахова не пачала адбіраць расьцяжкі. Затрымалі некалькі чалавек, у тым ліку аднаго з удзельнікаў-«зуброўцаў». Затрыманых неўзабаве адпусьцілі.

**СП**

ІДЭІ

## Ствараецца хрысьціянская партыя

Палітоляг Уладзімер Мацкевіч ініцыюе стварэньне хрысьціянскае партыі. Аснову яе маюць скласьці пратэстанты.

«Пратэстанты займаюць другое месца па колькасьці прыходаў пасьля праваслаўных. А па актыўнасьці — далёка апярэджваюць іх», — кажа У.Мацкевіч — знаны палітоляг і, у свой час, вядучы ток-шоў «Выбар». Адначасна У.Мацкевіч не адмаўляе далучэньня да партыі хрысьціянаў іншых дэнамінацый: «І ўсіх, хто падзяляе хрысьціянска-кансэрватыўныя каштоўнасьці й погляды».

У першай палове 1990-х ідэю стварэньня хрысьціянскай партыі выношвалі прадстаўнікі каталікоў і праваслаўных, аднак ініцыятыва заглухла. «Ідэя стварэньня палітычнага прадстаўніцтва хрысьціянаў насьпела ўжо некалькі гадоў таму. Яе ў розных формах выказвалі розныя палітычныя дзеячы, апошнім — Павал Севярынец. Я ведаю прынамсі тры ініцыятывы па стварэньні ўплывовай хрысьціянскай партыі, якія патрабуюць узгадненьня. Хрысьціяне-пратэстанты — найбольш загартаваная і зьдзяная частка беларускага грамадзтва. Зь іншага боку, цяпер яны знаходзяцца пад ціскам улады. Таму палітычнае аб'яднаньне хрысьціянаў сёньня неабходнае і мае падтрымку з розных бакоў».

У.Мацкевіч лічыць, што сіла партыі будзе не ў яе шматлікасьці, а ва ўплывовасьці: «Напачатку будзе дастаткова неабходных для рэгістрацыі 1000 чалавек, каб працэс пачаўся. Мы разьлічваем ня столькі на колькасны рост, як на ўплывовасьць, бо хрысьціяне складаюць вялікі адсотак жыхароў Беларусі».

**Аркадзь Шанскі**

ГАСПАДАРКА

## Прыватызацыя ў выглядзе нацыяналізацыі

На гэты год бюджэт мусіў атрымаць 100 млрд рублёў ад продажу дзяржаўнай маёмасьці. У лістападзе ўрад скарэктаваў заданьне. Са ста мільярдаў ... да двух. Піша Зьміцер Дрыгайла.

Беларусь больш не прадае ні «Белтрансгазу», ні прадпрыемстваў нафтахіміі, ні піўной галіны. Продаж дзяржмаёмасьці магчымы толькі пры зьяўленьні грунтоўных замежных інвэстараў, якіх папросту няма. Унутры краіны дзейнічае адзін «інвэстар» — дзяржава, і ў Беларусі поўным ходам ідзе адваротны прыватызацыі працэс — нацыяналізацыя. Не праходзіць і тыдня, каб на нейкім ААТ не праходзілі зборы акцыянэраў, на якіх «працiскаецца» павелічэньне долі дзяржавы да 99,9%.

«Залатая акцыя» ўведзена на «Алесі», «Лідзкай лякафарбе», «Сьветлагорскім ЦКК», «Менскім фарфоравым заводзе». Дзяржава накладае лапу на ўсё, што працуе.

На наступны год пляны даходаў ад продажу дзяржаўнай уласнасьці закладзены ўжо рэальныя — у памеры 1,2 млрд. Гэта эквівалентна сямі крамам у вёсцы. У Мінэканоміцы й Мінфіне кажуць: навошта прадаваць акцыі, калі дзяржава — самы эфэктыўны кіраўнік? Здалі дзяржаўную маёмасьць у арэнду, атрымалі прыбытак ад тых прадпрыемстваў, якія яго маюць, дадалі паступленьні ў бюджэт ад дывідэндаў на акцыі акцыянэрных таварыстваў, дзе ёсьць доля дзяржавы. Што да прыватызацыі, то працэс фактычна замарожаны. Самае большае, што могуць сабе дазволіць на прадпрыемствах, — гэта так званае «ўмоўнае акцыянаваньне» прадпрыемства, калі 1—2% маёмасьці перадаюцца працоўнаму калектыву, астатняе ж захоўвае за сабой дзяржава.

### КУРСЫ ВАЛЮТАЎ

**на 17 лістапада:**
1 амэрыканскі даляр — 2 150 рублёў
1 эўра — 2 520,27 рублі
1 брытанскі фунт — 3 729,61
1 латвійскі лат — 3 619,22
1 літоўскі літ — 730,03
1 польскі злоты — 633,81
1 расейскі рубель — 74,55
1 украінская грыўна — 427,56

**Паводле Нацбанку**

З Масквы Аляксандар Мілінкевіч прыехаў наўпрост у Баранавічы. З адзіным кандыдатам па краіне езьдзіў Зьміцер Дрыгайла.

# Езьдзіць, езьдзіць

Дзясяты вагон цягніка «Масква—Прага». 10.27. На пэрон з вагону выходзіць Алесь Мілінкевіч. Яго сустракаюць два дзясяткі супрацоўнікаў штабу і актывістаў. Паездкі па рэгіёнах пачаліся. З праваслаўнага сабору.

## Ну што, Пятроўна, выберам?

11.10. Вуліца Куйбышава. Сьвята-пакроўскі сабор, куды за польскім часам вывезьлі унікальныя росьпісы з Варшаўскага праваслаўнага храму. У царкве — нікога. «Бацюшку сказалі, што прыедзе «нехта з апазыцыі». То ён кудысьці зьбег», — кажа бабуля перад уваходам. Мілінкевіч зайшоў у сабор, памаліўся, паставіў сьвечкі.

11.25. Касьцёл Узвышэньня сьв.Крыжа. Сёньня — Дзень незалежнасьці Польшчы. У касьцёле — адмысловая імша з удзелам сяброў «Польскага клюбу». Мілінкевіч заходзіць усярэдзіну, сустракаецца з ксяндзом. Хоць гэтая служба ішла па-польску, вечаровую імшу ксёндз вядзе пабеларуску.

12.00. Цэнтральны рынак. «А гэта што за начальства прыехала?» — пытае кабета, што гандлюе пальчаткамі на ўваходзе. Нехта спыняе адзінага: «Чуеце, а ці ня вы прэзыдэнтам хочаце стаць?» (Напярэдадні на рынку раздавалі інфармацыйныя бюлетэні з фатаздымкам адзінага.) Мілінкевіч: «Так».

Адзінага прыпыняе дзядок, пачынае скардзіцца на праблемы. Да суразмоўнікаў падыходзіць цётка, за ёй — яшчэ адна, у штучных футры: «Ат, нейкі твар знаёмы, такі прыгожы, ня памятаю, хто гэта». Падыходзіць кантралёр з бэджам райспажыўтаварыства. Надзея Кастусік. Цётка ў футры зьвяртаецца да кантралёркі: «Ну што, Пятроўна, выберам?» Тая ў адказ: «А што? Колькі мы яшчэ павінны мучыцца?»

Каля Мілінкевіча ўжо чалавек 15. Некаторыя прыпыняюцца, нейкі час слухаюць, шпацыруюць далей. Іншыя ўключаюцца ў размову пра падаткі, прэзыдэнцкія ўказы, паборы, выплаты, крэдыты. «150 тысяч у мяне зарплата, — кажа кантралёрка. — Гэта ж яшчэ з 20% за выслугу гадоў. Усё аддаю за кватэру. А муж робіць зваршчыкам, 250—300 тыс. атрымлівае». «Як жыць? — працягвае цётка ў футры. — Я толькі тапачкі ўчора за цэлы дзень прадала. 3 500 каштуюць. А сабе зь іх — 5%. Дык гэта ж на шклянку гарбаты». Дзядзька побач працягвае: «Нарабілі сэртыфікатаў, а потым усё чэпяцца, штрафы даюць».

«Бязь бізнэсу ніводная эканоміка ня выжыве», — рэзюмуе Мілінкевіч. Малады яшчэ мужчына, былы вайсковец, працягвае: «96 тысяч за тыя сэртыфікаты аддай. Ды па пятнаццаці інстанцыях пахадзі. Ды ўсе апошнія 10 гадоў усё жарстчэй. Глядзіце, якія палякі былі? Яны ж да нас езьдзілі! А цяпер — мы да іх…»



АНДРЭЙ ЛІНКЕВІЧ

**У Салігорску Мілінкевічу падарылі шалік «Шахцёра».**

## Хто дазволіў вам тут сустракацца

13.05. Мэмарыяльны сквэр у гонар першага Героя Беларусі, лётчыка Уладзімера Карвата. Мілінкевіч ускладае да памятнага каменя жоўтыя кветкі. Потым накіроўваецца да ўваходу на тэрыторыю Баранавіцкага дзяржуніверсытэту, што месьціцца ў будынках былой школы МУС. Да яго падыходзіць некалькі студэнтаў, потым яшчэ адна групка — усяго чалавек дваццаць. Навучэнцы эканоміка-юрыдычнага каледжу расказваюць пра вялікую аплату за навучаньне (570 даляраў у год), студэнты — пра адсутнасьць інтэрнату й тое, што вымушаны самі шукаць жыльлё, што трэба перавучвацца. Мілінкевіч адказвае: «За мяжой іншы перакос. Там даюць невялікі багаж тэарэтычных ведаў, у нас жа — амаль ня вучаць выкарыстоўваць веды на практыцы».

Студэнты-юрысты гавораць пра заканадаўства, «дубовае» шмат у якіх сфэрах, пра тое, што народ не павінен жыць па дэкрэтах і ўказах, а мусіць — па законах і Канстытуцыі. Пад гэтыя словы да суразмоўнікаў выходзіць маладая дэканка фінансава-праўвавога факультэту Марына Георгіеўна. Студэнты адразу «рассасаліся». «Хто дазволіў вам тут сустракацца? Гэта мой факультэт, я нясу адказнасьць. Гэта дзяржаўная ВНУ, і студэнты павінны дзяржаўна мысьліць».

Да размовы далучаецца невядома адкуль узьніклая начальніца ідэалягічнага аддзелу Баранавіцкага гарвыканкаму Тацьцяна Жытко: «Ідзіце адсюль. Тут вам ня плошча. Будуць выбары — будзеце агітаваць. Чаму дазволу не папрасілі на сустрэчу ў аддзеле ідэалёгіі?» Пад'жджае «козьлік» зь міліцыянтамі. Адзін зь іх падыходзіць да нас: «Што тут за мітынг? Хадземце, пагутарым». З машыны побач выходзіць здымачная група тэлеканалу «Ren-TV», міліцыянт адразу прыкрывае твар — і хутка рэціруецца ў машыну.

## Жываты ў пагонах

13.45. «Рамбыттэхніка». За сталом Мікола Статкевіч нешта рамантуе. Уваходзіць Мілінкевіч — абдымаюцца. З учарашняга дня (10 лістапада) М.Статкевіча перавялі на хатні рэжым. Цяпер ён можа начаваць у бацькі, штодня адзначаючыся ў спэцкамэндатуры. Свабода. Адзінае, што адразу тры маёры ходзяць кантраляваць.

Галоўная бухгальтарка прадпрыемства Натальля расказвае, што раней тут адбываў пакараньне бізнэсоўца, усё было ціха, а тут «па некалькі разоў на дзень прыходзяць гэтыя жываты ў пагонах».

Прадпрыемства стратнае, сьлесары атрымліваюць ня больш за 350 тысяч, а адна маладая дзяўчына ў мінулым месяцы атрымала 116 тысяч. «Працуе 31 чалавек. 26 чалавек — майстры, астатнія — кіраўнічы пэрсанал, — кажа бухгальтарка. — Чыстага прыбытку няма. Мы — дзяржаўнае прадпрыемства, але падатак на нерухомасьць (5 млн руб. на год) зьядае ўвесь прыбытак. Яшчэ й падатак на зямлю. У гарадзкім упраўленьні эканомікі й рынкавых адносінаў ведаюць пра гэта, ды што ж з таго?» Яшчэ жанчына скардзіцца, што вельмі халодна. Мы тое й самі адчуваем ужо праз некалькі хвілін знаходжаньня тут.

Тым часам Мілінкевіч, Статкевіч і дырэктар прадпрыемства, якому няма яшчэ й трыццаці, Віктар Гітчыц праводзяць закрытую сустрэчу ў дырэктарскім кабінэце.

## Якія 250 даляраў?

15.55. Плошча перад заводам аўтаматычных ліній. Пасьля зьмены выходзяць рабочыя. Некаторыя ведаюць Мілінкевіча ў твар. Некаторыя проста выказваюць зацікаўленасьць тэлекамэрай. Вось іх ужо каля двух дзясяткаў. Адна жанчына кажа, што на заводзе вельмі халодна — ацяпленьне ўключаюць толькі ў сьнежні. Другая — што яе заробак складае 234 тысячы на месяц пры 32 гадах стажу на пасадзе інжынэра-канструктара. Дзядзька побач бурчыць: «У халадзільнік няма чаго глядзець, толькі радыё ўключы, там табе скажуць пра 250 даляраў…»

Мілінкевіч запытвае: «Скажыце, нехта з вас атрымлівае тыя 250 даляраў?» У адказ — дружны сьмех. Якія, кажуць, 250 даляраў? Гэта, можа, у Менску, а ў нас тут — толькі б канцы з канцамі зьвесьці, няма больш моцы! У размову ўключаецца жанчынапэнсіянэрка, што працуе ў прафсаюзнай арганізацыі: «Як вам ня сорамна, Лукашэнка ўсю краіну з руін падняў, гэтыя Шушкевічы ўсё разваліліі, правільна ўсё прэзыдэнт робіць! Мы лепей, чым усе нашыя суседзі, жывём!»

Выходзіць дзяжурная з прахадной, кажа, што ёй пазваніў начальнік, сказаў спыніць несанкцыянаваны сход. Людзі ёй кажуць, што проста размаўляюць, ніякіх сходаў не праводзяць. Ды ня менш страх бярэ сваё, народ пачынае паціху разыходзіцца.

## Беларусы яшчэ ня вымерлі

17.00—19.00. Тэлефонная лінія ў рэдакцыі «Intex-Press». У першую гадзіну званкі не перапыняюцца, шмат якія зь іх — крытычныя. Супрацоўнікі газэты кажуць, што пазнаюць галасы журналістаў з раёнкі «Наш край», супрацоўнікаў ідэалягічнага аддзелу гарвыканкаму, актывістаў БРСМ: «Вы былі намесьнікам мэра, адарваліся ад кармушкі, зараз ізноў ірвяцеся да ўлады?», «Вы ўсіх чыноўнікаў перасаджаеце, на плошчы разьня будзе!», «Які памер грантаў, якія вы штомесяц атрымліваеце з Захаду?», «Чаго вы зьмянілі прозьвішча — вы што, не паважаеце свайго бацьку?», «За што вас узнагародзілі ганаровым сяброўствам ў Саюзе палякаў? Вы гэтага недастойны!». Мілінкевіч рэагуе спакойна: «Я нікуды ня рвуся. Я прапаную сваю кандыдатуру. Вырашаць будзе народ, а сёньня ён пазбаўлены такой магчымасьці… Я не хачу жыць у жабрацтве й страху і не хачу, каб так жылі мае дзеці… А прозьвішча я зьмяніў у юнацтве, калі атрымліваў пашпарт, бо ў майго бацькі прозьвішча немілагучнае — Баран, у маці — Мілінкевіч. Бацька быў ня супраць гэтага…»

Потым на лінію стаў «прарывацца» просты народ, пайшло шмат пажаданьняў посьпеху, прапаноў па ўдасканальваньні передвыбарнай працы, пытаньняў пра рэформу войска, аховы здароўя, адукацыі, дачыненьні з Расеяй, па ўзьяднаньні з т.зв. «адзінокімі палітыкамі». Адна жанчына нават расплакалася ў слухаўку: «Тыя беларусы, што яшчэ ня вымерлі, моляцца за вас. Але ваша галоўная задача — здабыцьцё падтрымкі ў тых, хто працуе на заводах».

Увечары — сустрэча з інтэлігенцыяй, потым — з дэмакратычным актывам. Аповеды, пажаданьні, гарбата. Гучыць голас Валера Палікарпава, былога загадчыка краязнаўчага музэю, які некалі страціў працу праз сяброўства з Ларысай Геніюш: «Даць духу людзям! Не баяцца, размаўляць, слухаць, разумець».

Баранавічы — стартавы горад вялікага ланцуга падарожжаў, задуманых Аляксандрам Мілінкевічам.

У панядзелак, 14 лістапада эстафэту ад Баранавічаў прыняў Салігорск. Прыём, арганізаваны адзінаму ў беларускім Данецку, напэўна, будзе чакаць яго і ў іншых гарадах — «ціхары» зь відэакамэрамі ды праваакцыі ў выглядзе «нацболаў» зь яйкамі.

## У нас свабодная дзяржава

Першы прыпынак — швейнае прадпрыемства «Калінка», дзе працуе паўтары тысячы чалавек, зьбольшага жанчыны.

Канец першай зьмены. На прахадную выходзіць намесьніца дырэктара па ідэалёгіі Марыя Саніковіч: «Я тут сабралася на тэрыторыю выйсьці, гляджу — а ўнізе нейкія па кустах хаваюцца». Хоць кустоў і блізка няма. «А зь імі й нейкі чалавек, добра апрануты». Спн.Саніковіч кажа, што ня варта было прыходзіць сюды: усё роўна да вас ніхто не падыдзе: «Запрасіце на плошчу, я таксама прыйду, або залю нейкую здыміце, у нас свабодная дзяржава».

Тым часам колькасьць народу перад прахадной павялічваецца — чалавек сорак. І намесьніца дырэктара пачынае нэрвавацца: «Ідзіце адсюль. Ідзіце на тое прадпрыемства, якое прастойвае, не перашкаджайце працаваць». Кабеты, што выходзяць з заводу, аж выгінаюць шыі. Але мала хто затрымліваецца. Адышоўшы, уздыхаюць з палёгкай: «Нас сёньня

# і яшчэ раз езьдзіць

сабіралі, сказалі, што нехта да нас з апазыцыі прыедзе. Дык папярэдзілі, каб ніхто ня сьмеў да іх падыходзіць. Калі падыдзем, нас адразу звольняць». На пытаньне пра тое, што яны тут зарабляюць, скардзяцца: «Што тут заробіш! 150—200 тысяч, ды ўвесь час кажуць, што сваіх грошай не адпрацоўваем».

### НБП ня сьпіць

Будынак буйнога гандлёвага цэнтру. Каля Мілінкевіча стаяць чалавек дваццаць. Бабка зь дзедам расказваюць пра «нейкіх недапечаных, што на 7 лістапада да Леніна цярновы вянок паклалі». Падыходзяць некалькі футбольных аматараў — заўзятараў чэмпіёну-2005 ФК «Шахцёр». Дзяўчына прэзэнтуе Мілінкевічу клюбны чорна-жоўты шалік. У гэты ж момант у галаву адзінага ляцісь сырое яйка. Хлапец гадоў 16—17 крычыць «НБП ня сьпіць!», кідае пад ногі людзям, што сабраліся, стос улётак з сымбалікай незарэгістраванай Нацыянал-бальшавіцкай партыі й надпісам «Даві Амэрыку, як гаўно!» ды спрабуе ўцячы. Але яго ловіць ахова.

Дзядок, які дзьвюма хвілінамі раней спрачаўся зь Мілінкевічам наконт сьвяткаваньня Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі, дзярэ энбэпэшніку вушы. Маладзёна вядуць у РУУС, складаюць пратакол пра дробнае хуліганства. Але хлопчык «навучаны» — робіць заяву, што падчас «акцыі» ў яго згубіўся мабільнік. «Пацярпелы» падазрае ахову Мілінкевіча. Міліцыя абяцае разабрацца. Хлопец наўрад ці мог проста так «сутыкнуцца» зь Мілінкевічам на вуліцы. Атрымлівае пацьверджаньне вэрсія пра сувязі беларускай НБП з гэбістамі.

Мілінкевіч працягвае сустрэчу. Кабета гадоў 60-ці кажа: «Працы няма ў горадзе. Проста так не бяруць, а як з далярамі да кіраўніцтва прыйдзеш, дык тады бяруць». Побач больш маладая жанчына дадае: «Вы на «Купалінку» схадзіце. Там нас у прымусовы адпачынак зараз адпраўляюць на два тыдні. І ўвесь час дзесяць дзён працуем, дзесяць — не. А ў мяне муж памёр, дваіх дзяцей выхоўваю. І яны не спытаюць, ці я зарабіла, ім есьці трэба. А мы душымся з нормамі, я 115 адсоткаў ад пляну выканала, 200 тысяч атрымала. А ў наступным месяцы менеі будзе. Сказалі, мо ўвогуле заробак майкамі выдадуць. І што мне рабіць зь імі? Есьці іх, ці што?»

Увечары Мілінкевіч сустракаецца на кватэрах з актывістамі. П'еца гарбата, людзі выліваюць душу. Мілінкевіч абяцае, што ад пачатку наступнага году будзе выходзіць штотыднёвая газэта дэмакратычных сілаў накладам пад паўмільёна асобнікаў. Пытаньнем будзе распаўсюд.

### Мілінкевіч хоча наведаць усё

Што ніякай дэмакратыі няма, ясна ад пачатку. Дазволаў на сустрэчы не даюць, людзей загадзя заляхваюць. Цяжка прабіваць сьцяну страху. Тыя людзі, што спыняюцца для размовы, ціснуцца да сьценаў. Гэбісцкія апэратары ходзяць блізка і здымаюць людзей. Робіцца гэта дзеля таго, каб зьбянтэжыць, напалохаць. У такіх умовах немагчыма нармальна размаўляць!

У Полацку тры машыны Мілінкевіча затрымалі на 40 хвілінаў «па падазрэньні, што яны ў вышуку». Ёсьць інфармацыя, што кіраўніцтва Рады бясьпекі і КДБ абмяркоўвала пытаньне, якім чынам зусім не дапускаць адзінага кандыдата да сустрэчаў з выбарцамі.

Тым ня менш, Мілінкевіч абяцае: «Будзем езьдзіць, езьдзіць і езьдзіць». У Беларусі 118 раёнаў. Мілінкевіч хоча праехаць усе. Палову — да Новага году. У сераду ён быў у Полацку й Наваполацку. Сёньня ён у вёсках Меншчыны. Пасьля гэтага будзе паўза, каб прааналізаваць досьвед першых выправаў.

Новага лідэра дэмакратычных сілаў суправаджае ягоны прэссакратар, былы палітвязень Павал Мажэйка, некалькі актывістаў штабу, ахоўнікі — тыя ж грамадзкія актывісты.

Паездкі слаба арганізаваныя. Фармальна яны лічацца падрыхтаванымі мясцовымі актывістамі, але фактычна адбываюцца спантанна. Мілінкевіч выцягвае сустрэчы сам. Здавалася б, чаму б разам зь ім ня езьдзіць іншым палітыкам кааліцыі? Як калісьці ў 1994-м разам з Лукашэнкам езьдзіў гарачы прамоўца Кучынскі. Толькі ў Полацку — нарэшце — далучыўся Сяргей Калякін.

Але ўсе гэтыя нараканьні разьбіваюцца ў пытаньне, на якое няма адказу: як арганізаваць лепш, калі ўсё забаронена? Калі ты б'ешся па правілах боксу, а праціўнік — муай-таю?

Урэшце, усё выходзіць на вялікі канцавы пытальнік: як перамагчы на выбарах, якіх не чакаецца? Адзінага могуць папросту не дапусьціць да ўдзелу. Не зарэгістраваць кандыдатам. Можа быць і горшае. Мілінкевіч лічыць, што пакуль галоўнае — упартасьць: «Хай не спадзяюцца. Я ўсё роўна буду езьдзіць і сустракацца зь людзьмі. Будзем зубамі грызьці, але людзей, што нам паверылі, не расчаруем. А за быдла палічаць — пойдзем на вуліцы». Тут зь ім не паспрачаесься: вуліца — адзіны аргумэнт прыхільнікаў пераменаў.

## Што на сайце Мілінкевіча?

У сераду пачаў працу афіцыйны сайт Аляксандра Мілінкевіча – www.milinkevich.org. На галоўнай старонцы адзіны прэтэндэнт, у чырвонай кашулі і пінжаку, на фоне неба.

Сярод разьдзелаў рэсурсу — інфармацыя пра адзінага, яго сям'ю. Ёсьць разьдзел «Мае думкі», дзе Мілінкевіч распавядае пра свае погляды на кааліцыйную супрацу, сытуацыю ў краіне, рэформы ў розных галінах. Фотагалерэя зьмяшчае два падразьдзелы — палітыка й «асабістае». Вялікі разьдзел — публікацыі, якія складаюцца з інтэрвію й артыкулаў пра Мілінкевіча ў беларускай і замежнай прэсе. Адмысловы разьдзел: «задай мне пытаньне».

**ЗД**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Вячэра пасьля цяжкога дня. Аляксандар Мілінкевіч з камандай у гасьцёх на прыватнай кватэры пасьля сустрэчы з салігорскімі выбарцамі.**



# «Мы жывём на вяршыні піраміды»

Артур Клінаў прэзэнтаваў візуальную паэму «Горад СОНца»

10 лістапада ў «Галерэі сучаснага мастацтва» мастак Артур Клінаў прэзэнтаваў фатакнігу «Горад СОНца». Прадстаўніца галерэі Ларыса Міхневіч сказала: «Гэты альбом не падобны на ўсё, што было зроблена раней», а кіраўнік творчага аб’яднаньня фотамастакоў Сяргей Кажамякін адразу прапанаваў Клінаву далучыцца да таварыства.

Клінаў складаў фатакнігу пяць гадоў, выбіраў незвычайныя ракурсы — і Менск раскрыўся як прывабны й страшны горад увасобленае Ўтопіі. Палац Рэспублікі, стадыён, халодны ампір сталінскае архітэктуры. І нават старасьвецкія будынкі выглядаюць у альбоме сном сярэднявечнага камуніста.

«Менск — гэта міт, — падкрэсьлівае Артур Клінаў, — гэта ўвасобленая ўтопія Кампанэлы, адзіная ў сьвеце ідэальная рэалізацыя «Гораду Сонца».

Нават камуністычная Масква была няздольная зьдзейсьніць гэты праект, бо пабаялася цалкам зьнішчыць старыя храмы й помнікі. Разбомблены Менск стаўся чыстым аркушам, які ўпадабала ўтопія.

Валянцін Акудовіч адзначыў, што невялічкая прадмова Клінава да фатакнігі — адно з найлепшых эсэ пра Менск. «Артур здолеў сфармуляваць трансцэндэнтную ідэю Менску. Гісторыя Менску — не ў падзеях, што адбываюцца, а ў разрывах паміж падзеямі. Гэта мэтафара Менску як помніка ўсім Мінскам-Менскам, якія існавалі ад самага пачатку».

Філёзаф Алесь Анціпенка зацікавіўся снамі «Гораду СОНца» і прыкмеціў эратычныя сьцені вянкоў і будынкаў. А культуроляг Максім Жбанкоў ухваліў складаньне «каталёгу мрой, выставу артэфактаў нашай агульнае несвабоды». «Клінаў — гэта змрочны прывід партызана на глямурным фуршэце. Гэта Экзарцыст — нястомны змагар з д’яблам па мянушцы Дзяржзаказ».

Незвычайныя вобразы Менску зьдзівілі й чыноўнікаў гарадзкой адміністрацыі, якім раней паказвалі альбом, — хаця шыльды «праспэкту Скарыны» на старых фота іх напалохалі.




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Клінаў параўнаў утапічны Менск з эгіпецкай пірамідай. Але ці не зьяўляецца захапленьне камуністычнай утопіяй яе апраўданьнем? «Часткова так, — адказаў мастак. — Камуністычная ідэя шчасьця як арт-праект мне сымпатычная. Гэта частка нашага дзяцінства. Можна быць антыкамуністам, але гэта тое, што ўжо немагчыма выкараніць».

Цяпер у плянах мастака — балет «Гораду СОНца».

**Андрэй Расінскі**

## Горад–СОНца Артура Клінава

**АЛЕСЬ АНЦІПЕНКА**

У гэтым горадзе ўсё: дамы, парапэты, каменныя вазы — рэальнасьць. Акрамя часу і людзей. Час — татальны саспэнс.

А людзі — рэдкія мінакі на вуліцах, падобныя да шпегаў, што імкнуцца як мага хутчэй вымкнуць сябе з пустой прасторы. Нібы тая тоіць у сабе пагрозу. Нібы яны адчуваюць, што нехта нябачны і небясьпечны цікуе за імі.

А вось яшчэ адзін мінак. Больш бясьпечным, чым вуліца, шляхам — дахам палацу опэры — ён прастуе да свайго патаемнага жытла-сховішча. Жыцьцё мяшканцаў гэтага гораду нябачнае і невядомае. Яно адбываецца недзе на паддашках, у сутарэньнях ці глыбокіх норах.

Сапраўднасьць вонкавага жыцьця тут — адно чэзлыя дрэўцы, што прабіваюцца праз каменныя сьцены. Усё астатняе — міраж, сон, трызьненьне.

Сонца па-над горадам — зыркае і няшчаднае. Разглядаць залітыя ім плошчы, дамы, палацы можна адно праз закопчанае шкельца. А праяўленыя нэгатывы нагадваюць хутчэй рэнтгенаўскія здымкі.

Напёкшы ў галаву, сонца выклікае каляровыя галюцынацыі.

І таму раптам… паўстане ў блакітным мроіве неба вялікі белы акіянскі лайнэр. А на даляглядзе — пляскаты горад на беразе цёплага мора — партовы Менск.

Хочацца працерці запарушаныя сонечным пылам вочы…

Але ўнутры горад уражвае сваёй чысьцінёй, амаль стэрыльнасьцю.

Відаць, сьмецьце, адкіды і экскрэмэнты жыхары не каналізуюць і не выкідваюць, а складуюць у сваіх норах, на паддашках, у сутарэньнях. Ці, можа, гіганцкія зеўры арак менскіх дамоў — гэта спэцыяльныя аэрадынамічныя трубы, што начамі ўсмоктваюць у сябе ўвесь пыл і бруд.

Гэты горад зачараваны штучным і даўно памерлым сонцам. Ён сьпіць. Сон яго цяжкі і каменны.

Ахоўваюць яго ўзброеныя балваны-ідалы, што, разьмясьціўшыся на самых высокіх будынках гораду, сочаць за кожным, хто зьявіўся на плошчы ці вуліцы…

Як і належыць, на самай Цэнтральнай плошчы гораду, на франтоне Храму Прафсаюзаў, разьмясьціліся ягоныя Багі. Гэта Зэўс-рабочы з малой Атэнай Паладай Менскай на руках, службовец у мундзіры і савецкі інтэлігент 1950-х гадоў. Побач зь ім — жонка службоўца, непадступная жрыца каханьня *пие*. Няма чаго зьдзіўляцца яе аголенасьці. У Горадзе Сонца, што і натуральна, шмат эратычных сымбаляў. Гэта і масіўныя, бессаромныя калёны, і шматлікія шары, параскіданыя па ўсім горадзе. Нарэшце, фалічныя вежы і помнікі. А на фасадах дамоў — безьліч стылізаваных пад вянкі сонечных колаўпохваў… І шмат, шмат дзіўных каменных расьлінаў з Эдэмскага саду.

У гэтым горадзе спаць і сьніць — насамрэч адно і тое ж. Ня варта трывожыць сон гэтага гораду.

Некалі ён спатоліцца ім і прачнецца.

**Артур Клінаў. Горад СОНца.** Візуальная паэма ў трох частках. Фотаальбом. — Менск: Логвінаў, 2006. — 130 с.

# Рок на радзіме «BN»

Каржакаваты вакаліст заводзіць: «На ўсім абшары смачней за ўсё кальмары!» Заля падпявае далей: «За бульбу, і за скварку, і за гарэлкі чарку!»

На акцыю «Рокавая восень» у Бярозу дамовіліся паехаць разам з «IQ-48», але тыя выехалі на самым першым цягніку а шостай раніцы — так таньней. Я ж заплаціў лішнія тры тысячы за дзьве гадзіны сну і паехаў пазьней.

Рок-канцэрты ў Бярозе праходзяць зрэдку ды на дрэннай апаратуры. Частыя госьці тут — Саладуха, Каліна, Ухцінскі, фанэрныя сьпевакі. Мясцовыя фундатары культуры, мясакамбінат, напрыклад, гатовыя плаціць за іх выступы шалёныя грошы. Рокерам — не. Апаратуру для «Рокавай восені» замаўлялі ў Берасьце за свае, а каманды гралі безганарарна.

Алесь Лютыч, лідэр мясцовай каманды «BN», — мясцовая знакамітасьць. Калі група выступае ў родным горадзе, падлеткі ўсе афішы зрываюць за тыдзень да пачатку — на сувэніры. Музыка працуе на мясцовым заводзе па вытворчасьці пліткі, часьцяком адпрошваецца на канцэрты ў Польшчу. Адпускаюць з ахвотай, у ягоным пакоі — процьма афішаў з выступаў у Беластоку, Варшаве, Бельску-Падляскім, Познані. Зь Менску — аніводнай…

На канцэрт прыехала старшыня Беларускай асацыяцыі студэнтаў у Польшчы Ілона Карпюк. Яна ад «БН» у захапленьні: «Яны на «Басовішчы» ўжо каторы год у хедлайнэрах. Польскія музыкі, калі заводзім размову пра беларускі рок, адразу згадваюць «BN» і «N.R.M.»

Побач з палацам культуры стаяць хлопцы зь яшчэ адной мясцовай каманды — «Кальмары». Глядзяць на прывезеныя калёнкі і кажуць: «Няўжо ўпершыню на нармальным апараце сыграем?» Музыкі — у саламяных брылях, з інструмэнтамі, што прайшлі праз дзясятак рук. Каржакаваты вакаліст заводзіць: «На ўсім абшары смачней за ўсё кальмары!» Заля падпявае далей: «За бульбу, і за скварку, і за гарэлкі чарку!»

Група «Сьцяг» з Пружанаў яшчэ няўмела торгае струны, а вакаліст сьпявае кпіталту «Калі цябе няма, я кахаю без ума». Аднак мясцовыя ставяцца да іх усё адно добразычліва. Свае ж і па-свойму пяюць!

Сапраўднае сьвята ладзяць «IQ-48». З кожным выступам каманда выглядае ўсё круцейшай. Годзе называць іх «маладымі і таленавітымі»! Публіка скача ў захапленьні ад «Карыды», «Выйсьця», «Сьвятла ў цемры». Старэйшыя сядзяць на зэдліках і ўсьміхаюцца, калі ўся заля пад кіраўніцтвам вакаліста Сашы Ракаўца скандуе: «Сэкс! Сэкс! Сэкс!»

За гэдлайнэра — «BN». Некалі яны гралі ў салянцы ў клюбе «Гудвін», і адзін з арганізатараў папрасіў іграць ціпшэй, у адказ хлопцы адключылі свае інструмэнты. У гэты дзень «бярозаўцы» прасілі музыкаў сыграць гучней.

**Сяргей Будкін**



**Алесь Лютыч, саліст гурту «BN», — бярозаўская знакамітасьць.**

# У беларусаў — добры гумар, у расейцаў — глямур

Андрэй Курэйчык склаў сцэнар для расейскага бомба-фільму.



**«Наша Ніва»: Дэбютуеце ў кіно?**

**Андрэй Курэйчык:** Так, я усё лета адпрацаваў у Маскве. Галоўны прадусэр стужкі — генэральны дырэктар Маскоўскага кінафэстывалю Рэнат Даўліцьяраў, ёсьць прадусэры і зь міхалкоўскай кампаніі «Тры Т». Месяц я пражыў у Доме вэтэранаў кіно. Там мяне замкнулі, прывезьлі кампутар, прынтэр — і я на працягу некалькіх тыдняў даводзіў сцэнар. Здымаць будзе Аляксандар Стрыжэнаў («180 і вышэй», «Упасьці ўверх»). Фільм мае вялікі бюджэт для камэдыі — 1,5 млн. Запланаваны здымкі ў Нью-Ёрку, Маскве.

**«НН»: Сцэнар Вы самі прапанавалі расейскім вытворцам?**

**АК:** Мая п'еса «Выканаўца жаданьняў» трапіла прадусэру Аляксандру Алейнікаву. Было два варыянты: ці яны проста купляюць правы на п'есу і сцэнар пішуць маскоўскія сцэнарысты, ці я сам складаю кінасцэнар. Пасьля таго як я напісаў частку сцэнару, мне далі карт-блянш.

**«НН»: Але ж «Выканаўца жаданьняў» — просьценькая караценькая п'еса…**

**АК:** Сцэнар адрозьніваецца на 95 адсоткаў. Пазычаны толькі ход ператварэньня жанчыны ў мужчыну і наадварот. Усё астатняе кардынальна зьменена.

**«НН»: А не баіцеся расейскай глямурнай няпраўды?**

**АК:** Галівуд таксама здымаў суцяшальныя фільмы ў часы Вялікай дэпрэсіі: людзі выкідваліся з вокнаў, а на экране панавала раскоша. Мастацтва не абавязана вырашаць праблемы грамадзтва. Яно мусіць альбо шчыра гаварыць пра іх, альбо адводзіць ад іх.

**«НН»: А ці ёсьць у фільме беларускія элемэнты?**

Пакуль у Беларусі ня будзе здаровага рынку, ні ў воднай галіне мастацтва людзі ня змогуць сябе праявіць.

**АК:** Зь Беларусі прыўнесены гумар. І тыя жарты, якія я запісаў, я чуў тут. Калі браць культурныя архетыпы, то быў даволі жорсткі адбор. Ад беларусаў — добры гумар, ад расейцаў — глямурная рэальнасьць, дзе ўсё і адбываецца.

**«НН»: А ў Беларусі паступалі прапановы на пастаноўку фільмаў паводле вашых твораў? Ці існуе забарона?**

**АК:** Мы распачыналі працу з Аляксандрам Яфрэмавым. Быў сцэнар з Уладзімерам Янкоўскім. Але гэты фільм паводле сцэнару высокабюджэтны, праца пакуль ляжыць. Я ня думаю, што на «Беларусьфільме» магчымы запуск майго сцэнара.

**«НН»: З палітычных прычынаў?**

**АК:** У Маскве, калі сцэнар купляецца, табе выплачваецца сума, запісаная ў дамове, дзе ўсе абавязкі ясна пазначаныя. Табе ствараюць умовы: здымаюць гатэль, даюць тэхніку, аплачваюць харчаваньне. Прадусэры зацікаўленыя, каб быў добры сцэнар: тады фільм прынясе прыбытак. На «Беларусьфільме» грошы спускаюцца зьверху, і здзе справаздача, што «іх скарысталі». Сцэнарыст — чалавек, якім усе панукваюць…

**«НН»: Але ж вы з прадусэрамі абмяркоўвалі кожную рэпліку, кожную сцэну. Ці ж гэта не ідэалягічны ціск?**

**АК:** Прадусэры — удзельнікі творчага ядра, якія душой хварэюць за фільм. У іх няма пазіцыі: «Мы галоўныя самадуры». Прапановы — каб зрабіць найлепшы фільм. У Беларусі нікога не цікавіць, пра што фільм, як ён будзе прадавацца, у якіх кінатэатрах будзе ісьці.

**«НН»: Месца ў Беларусі сцэнарыстам не знаходзіцца. Ці магчыма выправіць такую сытуацыю?**

**АК:** Усё выпраўляе нармальны здаровы рынак — тэатральны, сцэнарны, рынак фільмаў. Паколькі ў Беларусі рынку такога няма, ні ў адной галіне мастацтва людзі ня могуць сябе праявіць. Пакуль ёсьць дзяржаўная манаполія, дзяржава будзе па-валюнтарысцку пазначаць, з кім яна будзе працаваць, а з кім — не. Ляяльным яна будзе даваць працу — незалежна ад таго, таленавіты чалавек ці бяздарны. А рынак зыходзіць зь якасьці: добры прадукт прадаецца, кепскі — не. Пакуль ня будзе рынку, паляшпэньня ня будзе.

**«НН»: А ёсьць жаданьне папрацаваць у Беларусі і зь беларускай фактурай?**

**АК:** Канечне. Сцэнар, над якім я зараз працую, зьвязаны зь беларускімі рэаліямі, дзеяньне адбываецца ў глыбінцы…

**Гутарыў Андрэй Расінскі**

## Новая кнігарня

9 лістапада ў Менску ў будынку па вуліцы Багдановіча, 25 адчынілася кнігарня «Духоўная кніга».

У кнігарні багата літаратуры па-беларуску: творы Яна Паўла II, рэлігійныя дапаможнікі, «Дзіцячая Біблія», гісторыі сьвятых, часопісы «Наша вера» і «Ave Maria». Кніга Ўладзімера Конана «Ксёндз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэньне ў Беларусі» суседнічае з «Гадарай» Ірыны Жарнасек, вершамі Н.Гілевіча і Д.Бічэль-Загнетавай, а зборнічак Янкі Брыля «Блакітны зьніч» пазначаны аўтарскім аўтографам з зычэньнем усяго найлепшага.

Амаль цэлая паліца застаўлена кнігамі Аляксандра Меня, ёсьць збор твораў Уладзімера Салаўёва й дасьледаваньні Сяргея Аверынцава. Нават дыялёгу паміж ісламам і хрысьціянствам прысьвечаны дзьве кнігі; ёсьць працы пра дыялёг навукі й рэлігіі. У будучыні плянуецца продаж відэафільмаў.

Кніжня заснавана Менска-Магілёўскай архідыяцэзіяй, а блаславіў адкрыцьцё кардынал Казімер Сьвёнтак.

**Андрэй Расінскі**

## СЬЦІСЛА

### Габэлены ў Горадні

У галерэі Тызэнгаўза ў Горадні адкрылася выстава полацкай мастачкі Таццяны Козік. Выстаўлены 27 работ — габэлены, акварэлі, батык, алей. Галерэя месьціцца ў сутарэньнях «крывой афіцыны» — пабудаванай у XVIII ст. А.Тызэнгаўзам камяніцы музычнай акадэміі.

На адкрыцьці граў гарадзенскі гітарыст Уладзімер Захараў.

**Сяргей Максімовіч,**

**Нашчадкі Гарэцкага**

# Пуціна ня будзе

Замежная прэса перамывае косткі новым крамлёўскім фаварытам. Замежную прэсу аглядае Алесь Кудрыцкі.

Прэзыдэнцкая гонка ў Расеі пачалася — такую выснову робяць журналісты буйных выданьняў. Міністар абароны Сяргей Іваноў зрабіўся па сумяшчальніцтве віцэ-прэм'ерам, а кіраўнік прэзыдэнцкай адміністрацыі Дзьмітры Мядзьведзеў перасеў на крэсла віцэ-прэм'ера, саступіўшы былую пасаду цюменскаму губэрнатару Сяргею Сабяніну. Хто зь іх мае найбольшыя шанцы сесьці на месца Пуціна ў 2008 г.?

### І бязьмежная вернасьць патрону

Брытанская **«Гардыян»** называе тое, што адбылося, «нечаканай ператасоўкай»: «Пуцін упершыню зрабіў адкрыты намёк на тое, каму, магчыма, ён даверыць уладу ў 2008 г.». На думку «Гардыян», ход Пуціна дапаможа запоўніць палітычны вакуўм, які ўтварыўся праз бязьдзеяньне Крамля і актывізацыю апанэнтаў расейскага прэзыдэнта. «Гардыян» адзначае вернасьць Крамля традыцыі ставіць на высокія пасады малавядомых палітыкаў кшталту цюменскага губэрнатара Сяргея Сабяніна. Разам з тым перастаноўкі не абяцаюць нічога добрага прэм'еру Фрадкову, якому давядзецца праставаць дарогу камусьці зь віцэ-прэм'ераў, узяўшы на свае плечы цяжар віны за палітычныя няўдачы апошняга часу.

«Гардыян» прыводзіць словы ананімнай крыніцы ў Крамлі, паводле якой найбольшыя шанцы зрабіцца пераемнікамі Пуціна маюць Мядзьведзеў і Іваноў. Пры розьніцы характараў іх аб'ядноўвае бязьмежная ляяльнасьць патрону. Пры гэтым Пуцін мае больш блізкія дачыненьні з Івановым, чым з адносна маладым Мядзьведзевым.

«Гардыян» робіць наступную выснову: перастаноўкі ва ўрадзе Расеі сыгналізуюць пра тое, што памяркоўныя калякрамлёўскія колы атрымалі перамогу над сілавікамі савецкай загартоўкі.

### Ход трыма фігурамі

У адрозьненьне ад «Гардыян», якая сьцьвярджае, што Іваноў ня рвецца ў прэзыдэнцкае крэсла, журналісты **«Таймз»** прадказваюць жорсткую барацьбу паміж Сяргеем Івановым і Дзьмітрыем Мядзьведзевым. Газэта таксама паставіла крыж на «бляклым» Фрадкове, ад якога Пуцін «пазбавіцца ў наступным годзе, калі прэзыдэнцкая кампанія набярэ абароты». За два гады да выбараў прэзыдэнцкая гонка пачалася — піша «Таймз». Гэты час будзе скарыстаны для раскруткі ня надта вядомага Дзьмітрыя Мядзьведзева.

Журналісты брытанскай **«Файнэншыял Таймз»** таксама мяркуюць, што Пуцін ставіць на Мядзьведзева. С.Іванову давядзецца задаволіцца роляй «рэзэрвовага кандыдата», які ўступіць у барацьбу толькі тады, калі з гонкі па той ці іншай прычыне выбудзе галоўны фаварыт.

**«Асашыейтэд Прэс»** называе кадравыя рашэньні расейскага прэзыдэнта ходам трыма фігурамі. А тое, што да выбараў яшчэ жыць ды жыць, значыць, што Іванову і Мядзьведзеву далі выпрабавальны тэрмін, за які яны павінны паказаць, на што здатныя. Таму лічыць іх прэтэндэнтамі на гонар называцца пераемнікамі Пуціна занадта рана. А Сяргей Іваноў, на якім каменем ляжыць цяжар патанулага «Курску», наагул мае невялікія шанцы атрымаць падтрымку насельніцтва.

«Файнэншыял Таймз» называе Мядзьведзева «найбольш ляяльным прыслужнікам Пуціна» і мяркуе, што «прызначэньне яго пераемнікам прывядзе да мінімальных ці наагул нулявых перамен у палітыцы Пуціна, а ўлада застанецца ў руках крамлёўскіх вярхоў». Новы першы віцэ-прэм'ер атрымае неблагую фору: месяц таму Пуцін прызначыў Мядзьведзева кіраўніком Савету нацыянальных праектаў — органу, які будзе разьмяркоўваць мільярды даляраў для выкананьня сацыяльных ды інфраструктурных праектаў.



І Пуціна



...і Мядзьведзева



PHOTO.BYMEDIA.NET

...і Іванова зьвязвае месца нараджэньня — усе яны «піцерскія».

**«Файнэншыял Таймз Дойчлянд»** згаджаецца: Пуцін даў старт прэзыдэнцкай кампаніі. Аднак сынхронныя прызначэньні гавораць і пра тое, што прэзыдэнт вагаецца наконт кандыдатуры пераемніка — інакш павышэньне атрымала б толькі адна асоба. І Пуціна, і Мядзьведзева, і Іванова зьвязвае месца нараджэньня — усе яны «піцерскія».

Выданьне адзначае, што Пуцін таксама зрабіўся прэзыдэнтам па прызначэньні — дзякуючы Ельцыну. Пры гэтым ён ужо пасьпеў «зьняць з дыстанцыі» такога небясьпечнага суперніка, як Міхаіл Хадаркоўскі, які цяпер сядзіць за дротам у Сібіры.

Перастаноўкі ва ўрадзе — першы крок да вызначэньня пераемніка Пуціна ў 2008 г., падводзіць рысу **«Франкфуртэр Альгемайнэ Цайтунг»**.

**«Ное Цурхэр Цайтунг»** іранізуе з нагоды своеасаблівага адраджэньня манархічных традыцый пераемнасьці ўлады ў Расеі: «Такім чынам, Дзьмітры Мядзьведзеў вылучаецца ў першы шэраг патэнцыйных кронпрынцаў». Швайцарская газэта ўказвае на тое, што Пуцін загадаў накіраваць значную частку даходаў ад продажы сыравіны на разбудову нацыянальнай інфраструктуры, паляпшэньне сыстэмы аховы здароўя і адукацыі. Менавіта за гэтыя сфэры цяпер і будзе адказваць Мядзьведзеў, што дасьць яму магчымасьць «стварыць свой вобраз у вачах грамадзкасьці».

Газэта адзначае, што цесна зьвязаны з «Газпромам» лібэральны тэхнакрат Мядзьведзеў лічыцца адным з галоўных апанэнтаў групы пад умоўнай назвай «сілавікі». Аднак канчатковы лёс «кронпрынца Мядзьведзева» вырашыцца не раней за 2008 г., «а да таго часу можа шмат чаго адбыцца», піша газэта.

Як і большасьць расейскіх выданьняў, **«Известия»** спрабуюць адказаць на пытаньне: «Што азначаюць кадравыя перастаноўкі ва ўрадзе?»

### Расейскімі вачыма

«Ня выключана, што для Мядзьведзева настаў час стажыроўкі перад скачком на пасаду прэм'ер-міністра і, калі ў яго ўсё пойдзе добра, ён зробіцца прафілюючым кандыдатам у пераемнікі». Іванова газэта называе «запасной кандыдатурай». Прызначэньне кіраўніком прэзыдэнцкай адміністрацыі С.Сабяніна «Известия» тлумачаць патрэбай Пуціна ў чалавеку, «максімальна далёкім ад крамлёўскіх раскладаў», які да таго ж мае сувязі з рэгіянальнымі элітамі.

«Пуцін можа разглядзець кадры нават праз чорныя акуляры», — піша **«Комсомольская правда»** і называе прэзыдэнцкія рашэньні «самай маштабнай перастаноўкай фігур на вялікай палітычнай мапе Расеі за апошнія пяць год».

Газэта не выключае, што адной з функцый Мядзьведзева можа быць падрыхтоўка глебы для пераходу Пуціна на пасаду прэм'ера пасьля заканчэньня тэрміну яго прэзыдэнцтва.

**«Независимая газета»** зьмяшчае матэрыял пад загалоўкам «Мядзьведзева кінулі на Белы дом». Перастаноўкі яна таксама характарызуе як «спэцаперацыю «Пераемнік». Газэта не выключае магчымасьці таго, што Пуцін проста выпрабоўвае зьвязку Мядзьведзеў—Іваноў у якасьці гаспадароў Крамля і Белага дому. Разам з тым, выданьне засьцерагае ад канчатковых высноў: Пуцін заўжды дзейнічае па непрадказальным сцэнары.

«Напаўпераемнікі» — такую мянушку падабрала газэта **«Коммерсантъ»** для Іванова і Мядзьведзева. Выданьне прытрымліваецца думкі, што ім яшчэ давядзецца шмат папрацаваць, каб давесьці, што яны гатовы замяніць Пуціна ў 2008 г.

На думку журналістаў «Коммерсанта», гаворка ідзе ня проста пра кадравыя ракіроўкі, а пра зьмены ў самой канструкцыі выканачай улады — «малы пераварот». Урад, які пасьпеў ператварыцца ў бездапаможны тэхнічны орган, значна ўзмоцніцца з прыходам у яго людзей Пуціна. Адпаведна, варта чакаць паслабленьня пазыцый прэзыдэнцкай адміністрацыі.

**«Московский комсомолец»** не выключае, што Мядзьведзева маглі прызначыць «аўральным мэтадам» — у сувязі з пагаршэньнем стану здароўя М.Фрадкова. Крэсла першага віцэ-прэм'ера — «публічная, усімі вятрамі прастрэльваная пасада». Прызначэньне нясе ў сабе небясьпеку для Мядзьведзева: усё-такі Пуцін будзе прымаць канчатковае рашэньне пра пераемніка толькі праз два гады.

Праўрадавая **«Российская газета»** назвала кадравыя прызначэньні ня менш як сэнсацыяй, аднак тлумачыць яе сэнс даволі цьмяна. Паводле выданьня, галоўная інтрыга заключалася ў тым, каго прызначаць адказным за выкананьне «прыярытэтных нацыянальных праектаў». Газэта захапляецца стылем раптоўных кадравых рашэньняў прэзыдэнта і таямнічым выразам яго твару. Прызначэньні тлумачацца жаданьнем расейскага прэзыдэнта ўзмацніць урад і свой уплыў на яго, а «праект «Пераемнік», падаецца, ня больш як чутка.

Усе расейскія газэты суправаджаюць свае матэрыялы апытаньнямі шматлікіх экспэртаў ды разгорнутымі біяграфіямі новых прызначэнцаў, што цалкам лягічна — большасьць расіян нічога ці амаль нічога ня ведаюць пра людзей, аднаму зь якіх, выглядае, вось-вось адпішуць кіраўніцтва Крамлём ды ўсёй краінай.

Polonia
POLSKIE RADIO

**з 1 лістапада** пашырылася рэтрансьляцыя перадач беларускай службы радыё **«Палёнія»** — праграмы для замежжа Польскага радыё. «Baltic Waves» рэтрансьлюе аднагадзінную перадачу апоўначы на сярэдніх хвалях (частата 612 кГц), а «Radio znad Wilii» — дзьве паўгадзінныя перадачы: у 4.30 і 22.00 на ультракароткіх хвалях (103,8 МГц).

Перадачы беларускай службы радыё «Палёнія» можна слухаць на кароткіх хвалях у **16.30** і **19.30** (частоты 6035 і 7180; 6050 кГц), па спадарожніку «Eutelsat II F–6 Hot Bird» (13° усходнее даўжыні, частата 11.474 ГГц, гарызантальная палярызацыя, нясучая гуку 7,38 МГц, у 7.30, 16.30, 19.30 і 23.30) ды ў Інтэрнэце ў жывым этэры і ў запісе — у некалькіх лічбавых фарматах: «Real Audio» і «Windows Media».

Дастаткова зайсьці на старонку беларускае службы сайту радыё «Палёнія»
**www.polskieradio.pl/polonia**
і слухаць у любы час.

## СЬЦІСЛА

### Беларусы Познані і немецкі падыход

Беларускі культурна-асьветніцкі цэнтар у Познані (кір. — Віталь Воранаў) сумесна зь Незалежным студэнцкім задзіночаньнем распачаў збор подпісаў супраць вяшчаньня «Нямецкай хвалі» на Беларусь па-расейску. Збор подпісаў будзе спалучаны з інфармацыйнай акцыяй вакол вяшчаньня на Беларусь і нямецкага падыходу да беларускага пытаньня. Плянуецца правядзеньне акцыі ва ўсіх вышэйшых навучальных установах Познані і збор подпісаў, якія будуць пасланы ў Эўрапейскую камісію і ў офіс «Нямецкай хвалі». Завяршэньне збору подпісаў мелася адбыцца 16 лістапада на афіцыйнай маніфэстацыі з нагоды Дня салідарнасьці.

**Віталь Воранаў, Познань**

### Беларусь у хвасьце сьпісаў

Паводле ступені простасьці сплаты падаткаў Беларусь займае 155 месца ў сьвеце, піша «Комсомольская правда» в Белоруссии». Да прыкладу, у Расеі ўсяго 27 падатковых платаў, ва Ўкраіне — 84, у Польшчы — 43, у Літве — 13. Для параўнаньня: у Беларусі падатковых платаў на 100 больш, чым у Літве — 113! І каб разабрацца зь імі, падаткаплатніку трэба патраціць 1188 гадзін.

### Кучму ўсё ж асудзяць за Гангадзэ?

Вярхоўная рада Ўкраіны накіруе запыт генпракурору Аляксандру Мядзьведзьку аб завядзеньні крымінальнай справы і заключэньня пад варту экс-прэзыдэнта Леаніда Кучмы. Падстава — арганізацыя выкраданьня журналіста Георгія Гангадзэ. Адпаведны запыт чальца фракцыі Блёка Юліі Цімашэнкі агучыў у сераду старшыня Вярхоўнай рады Ўладзімер Літвін.

**АГ**

# Францыя перад люстэркам

Працяг са старонкі 1.

Падзеі ў Францыі нельга назваць грамадзянскай вайной. Там ваююць не сусед з суседам, а супраць сыстэмы ва ўласнай дзяржаве. Францыя стварыла прэцэдэнт грамадзянскага тэрырызму на сучасным эўрапейскім кантынэнце.

Чаму так складана разабрацца ў тым, што адбываецца ў Францыі? Бо на паверхню вылезлі ня толькі ўласна францускія, але й агульнаэўрапейскія праблемы. Падзеі ў Францыі засьпелі кантынэнт зьнянацку, і гэта зьдзіўляе. Цяпер можна доўга спрачацца наконт таго, хто вінаваты — дзяржава ці эмігранты, — аднак спрагназаваць выбух было нескладана: дастаткова было прайсьціся па эмігранцкіх кварталах.

## Бандыты ці змагары?

А вы б шпульнулі ў жывога паліцыянта «Кактэйлем Молатава»? Згадзіцеся, каб наважыцца на такое, варта быць адчайным бандзюганам. І можна зразумець міністра ўнутраных справаў Нікаля Сарказі, які заклікае называць бунтаўнікоў «ня моладзьдзю, а швальлю». Хочаш жыць у краіне — падпарадкоўвайся закону. Аднак варта тады прызнаць і за эмігрантамі права патрабаваць ад дзяржавы зацікаўленасьці ў сваіх праблемах.

«Шваль» выплюхвае на вуліцу тую самую злосьць, якую носяць глыбока ў сябе нават самыя інтэлігентныя з эмігрантаў, якія прыехалі ў Францыю па лепшае жыцьцё, але былі вымушаныя разьвітацца з марамі.

## Погляд зь Нямеччыны

Ці можа нешта падобнае адбыцца ў іншых эўрапейскіх краінах, напрыклад, у Нямеччыне? Бадай, галоўнае адрозьненьне паміж дзьвюма краінамі палягае ў тым, што француская інтэграцыйная палітыка грунтуецца на асыміляцыі (прыклад — забарона насіць хіджаб у навучальных установах), а нямецкая — на дыфэрэнцыяцыі, прызнаньні таго, што людзі могуць жыць разам, але адрозьнівацца адзін ад аднога. Наколькі пасьпяхова гэта робіцца — у адным і іншым выпадку — ужо іншая справа.

У пэўным сэнсе немцам пашанцавала: ім даводзіцца ў першую чаргу мець справу з турэцкімі, а не афрыканскімі эмігрантамі. Турэччына на ўсіх парах рухаецца ў бок Эўропы. Прэм'ер Таіп Эрдаган ужо заклікаў турэцкіх эмігрантаў у Нямеччыне ўстрымацца ад гвалту, а сваю энэргію скіраваць на інтэграцыю ў нямецкае грамадзтва.

У адрозьненьне ад Турцыі, Афрыка пасьпела за апошняе стагодзьдзе назапасіць ладны досьвед антыкаляніяльных паўстаньняў. Сваю крыўду за крывавае мінулае і несправядлівую сучаснасьць яна вылівае на вуліцы былой мэтраполіі. Сапраўды, зь якой прычыны табе будзе весялей жыць у гета пад Парыжам, чым тваім продкам у каланізаваным Альжыры? У пэўным сэнсе жыць у гета нават больш крыўдна, бо такі недасяжны для цябе дабрабыт знаходзіцца не па іншы бок Міжземнага мора, а ў суседнім заможным раёне. Толькі руку працягні.

Дэзынтэграцыя насельніцтва не прыняла ў Нямеччыне такіх рэзкіх формаў, як у Францыі, але пагаршэньне эканамічнай сытуацыі ды скарачэньне сацыяльных праграмаў дапамогі эмігрантам пагражаюць зьвесьці ўсе посьпехі на нішто.

У Нямеччыне пакуль няма гета ў звычайным, прынамсі францускім, сэнсе слова.



**Францыя стварыла прэцэдэнт грамадзянскага тэрырызму на сучасным эўрапейскім кантынэнце.**

AP

Эмігрантаў трымаюць на жорсткім кантролі, ужо адным гэтым так ці інакш уключаючы іх у сыстэму нямецкага грамадзтва. Але нават нягледзячы на тое, што «спрыяньнем талерантнасьці» займаецца ня толькі дзяржава, але і безьліч разнастайных НДА ды фондаў, праблемы эмігрантаў у Нямеччыне ды Францыі збольшага аднолькавыя: беднасьць, беспрацоўе, непрыняцьце з боку карэннага насельніцтва. І ў Францыі, і ў Нямеччыне атрыманьне грамадзянства не дае гарантыі, што ты зробішся часткай грамадзтва. Усьведамленьне гэтага эмігрантамі вядзе да гетаізацыі іх сьвядомасьці. Крыўда нараджае злосьць.

## Голас Афрыкі

Ёахім Мукавэле налыса голены, у элегантных акулярах, апрануты ў бездакорны касьцюм з модным гальштукам. Ён нарадзіўся ў Мазамбіку, вучыцца ва ўнівэрсытэце Гумбальта ў Бэрліне. «Мая краіна не была каланізаваная Францыяй, таму я магу выказаць толькі погляд збоку, — кажа ён. — Уявіце сабе, што ў вас на пальцы драпіна. Здаецца — дробязь, але не пасьпееце заўважыць, як у вас пачне гнаіцца ўся рука. Тое ж адбылося і ў Францыі. Француская дзяржава лічыла, што пра эмігрантаў неабавязкова надта клапаціцца — дастаткова трымаць іх пад кантролем. Яны не падумалі, што ва ўмовах глябалізацыі пра хваляваньні пачне гаварыць увесь сьвет. А эмігранцкая моладзь выдатна разумее, што пра іх дзеяньні цяпер ведаюць нават у Амазоніі. І таму яны ня спыняцца».

Прадстаўнікі былых францускіх калёніяў рэагуюць больш эмацыйна. Фатумата Сір Дыякітэ, амбасадар Малі ў Нямеччыне, гаманкая і баявая жанчына, з каменным выразам твару адварочваецца, пачуўшы просьбу патлумачыць паводзіны афрыканскіх эмігрантаў у Францыі. Бачна, што справа ня толькі ў тым, што дыпляматычны статус не дазваляе ёй камэнтаваць падзеі ў іншай краіне. Францыя — ня самая зручная тэма.

Жэрмэн — тыповая студэнтка, якая ашчаджае кожны цэнт са сваёй стыпэндыі, атрыманай для навучаньня ў далёкай Нямеччыне. Укладзеныя на эўрапейскі лад жорсткія валасы, недарагія джынсы, на плячах шалік з афрыканскім малюнкам. «Няправільна дамагацца свайго праз вандалізм, — кажа яна. — Але я не лічу, што варта надта ўжо вінаваціць моладзь у тым, што адбываецца. Хіба ня бачна, у якіх умовах яны жывуць? А калі па тэлевізары паказваюць адно, так і ведай, што насамрэч справы яшчэ горш. Многія нават вадаправоду ня маюць. Калі падумаеш пра тое, як Францыя выкарыстоўвала і выкарыстоўвае Афрыку, робіцца дзіўна, чаму такое не пачалося раней». Пачуўшы просьбу назваць яе прозьвішча і ўнівэрсытэт, у якім яна вучыцца, Жэрмэн спужана хітае галавой: «Я хачу, каб усё было ананімна. Ведаеце, Францыя дагэтуль мае вялікі ўплыў у маёй краіне. Ім не спадабаецца, што я так думаю. А я яшчэ хачу вучыцца ды жыць».

**Альтэрнатывай Эўропе адкрытай для іншых народаў можа быць толькі «Эўропа для эўрапейцаў» (белых? хрысьціянаў?). Прамежкавы варыянт — гэта тое, што адбываецца цяпер у Францыі. Ні рыба, ні мяса.**

Эўропа сутыкнулася са старажытнай беларускай праблемай — патрэбай у самаідэнтыфікацыі.

## Афрыканскі ключ

Можа быць, варта шукаць карані канфлікту не ў Парыжы, а на самім чорным кантынэнце? Калі б у Афрыцы было добра жыць, не штурмавалі б эмігранты Эўропы.

«У глябалізаваным сьвеце праблема бясьпекі ня мае межаў, — кажа амбасадар Этыёпіі ў Нямеччыне Гіру Амануэль. Нельга спадзявацца жыць у спакоі, калі маеш гета пад бокам. Калі Эўропа жадае знайсьці вырашэньне праблемы масавай эміграцыі з Афрыкі, ёй давядзецца знайсьці вырашэньне праблемы разьвіцьця Афрыкі».

Нават Нямеччына не заўседы паводзіць сябе па-братэрску, асабліва калі размова ідзе пра грошы. «Сусьветны рынак кавы гуляе па нячэсных правілах, — кажа Г.Амануэль. — Нямеччына зьяўляецца найбуйнейшым экспартэрам этыёпскай кавы. І з кожнага эўра, які плоціць нямецкі спажывец за каву, у Этыёпію трапляе толькі адзін цэнт, які дзеляць паміж сабой фэрмэр, экспартэр і дзяржава. Калі б да іх трапляў не адзін, а хаця б тры цэнты, узровень жыцьця ў краіне мог бы кардынальна вырасьці».

Доктар філязофіі Дэніс Туль з Фонду эканомікі і палітыкі (Бэрлін) мяркуе, што ў адрозьненьне ад Францыі, Нямеччына ня мае нацыянальных інтарэсаў у Афрыцы. «Аналіз афіцыйных дакумэнтаў паказвае, што канкрэтных нямецкіх інтарэсаў у адносінах Афрыкі практычна не існуе. Кантынэнт разглядаецца ў рамках агульных праблемаў — беднасьці, тэрарызму, СНІД і г. д. У нямецкім урадзе і парлямэнце не хапае людзей, якія могуць кампэтэнтна займацца афрыканскімі праблемамі». Прафэсар лічыць, што Эўропа павінна пачаць успрымаць Афрыку не як адсталы кантынэнт, а як сукупнасьць «нармальных краінаў». «Наступ эмігрантаў на крэпасьць пад назвай Эўропа зусім не абавязкова павінен адбыцца. Усё будзе залежаць ад таго, як будзе разьвівацца эканоміка Афрыкі і дэмаграфічная сытуацыя».

Ключ да вырашэньня францускай праблемы варта шукаць на самім чорным кантынэнце. Але дзе тут чакаць дапамогі мільёнам афрыканцаў ад бабулькі-Эўропы, калі ў Францыі не хапае рэсурсаў, каб вырашыць праблему эмігрантаў на сваёй уласнай глебе? Так ці інакш, альтэрнатывай Эўропе адкрытай для іншых народаў можа быць толькі «Эўропа для эўрапейцаў» (белых? хрысьціянаў?). Прамежкавы варыянт — гэта тое, што адбываецца цяпер у Францыі. Ні рыба, ні мяса.

## Беларускія матывы

Існуе спакуса назваць Беларусь аазісам стабільнасьці ў параўнаньні з палаючай Францыяй. Аднак чыя заслуга ў тым, што ў нас такі нізкі ўзровень жыцьця, што нават эмігранты з самых бедных краінаў ня дужа імкнуцца пускаць тут свае карані? І як бы паводзіла сябе дзяржава, калі б Шабаны ператвараліся ў эмігранцкае гета? Выяжджала б на славутай беларускай талерантнасьці? Калі Беларусь мае пляны на заможнае жыцьцё, варта ўжо зараз ствараць сыстэму дзейснай інтэграцыі эмігрантаў у грамадзтва. Зачыніць межы — ня выйсьце. А талерантнасьці нам яшчэ давядзецца вучыцца.

Нават зараз у цывілізаванай Эўропе хапае людзей, якія лічаць афрыканца за малпу нават тады, калі ён мае ступень доктара навук. «Эмігранты — лайдакі, якія жадаюць, каб дзяржава дала ім усё», — скажа нехта. Ды толькі патрабуюць яны не максымуму, а мінімуму — роўных умоваў і магчымасьцяў. «Але ж ім жывецца лепш, чым у Афрыцы», — прыводзіцца другі аргумэнт. Найчасьцей гэта сапраўды так, але хіба эмігрант, які атрымаў права жыць у Францыі, будзе вымяраць свой дабрабыт адносна ўзроўню жыцьця сваіх былых суайчыньнікаў? Няўжо ён ня мае права мераць сябе меркай звычайнага француза? Тым больш, што сярод бунтаўнікоў хапае дзяцей эмігрантаў, якія зьяўляюцца францускімі грамадзянамі па нараджэньні.

Існуе спакуса абгрунтоўваць бунты ў Францыі асаблівасьцямі псыхікі чарнаскурага насельніцтва. Але такая лёгіка — банальны расізм. Марадэр з-пад Парыжу нічым ня горшы за п'янага нэанацыста, які ў цягніку ля Нюрнбэргу абзывае студэнта Алі з Сэнэгалу афрыканскай малпай. Бунт выкліканы ня тым, што афрыканцы дрэнныя і жорсткія ад прыроды, а тым, што сыстэма дала збой.

Эўропа сутыкнулася са старажытнай беларускай праблемай — патрэбай у самаідэнтыфікацыі. Межы зьнікаюць, людзі перасяляюцца ў чужыя краі, зьмяняючы твары краінаў. Францыя б'ецца ў сутаргах, мяняючы сваё аблічча. Ці знойдзе яна сілы зірнуць у люстэрка і прыняць сябе такою, якой яна ёсьць?

## Пінігін паставіў Коласа

Ніводзін спэктакль Мікалая Пінігіна на купалаўскай сцэне ня стрэліў у малако. «Тутэйшыя», «Ідылія» сталі клясыкай. Ня бачыў іх — усё адно, што ня быў у Купалаўскім. Канфлікт рэжысэра з кіраўніцтвам тэатру і адʼезд у Расею быў знакам канца 90-х у Беларусі. І вось Пінігін вяртаецца, каб паставіць толькі адзін спэктакль. Гэта будзе «Сымон-музыка» паводле паэмы Якуба Коласа.

Цяжка ўявіць менш прыдатны для пастаноўкі твор: дзьвесьце старонак тэксту, «закадравыя» апісаньні, пэйзажы, складаныя для сцэны вобразы, безь якіх паэма губляе смак. І цяжка ўявіць сабе больш выгадны выбар. Сёньня беларускіх імпрэзаў няшмат. А ў Пінігіна — Якуб Колас, сюжэт касмаганічнага маштабу, паэзія.

Колас вядзе Сымона прыступкамі спазнаньня. Спазнаньня самога сябе, спазнаньня свайго таленту, спазнаньня сваёй радзімы. Сам Колас праходзіў гэтай лесьвіцай. Кожны ідзе гэтай лесьвіцай. І ня факт, што ня спыніцца на адной з прыступак.

Першы крок — балюча ірвуцца крэўныя сувязі — тыя, што не трымаюцца ні на чым, апроч крыві. Гэта адбываецца, калі Сымон у сваёй іншасьці, чужароднасьці асяродку, перастае бачыць уласную віну. Усьведамляе свае правы на іншасьць, свой талент. Потым дарастае да нежаданьня марнаваць яго на дробязі, на чужое ўзбагачэньне — «пець жабрацкія літаньні». Пасьля бачыць, што яго служэньне вышэйшае і за ўзбагачэньне ўласнае. Кідае «граць праз цэлых тры гадзіны нескончаную кадрыль».

Апошні крок — самы складаны: пазьбегнуць спакусы служыць панам. Мікалай Пінігін бачыць у гэтай частцы паэмы павевы сацыяльна-рэвалюцыйных ідэяў пачатку XX ст. Таму сцэны з пажарам палацу, забойствам князя ў спэктакль не ўвайшлі. Але служба панам выглядае рэччу глыбейшай за жаданьне «ў сьпевах буры аднавіцца і ажыць». «Мастацтва павінна служыць народу» — таксама адзін зь лёзунгаў тае паншчыны. Паны ёсьць ва ўсе часы, і служба ім для таленавітай асобы зусім не цяжкая фізычна. Патрабуецца толькі канфармізм: творчы, грамадзянскі, нацыянальны. Жыві пры панох. Сваім існаваньнем пацьвярджай, што прымаеш іх праўду, ня маючы сваёй. Пацьвярджай рацыю іх спосабу жыцьця і мысьленьня. Ня грай на забароненых канцэртах. Не падпісвай лістоў пратэсту. Не палі сьвечку салідарнасьці ў акне. І будзеш мець «і хлеб, і дом». Але «волі, волі і прастору» мець ня будзеш.

Паэма адбіла і трагедыю самога Коласа, які мусіў на пацеху новым панам перапісваць шэкспіраўскі фінал свайго твору. У пачатковым варыянце Сымон, адрокшыся княскага замку, засынае на могілках, дзе пахаваная Ганна — надзея на лепшую долю для творцы і краіны ў агляднай будучыні. У другім варыянце, які ўсе вывучалі ў школах, Ганна «не памерла, але сьпіць». І, абуджаная Сымонам, крочыць разам зь ім у «сьветлае заўтра». Той настраёвы злом — калі ў паэме раптоўна зьявіўся хэпі-энд — Колас ня згладзіў канчаткова. Пінігін узяў у працу другі варыянт «Сымона-музыкі». Мо якраз настраёвы злом яго і прывабіў.

Пабачым 19 лістапада.

**Сяргей Мікулевіч**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Мікалай Пінігін: Волі, волі і прастору!

Напярэдадні прэмʼеры свайго «Сымона–музыкі» рэжысэр сустрэўся на Малой сцэне Купалаўскага тэатру з маладымі тэатральнымі крытыкамі і адказаў на пытаньні.

### Пра Сымона-музыку

«Канцэпцыя спэктаклю заўсёды ляжыць у залі. Пастаноўка мусіць адпавядаць чаканьням гледача. Чаго глядач чакае ад «Сымона-музыкі»? Сурʼёзнай размовы пра лёс мастака. Пра лёс нацыянальнай годнасьці, культуры. Якая не падмяняецца этнаграфізмам, як часта бывала.

На гэты спэктакль будуць цэнтралізавана вадзіць школьнікаў? Няхай. Хоць аднаму ды нешта западзе ў галаву.

Але «Сымон-музыка» — не для школьнай праграмы. Калі ўчытваесься, разумееш гэта. Услухайцеся, якая тэма — паэт ня трэба свайму народу. Гэта ж Колас пра сябе пісаў, там нават намёкі ёсьць на гэта ў паэме. Але што такое народ? Біямаса. А ў гісторыі застаюцца ўзлёты чалавечага духу, моманты спазнаньня».

### Пра Мулявіна

«Я хацеў паставіць «Сымона-музыку», яшчэ калі быў жывы Ўладзімер Мулявін. Каб ён напісаў музыку, засьпяваў, быў мо Сымонам-музыкам.

Мулявін — фэномэн. Вось Пушкін быў этыёп — у Адыс-Абэбе помнік стаіць: «А.Пушкін, вялікі этыёпскі паэт». Лермантаў — шатляндзец. Гогаль — хахол. Мулявін, які прыехаў сюды зь Сьвярдлоўску, здолеў сваёй музыкай выказаць беларускасьць. Самую яе сутнасьць. Калі яшчэ такое будзе: ідзеш Харкавам, а з усіх вокнаў — «Александрына». А чалавек ён быў праставаты, каснаязычны. Чысты талент».

### Пра сучасныя задачы Купалаўскага

«Мы вазілі «Ідылію» ў Варшаву, Кіеў, Вільню. Нас разумелі, бо гэта адзін гістарычны арэал. Далей на захад і на ўсход — гэта ўжо цяжэй разумелася б.

У Купалаўскім тэатры трэба толькі такія праекты і рабіць. Ставіць добротную беларускую літаратуру. Або мець трупу, якая была ў Купалаўскім пры камуністах. А такой не сабраць за 80 гадоў».

### Пра генія імпэрыі і генія з Навагрудку

«Уявіце, што мы цяпер тут ставім спэктакль на старажытнай кельцкай мове. Хто што зразумее — нават зь перакладчыкам? Немагчыма паказаць «Сымона-музыку» ў Расеі. Бо ў мове закладзеныя асацыяцыі, зьвязаныя толькі з гэтай тэрыторыяй. Іншай мовай пра гэта ня скажаш. «У бок Віліі чароўнай і пад сьветлую Дзьвіну» — хто ў Расеі гэта зразумее? А я шэсьць гадоў пражыў на хутары на Вяльлі. Або «І папоўскае закляцьце, і ксяндзоўскі нагавор». Якое ў Расеі можа быць «папоўскае закляцьце»?

Адна дзяўчынка маскоўская казала: «Я палянэз Агінскага на скрыпачцы грала. Цікавы фінал». Вось так — хтосьці на скрыпачцы, а я быў у палацы, дзе Агінскі напісаў той палянэз. Тады яшчэ там быў дом састарэлых. Ідзеш, а ў бабулькі на стале — бутля з радавым гербам Агінскіх. У гародзе капаліся, знайшлі.

А пʼеса аб адносінах Міцкевіча і Пушкіна? Гэта ж была б бомба! Два геніі з рознай культурнай сытуацыяй. Геній імпэрыі з імпэрскім мысьленьнем. І геній з Навагрудку, які застаўся жывы толькі дзякуючы таму, што карабель адплыў раней, чым яго пасьпелі вярнуць».

### Пра сучаснае маўленьне

«Маўленьне сёньня дэвальваванае. Столькі словаў вакол. Паэзія ж мае іншы сэнс. Яна чысьцейшая ад сёньняшняй мовы. А то ўключыш тэлевізар — а там усе сэрыялы адной мовай ідуць: «Я це чё скааал...» Мова абрыдла. І гэта агульнаэўрапейская праблема. На міжнародных тэатральных фэстывалях рэжысэры ставяць містэрыі, бо сюжэт ужо не працуе».

### Пра сучасную драматургію

«Чаму не хапае зорак зь неба беларускай драматургіі сёньня? Ёй у свой час не далі разьвівацца. Перашкодзіла сталінскае змаганьне з нацдэмамі. Яна не пасьпела сфармавацца. Сёньня ж найбольшая праблема — беларуская драматургія ня пішацца мовай, якой гаворыць вуліца. Таму і не разьвіваецца. Як у сілу пэўных абставінаў і мова не разьвіваецца. Вось вы пішаце пʼесу пра жыцьцё маладых. Якім слэнгам будзеце карыстацца, якія выклічнікі ўжываць?»

### Пра сучасную ўладу

«Калі я быў «маладым рэжысэрам» — а я меў блат, паступіў у 16 гадоў, тады як мае аднакурсьнікі мелі па трыццаць — нават словаў такіх не было — «інфармацыйная прастора». Не было ніякіх свабодных СМІ. Тэатар быў важным месцам, і ўлада разумела гэта. Машэраў сядзеў у лёжы на кожнай прэмʼеры. Акторы мелі добрыя заробкі, кватэры. І ніхто асабліва там нікому задніцы не лізаў.

Кожны мой спэктакль прымаў Іван Антановіч з ідэалягічнага аддзелу ЦК. Выклікаў і чыхвосьціў. Дык я гэта зараз амаль з настальгіяй успамінаю. Тэатар быў атворам, кіслародная падушкай для грамадзтва. Цяпер перастаў.

Тэатры ў нас дзяржаўныя, а дзяржава адвярнулася ад іх. Ня лічыць нечым істотным. Усё ўзаемазвязана. Нармальны мужчына, які хоча мець сямʼю, ня пойдзе рабіць на сто даляраў у месяц».

### Пра тэатар, сьвядома задушаны

«Трэба ж бараніць айчыннага вытворцу — «Купляйце беларускае»! А то што Хазанаў прыяжджае ў Менск, што антрэпрыза беларускіх артыстаў — адна й тая самая цана за арэнду залі. Тэатар сьвядома задушаны.

Мастацтва — забава для багатай краіны, здольнай аплачваць вашыя фокусы. На Захадзе мноства фондаў, куды можна прыйсьці з праектам пастаноўкі й атрымаць грошы. Тут — нічога гэтага няма. Можна займацца чыстым мастацтвам, працаваць для купкі, ставіць спэктаклі для сябе. Калі толькі ня думаць, дзе ўзяць грошы.

Вось быў такі праект — «Нікола-тэатар». Гэта быў камэрцыйны тэатар, які выконваў камэрцыйныя задачы. Але спэктакляў жанру «трусы» мы ніколі ня ставілі. У кожнага ж тэатру мусіць быць стратэгія. Трэба ведаць, які перад табой глядач, якія людзі купілі білет. Напрыклад, п'есу «13» я ніколі не паставіў бы ў Купалаўскім. П'еса ўразіла мяне тым, што ў ёй няма ніводнай думкі. Толькі ангельскі гумар. Уражаньне, што аўтар напісаў яе, толькі каб глядач пасьмяяўся.

Увогуле, зрабіць камэдыю цяжка. Прымусіць зал сьмяяцца. Прымусіць сумаваць — проста. І крытык потым напіша, што гэта геніяльна, а вы, дурні, нічога не зразумелі. Працаваць для купкі — любы можа. А для поўнай залі?».

### Пра сучаснага гледача

«Узровень гледача ўпаў. І тэлебачаньне ў гэтым дапамагло калясальна. Такое ўражаньне, што яно мае задачу адурачыць людзей, абалваніць. Гэты перагруз папсы, сьмецьця, непатрэбшчыны... Я сёньня сумую па акадэміку Ліхачову, слухаць якога ў савецкія часы было як піць жывую ваду. Сёньня ж грошы сталі самым галоўным. У Маскве прадусэр сустракае рэжысэра і пытаецца: «У цябе ёсьць фільм?» «Ёсьць». — «Колькі сэрый?» — «Тры». — «Шкада. Было б пяць, купіў бы». Яму ня важна, які гэта фільм і пра што. Ён ведае, што калі праз кожныя 15 хвілін будзе ставіць рэкляму, адаб'е грошы і яшчэ двойчы па столькі наварыць.

Некалі мы ставілі «Трохграшовую опэру», і гэта было цікава савецкаму гледачу. Каго зараз зьдзівіш гісторыяй пра Мэкі Нажа? Уключыце любы тэлеканал. А тэатар мусіць паказваць тое, чаго не пабачыш у «скрыні». Людзі ідуць туды за шчырасьцю, за суперажываньнем. У гэтым прафэсія актора: людзі зьбіраюцца і адкрываюць адзін перад адным самыя балючыя месцы. Калі гэтага няма, працаваць у тэатры ня мае сэнсу.

У постсавецкі час усталявалася вялікая дыстанцыя між людзьмі. Пад саветамі ўсе сядзелі ў адной кучцы. Не было мараў пра паездкі за мяжу, шмоткі, грошы. Мы сядзелі як у акварыюме, чыталі Набокава з ксэракопіяў, размаўлялі на кухнях. Але асяродзьдзе было прадзімальнае. Мы ведалі, што робіцца ў тэатрах Вільні, Ленінграду, Кіева. Сёньня гэтых сувязяў няма. На Беларусь апускаецца жалезная заслона. І не дастукацца. Беларусь замыкаецца, правінцыялізуецца, ператвараецца ў вялікі вясковы клюб у культурным сэнсе».

### Пра тутэйшых

«Я не спадзяваўся на посьпех «Тутэйшых». Думаў, прыйдзе 15 чалавек, пакажам два разы — і ўсё... Але тады быў такі момант. У Беларусі ўсё адбываецца ў апошні момант. Вунь 7 лістапада ў Расеі адмянілі, а ў нас уключаеш тэлевізар — дзяўчынкі ў чырвоных гальштуках і «Аўрора». А тады — раптам Белавеская Пушча... Справа ня ў сьцягу бел-чырвона-белым, які я ў спэктаклі спрабаваў усё ж падаць неадназначна, складаць з крыві і анёльскіх крылаў. Сьцяг тады яшчэ ня быў дзяржаўным. Валер Масьлюк раней «Тутэйшых» ставіў у Магілёве, дык там БССРаўскі сьцяг са сталі спускаўся і гучаў гімн «Мы беларусы». І людзі ўставалі, бо гімн гучыць...

Справа ў іншым. У п'есе паказаны беларускі характар. Вось Мікіта Зносак — беларус. Нацыя выжыла дзякуючы ўнутранай пластычнасьці. Паглядзіце «Ніхто не хацеў паміраць» — пра лёс маленькага народу на скрыжаваньнях эўрапейскай гісторыі, перад якім стаіць толькі адна задача — выжыць.

Заедзьце ў любую вёску, пагаварыце зь людзьмі. Калі чалавек цябе ня знае, ён будзе з табой так гаварыць, каб ты нічым ня змог яго зачапіць. Як у анэкдоце: «Дзед, у возеры рыба ёсьць?» «А куды яна дзенецца...» — «Дык чаму я за дзень не злавіў нічога?». — «А адкуль ёй узяцца...» Я не кажу зараз, добра гэта ці дрэнна з маральнага пункту гледжаньня. Але ў кожнай нацыі ёсьць зярнятка, якое хочацца памацаць.

І мы не рабілі «Тутэйшых» чорна-белымі. Там жа з іроніяй паказаны і Янка Здольнік. Такі ўжо настаўнік, інтэлігент, а як завяруха пачалася ў горадзе, ён адразу: «А мы на вёску. Там людзі лепшыя».

### Пра гістарычныя шанцы

«Прычыны майго сыходу з Купалаўскага тэатру былі празаічныя, з аднаго боку, і ідэалягічныя зь іншага. Зьмянілася сытуацыя. Нам пашчасьціла працаваць у часы беларускага адраджэньня. Гэта ні з чым не параўнальнае адчуваньне. Мы і дзяржава — гэта пры Шушкевічу было адно. Быў уздым. У нас адчыняліся амбасады замежных краінаў. Мы стваралі сваю краіну. Але ўсё зьмянілася. Цяпер я стаўлюся да гэтага спакойна. Сьвяты бываюць рэдка. Раз на сто, дзьвесьце гадоў. Народы рэдка атрымліваюць гістарычныя шанцы. Польшча вунь дзьвесьце гадоў чакала».

**Запісаў СМ**



Юлія Дарашкевіч

У Беларусі ўсё адбываецца ў апошні момант.

**У Купалаўскім** тэатры трэба толькі такія праекты і рабіць. Ставіць дабротную беларускую літаратуру.

**У гэтым прафэсія актора:** людзі зьбіраюцца і адкрываюцца адзін перад адным. Калі гэтага няма — працаваць у тэатры ня мае сэнсу.

**Беларусь замыкаецца,** правінцыялізуецца, ператвараецца ў вялікі вясковы клюб у культурным сэнсе.

**Беларуская нацыя выжыла** дзякуючы ўнутранай пластычнасьці.

## Пінігін падыходзіць звышсур'ёзна

Рэпартаж з рэпэтыцыі «Сымона-музыкі».

Калі б не сцэнічнае ўбраньне актораў Купалаўскага тэатру, можна падумаць, што гэта сядзяць студэнты перад аўдыторыяй у чаканьні адказнага іспыту. У службовым памяшканьні ля сцэны адны артысты засяроджана глядзяць на столь, нехта ходзіць па пакоі і паліць, дзяўчаты з хору весела шчабечуць, некалькі актораў адышліся і напаўголасу прагаворваюць тэкст. На сцэне ідзе адна з апошніх рэпэтыцый прэм'ернага спэктаклю Купалаўскага тэатру «Сымон-музыка», які можа стаць галоўнай падзеяй тэатральнага сэзону.

Пасярод залі спакойна сядзіць рэжысэр. Ужо пяць хвілін, як мусіць пачацца рэпэтыцыя, але на сцэне нікога няма. Мікалай Пінігін не вытрымлівае, бярэ мікрафон і гукае: «Гэй, не разумею, дзе народ?» На сцэну са скрыпкай выбягае Алесь Маўчанаў — выканаўца галоўнай ролі: «Я гатовы!»

Пінігін, які ўжо сем год не працаваў з купалаўцамі, вядзе рэпэтыцыю падкрэсьлена ветліва. Пана — заслужанага артыста Беларусі Аляксандра Падабеда — называе па бацьку. Сымона — «мілы Саша». Голас Пінігіна амаль заўсёды роўны і спакойны, нэрвовасьць, надта ўласьцівая прэм'ерным рэпэтыцыям, зусім не адчуваецца. Але не знаходзіцца месца і жартам, часам вельмі патрэбным, каб крыху разьняволіць актораў. Пінігін да ўсяго падыходзіць звышсур'ёзна: для яго важна, як сьвятло адбіваецца ад піяніна і як тырчаць вушы з-пад шапкі актора. «Нацягні болей, каб былі відаць вушы», — кажа аднаму з выканаўцаў. Потым усхопліваецца і паказвае статыстам, як заносіць на сцэну човен.

Пінігін сам рабіў інсцэніроўку і ўважліва падбіраў тыя месцы з паэмы, якія можна абыграць на сцэне. Паводле яго словаў, зрабіць аднаактную містэрыю паводле «Сымона» — такая ж цяжкая задача, як паставіць «Вайну і мір». Таму Пінігін адмовіўся, напрыклад, ад такога знакавага ў паэме моманту, як выратавальная завея.

Шмат часу на рэпэтыцыі было аддадзена эпізоду, калі Сымон трапляе да Пана і чуе гукі чароўнай музыкі. Дэталёвай распрацоўцы была адведзена недзе паўгадзіны: Сымон слухае («Рабі выгляд, што слухаеш вачыма!»), разварочваецца («Нетаропка!»), паступова апускаецца на калені («Не сьпяшайся!»), уздымае галаву («Больш сьвятла!»), чапляецца за птушку і ўздымаецца па-над сцэнай.

**Сяргей Будкін**

**Прэм'ерныя паказы спэктаклю** Мікалая Пінігіна «Сымон-музыка», паводле паэмы Якуба Коласа, пройдуць у Купалаўскім тэатры 19 і 20 лістапада. Пачатак а 19-й.

# Горадня працягвае змагацца

Працяг са старонкі 1.

Перадрукаваны на некалькіх гарадзенскіх сайтах, артыкул выклікаў прыхільную рэакцыю месьцічаў.

Працытуем некалькі выказваньняў: «Хто цяпер мае ўладу? Былыя старшыні райвыканкамаў з магілёўскай глыбінкі. Што яны бачылі? Вось і думаюць, што плітка — гэта паказчык культуры, а асфальт — цывілізацыя? Любы эўрапейскі горад ганарыцца тым, што ў яго ёсьць брукаваныя вуліцы, нават выклікаюць брукароў-спэцыялістаў за дурныя грошы, каб клалі брук».

«Валера Руселік мае рацыю. Чаго яны разьбіраюць вуліцы, якія прастаяць яшчэ 100 год? Лепш зрабілі б тое, што патрабуе рамонту. Да таго ж плацім за гэта мы, падаткаплатнікі. Прэч брудныя рукі ад чыстай і сьветлай мінуўшчыны Горадні».

Застаецца пашкадаваць, што інфармацыйны вакуўм (найперш праз адсутнасьць незалежнай прэсы) не дазваляе зрабіць гэтую інфармацыю больш даступнай жыхарам гораду і арганізаваць сапраўды шырокую дыскусію аб тым, як мае выглядаць наш горад.

У кастрычніку некалькі маладых гарадзенцаў, выйшаўшы на вуліцы гораду, за тры дні сабралі трыста подпісаў пад заклікам да ўладаў перагледзець пляны па «рэканструкцыі» гораду. Ліст, у якім сьцьвярджалася неабходнасьць спыніць разбурэньне традыцыйнай пляніроўкі Савецкай плошчы, быў накіраваны ў гарсавет і мэру гораду. Даць афіцыйны адказ улады адмовіліся, замест гэтага у газэце «Вечерний Гродно» надрукавалі інтэрвію з архітэктарам гораду, якое выглядала, хутчэй, на адпіску. У інтэрвію гаварылася, што пляны па стварэньні пешаходнай зоны ў цэнтры гораду рэалізаваць пакуль немагчыма праз адсутнасьць сродкаў — гэта пэрспэктыва наступных дзесяці гадоў, але пакуль найбольш важнае тое, што ў працэсе рэканструкцыі плошчы не пацярпелі падмуркі гістарычных будынкаў, якія можна будзе некалі рэстаўраваць.

Але «рэканструкцыя» яшчэ не завяршылася, падземны пераход пад былой Мяшчанскай пабудаваны напалову. Выхад зь пераходу на другім баку вуліцы, які пачнуць будаваць толькі ў наступным годзе, павінен трапіць акурат на адзін з флігеляў знакамітага палацу Радзівілаў. Як бы не прыйшлося спадару галоўнаму архітэктару хутка адмовіцца ад сваіх слоў. Як выйдуць улады з гэтага становішча, пакажа час, а мы абавязкова праінфармуем аб гэтым грамадзтва.

Разбурэньне гістарычных будынкаў у цэнтры працягваецца.

**Янка Лялевіч, Горадня**




**Рэшткі двухпавярховага цаглянага дому па вул.Заводзкай, 12, пабудаванага 80 гадоў таму і разбуранага пры пашырэньні набярэжнай Нёману.**

# Мастацтвазнаўца Буйвал і плястылін

Неўзабаве пасьля публікацыі майго артыкулу пра талаку ў Курапатах («НН», №41, 4 лістапада) у Сеціве зьявіўся допіс сакратара ўправы КХП—БНФ Валер'я Буйвала.

У ім В.Буйвал ацэньвае вынікі дзьвюх акцыяў, праведзеных у Курапатах на Дзяды вячоркаўцамі ды пазьнякоўцамі. Акцыя КХП-БНФ апісваецца выключна ў пазытыўных тонах, а вось мерапрыемства, зладжанае палітычнымі апанэнтамі, характарызуецца як гнюсны акт блюзьнерства. Адпаведна падважваецца і аб'ектыўнасьць рэпартажу ў «НН».

Крытыка сп.Буйвала вытрымана ў выключна абразьлівай форме. Пакіну гэта на сумленьні аўтара, які друкуецца на сайтах Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі і ў холдынгавай газэце «Літаратура і мастацтва». Аднак ігнараваньне фактаў ці нават іх скажэньне — іншая рэч, таму лічу патрэбным патлумачыць некаторыя моманты, каб ня ўводзіць у зман тых, хто ў Курапатах у той дзень не прысутнічаў.

Па-першае. Памятную шыльду ўсталёўваў Алесь Шатэрнік, а ня выдуманы сп.Буйвалам палітычны гібрыд Вінцучок-Лебедько (Лябедзькі ў той дзень ва ўрочышчы не было).

Па-другое. Сп.Шатэрнік і не хаваў таго, што шыльда часовая зь незалежных ад аўтара прычынаў, тлумачыў гэта амаль кожнаму. Але з плястыліну зроблены толькі адзін фрагмэнт — менавіта той, які ўтрымлівае абяцаньне бээсэсэраўскіх уладаў увекавечыць памяць пра ахвяры сталінізму. Сама шыльда выкананая з мэталу. Паводле слоў сп.Шатэрніка, гэта было своеасаблівым пэрфомансам — абяцаньні савецкіх уладаў нетрывалыя, як плястылін.

Па-трэцяе. «З урачыстым выглядам тоўпіліся перад шыльдай і слухалі маналёгі псэўдаапазыцыянэраў» ня некалькі дыпляматаў, а амаль увесь дыпкорпус, за выняткам хіба паслоў Расеі ды Кітаю. І не «маналёгі псэўдаапазыцыянэраў», а аповед гісторыка Ігара Кузьняцова. Да таго ж хацелася б на ўласныя вочы пабачыць «уводную» з Брусэлю з загадам падтрымаць сваім аўтарытэтам Мілінкевіча, пра якую вы ўзгадвалі, спадару Буйвал.

Па-чацьвёртае. Вы пішаце пра тое, што на наступны дзень арганізаваныя Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыяй БНФ сотні людзей усталёўвалі крыжы, сьпявалі рэлігійныя і патрыятычныя гімны. Псэўдаапазыцыянэры ж, дыпляматы з журналістамі ды разявакі (?) учынілі акт гнюснага блюзьнерства, наляпіўшы на камень-валун плястылінавую шыльду, патусаваліся і разьбегліся. Сьведчу пра тое, што бачыў на ўласныя вочы: «псэўдаапазыцыянэры» з раніцы прыбіраліся ля крыжоў, выносілі сьмецьце. Падчас ускладаньня кветак да каменя жанчыны сьпявалі і рэлігійныя («Магутны Божа»), і патрыятычныя гімны («Пагоня»).

«Некаторыя пацікавіліся, а дзе ж гэта шыльда, якой «пакланяўся» Аляксандар Мілінкевіч і іжэ зь ім? Доўга шукалі «шэдэўр» і ўрэшце знайшлі». Яны што, спадар Буйвал, першы раз былі ў Курапатах, што доўга не маглі адшукаць каменя?

Адам Глёбус піша пра дзьвюхдушнасьць беларуса. Асьмелюся запярэчыць. У сучаснага беларуса тры душы, а мо і болей. Трэцяя зь іх самая правільная, самая беларуская. Як у сп.Буйвала, напрыклад. Толькі вось не перамагчы беларусу ў найбліжэйшай пэрспэктыве з такой спэцыфічнай душэўнай камплектацыяй, як ні змагайся. Ці то пад сьцягам сьвятога Зянона, ці то з прагматызмам за заходнія ці ўсходнія гранты.

**Сямён Печанко**

**Камэнтар Алеся Шатэрніка**

**Менавіта такія асобы, як Валер Буйвал, зрабілі ўсё магчымае для таго, каб вячоркаўцы з пазьнякоўцамі апынуліся фактычна па розныя бакі барыкад.**

## Без закулісных скавытаньняў

**Са зьдзіўленьнем прачытаў у «Знаках прыпынку» Уладзімера Някляева пра тое, што «архэўцы»... ня надта ладзяць паміж сабою, яшчэ больш ня ладзяць зь «дзеяслоўцамі», у якіх да «архэўцаў» гэткія ж моцныя зваротныя пачуцьці» («НН», №41). Неяк гэта ўсё бязадрасна, не тлумачыцца чаму, ды не зусім слушна.**

Бязадрасна, бо я сам «групуюся» пры часопісе «ARCHE», але ў мяне нармальныя адносіны і з астатнімі «архэўцамі», і зь «дзеяслоўцамі». Думаю, такія ж самыя дачыненьні і ў Андрэя Хадановіча ды ў Юрася Пацюпы, і шмат у каго іншага, каго ведаю бліжэй. Часам здараюцца непаразуменьні, але вырашаюцца яны ў рабочым парадку, без закулісных скавытаньняў.

Крыўды, пра якія піша Някляеў, насамрэч узьнікаюць з-за рэцэнзій. Бадай, самая гучная крыўда апошняга часу — Барыса Пятровіча на рэцэнзію Данілы Жукоўскага «Пісьменьнік і Пустэча» (2005. №4. Arche.). Рэцэнзія рэзкая і спрэчная. Але ж гэта ня вырак і ня «чорная метка». Крытык не аналізаваў біяграфіі празаіка або яго рэдактарскую дзейнасьць — а толькі тэксты з кнігі «Шчасьце быць...».

Слушнасьць у тым, што крытыцы «ARCHE» перашкаджае ідэалягічная зададзенасьць (і ня толькі «наццэмаўскія» ўстаноўкі, але і нейкія дзіцячыя пошукі абстрактнага пазытыўнага, дзейснага героя — праз адсутнасьць якога нярэдка дастаецца і Мудрову). Але я ніколі не паверу, што з дапамогай крытыкі «архэўцы» зводзяць прыватныя рахункі.

Пара белпісьменьнікам навучыцца рэагаваць на адмоўную крытыку «бяз выклікаў на дуэль». Бо, з улікам сёньняшніх крыўдаў, выглядае, што «крытычная» крытыка — гэта нейкая змова цёмных сілаў, у нашым выпадку, нейкіх езуіцкіх «архараўцаў».

Мне таксама абсалютна не спадабалася рэцэнзія на мой зборнік «Прывід вясны», што была зьмешчана ў «Дзеяслове» (№8, 2004). Ірыну Шаўлякову натхнілі радкі анатацыі, якую яна старанна абмяркоўвала на працягу ўсяго караценькага агляду. Я так і не зразумеў, чаму канцэптуалізацыя (напэўна, зборніка) можа паяднаць «сэнсавы скразьняк» з «фарматворчым насмаркам». А хацелася б яшчэ пачуць развагі пра вершы. Бо анатацыя пішыцца для чытачоў-пакупнікоў, а не для крытыкаў.

Але крыўды ў мяне няма. Ніякіх сьлёз і скаргаў. І адносіны зь «дзеяслоўцамі», прынамсі з майго боку, у мяне прыязныя.

**Алесь Аркуш, Полацак**

## Літва ці Беларусь?

**Пытаньне аб ужываньні назвы «Літва» шчыльна зьвязана з праблемай спадчыны ВКЛ. Вядома, якое значэньне для беларускага адраджэньня мела кніга Міколы Ермаловіча «Па сьлядах аднаго міту». Але ягоная лякалізацыя Літвы паміж Менскам і Наваградкам, Маладэчнам і Слонімам застаецца недаказаная. Як і сумнеўным падаецца спроба вывядзеньня князёў ВКЛ ад князёў полацкіх.**

Але гэта ня значыць, што мы не павінны лічыць Вялікае Княства сваёй дзяржавай. Наша культурная дамінанта ў ім агульнапрызнаная. Але мы таксама ня маем права аспрэчваць права сваіх суседзяў называцца Літвой. Няправільна і называць летувісаў жмудзінамі, бо калі жмудзіны, чаму не аўкштайты?

Нацыянальная сьвядомасьць ня можа трымацца на мітах, хай сабе і прыемных для нас.

**Усяслаў Шатэрнік, магістар гуманітарных навук, Менск**

## Вялікая Літва

**Ужо самі гісторыкі блытаюцца, як называць беларускія землі ВКЛ у сваіх працах: ці то Літвою, ці то Беларусьсю. Іншы раз чытаеш гістарычную кніжку і ня можаш уцяміць адразу, пра якую Літву ідзе гаворка — пра цяперашнюю Беларусь ці пра былую Жмудзь.**

Але маюць рацыю прыхільнікі «літоўскага варыянту». Менавіта пад назвай «Літва» аб'ядналіся ўсе нашы этнічныя землі. Менавіта пад гэтай назвай пачаў фармавацца народ, які цяпер вядомы як беларусы, а раней называўся «ліцьвіны». Нідзе я не знайшоў дакладнага тлумачэньня, чаму наш край павінен называцца Беларусь. І загадкай застаецца для мяне, чаму нашы адраджэнцы ў свой час абралі менавіта гэтую назву.

Ранейшая гістарычная назва будзе калісьці вернута. Але як вярнуць назву, калі побач ужо ёсьць суседка з такой самай назвай? Думаю, гэтая праблема вырашаецца вельмі проста — Вялікая Літва, як прапаноўваў Ян Станкевіч. Ёсьць Вялікая Брытанія, чаму б ня быць Вялікай Літве?

**Яўген Салейчук, Пінск**

## ПАМЫЛКІ ДРУКУ

Удакладненьне да №42, артыкулу «Самая цёплая восень»: азімыя не «распусьціліся», а «раскусьціліся», ад куст, кусьціцца.

**Валянціна Гракун, Бешанковічы**

У №42, у артыкуле «Цэны на жытло працягваюць расьці» вялікая (памерамі) памылка: калі $1040 памножыць на 840 тысячаў, будзе 873 мільёна 600 тысяч даляраў а ніяк не мільярда.

**Zmicier, форум «НН”**

Дзякуй за папраўкі.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

# Хто вы?

4 лістапада, у Дзень расейскага народнага яднаньня, у адным зь менскіх шпіталёў ледзь не дайшло да бойкі. Адбылося гэта ў палаце №5 — велізарнай, на чатырнаццаць ложкаў. З прычыны рамонту шпітальнага будынку давялося прыстасаваць для хворых адміністрацыйнае памяшканьне.

Народ у палаце сабраўся сталага веку. Спачатку нішто не прадвяшчала навальніцы. Ішла ціхамірная гутарка. Гаварылі пра цэны на агародніну — пра тое, што ўсё стала дорага, што на базары нічога, апроч бульбы, таньней за тысячу ня купіш. Нехта выказаў думку, што жыць на вёсцы даўно зрабілася немагчыма. Тыя, хто там яшчэ застаўся, дажываюць свой век альбо сьпіваюцца. Усе пагадзіліся, а кожны прывёў свой прыклад. Нехта завёў гаворку пра неймаверную колькасьць начальства, у тым ліку ў аграсэктары, якое нічога ня робіць, кіраваць ня ўмее, а толькі крадзе й вымагае грошы. Нейкі сьмяльчак нават пачаў гаварыць пра найвышэйшае начальства, «магілёўскі клан», карупцыю й бязладзьдзе ў краіне. Пра тое, што пры камуністах можна было хоць кватэру бясплатна атрымаць, а цяпер грошай на тую кватэру за ўсё жыцьцё не заробіш. Зь ім таксама пагадзіліся.

### Дзень прымірэньня

Парушыў спакой хіба адзін пацыент, які пачаў трэсьці газэтай ды абурацца. «Вы паглядзіце, што робіцца! Трэці райх ім падавай!» Выявілася, што хваляваньне хворага выклікала нататка пра тое, як нейкія маладзёны вывесілі ў цэнтры Менску транспарант з надпісам «Трэці тэрмін — Трэці райх». «У калгас іх усіх!» — абураўся пацыент. Суседзі па палаце таксама пагадзіліся. Калгас, вядома, самае страшнае пакараньне з усіх. Адным словам, у палаце запанавалі кансэнсус і згода.

Але тут да хворых завітала праваслаўная сястра-манашка. Алейным голасам яна паведаміла: «Братове, сёньня ў нас сьвята Казанскага абраза Божай маці!» Далей манашка прапанавала тым, хто не спавядае праваслаўную веру, пайсьці пагуляць, астатнім — паслухаць гісторыю, зьвязаную з гэтым абразом. Аповед манашка завершыла словамі пра тое, што копія іконы ў 1612 г. дапамагла цудоўнаму вызваленьню… «ад белапалякаў». Нехта з пацыентаў голасна сказаў: «Дык белапалякі — гэта ж мы! Беларусы!» Сэкунду ў палаце панавала ціша. Потым цішыня ўзарвалася. «Заткніся, быдла!..» — «Сам ты быдла, гісторыі ня ведаеш!» — «Маўчы, бо заб'ю!» — «Дубіна ты!» — «Хто, я дубіна?! Пачакай, я да цябе дабяруся…» Праваслаўнай сястры давялося клікаць на дапамогу сястрычак шпітальных, бо некаторыя хворыя пачалі ўскокваць з ложкаў і хапаць адзін аднаго за шманты. Але ўсё абышлося карвалолам.

Спрэчка сярод хворых перайшла на вечную тэму — ці ёсьць Бог і ў што верыць? Выявілася, што ніхто з насельнікаў палаты ні ў царкву, ні ў касьцёл ня ходзіць, хоць большасьць лічаць сябе праваслаўнымі. Усіх суцешыў стары камуніст, які сказаў: «Ня важна, якой ты веры. Галоўнае, каб Бог быў у душы…»

### Ad absurdum

За некалькі дзён да гэтага адна цэнтральная газэта зьмясьціла матэрыял без пазначэньня аўтара — перадрук з Інтэрнэту. Уражвае памер публікацыі — паласа, а таксама навуковападобны, псэўдааб'ектывісцкі стыль. Аднак рэч у зьмесьце. У матэрыяле праводзіцца думка, што незалежныя СМІ, як і наагул праўдзівая інфармацыя пра падзеі ў краіне, насельніцтву Беларусі не патрэбны. Ніхто ня ведае й ня хоча ведаць ні пра якія незалежныя выданьні ці замежныя радыёстанцыі. Амаль як у старым анэкдоце. Калі замежны журналіст запытаўся ў савецкага чыноўніка, чаму ў савецкіх крамах няма зярністай ікры, той адказаў: «А вы чулі, каб нехта з пакупнікоў пытаўся ў прадаўцоў пра ікру?» «Не», — сказаў журналіст. «Вось бачыце, на гэты прадукт у нас няма попыту».

Нават калі згадзіцца з тэзай аб адсутнасьці патрэбы ў аб'ектыўнай інфармацыі — тэзай, пабудаванай паводле схаластычнага прынцыпу «Ad absurdum» (інакш кажучы — веру, бо абсурдна), — і тады застаецца пытаньне: навошта? Калі насельніцтва, паводле публікацыі, ня верыць недзяржаўным мас-мэдыя, а верыць выключна дзяржаўным СМІ, навошта перасьледаваць недзяржаўныя выданьні? Навошта іх зачыняць, спаганяць фантастычныя штрафы, выкідваць з сыстэмы падпіскі ды распаўсюду? Навошта тады разрываць дамовы на распаўсюд, рызыкуючы займець судовыя працэсы ды скаргі падманутых чытачоў? Навошта тады патрэбны гучныя заявы МЗС пра недапушчальнасьць умяшаньня ва ўнутраныя справы краіны ў сувязі зь меркаванымі (!) плянамі ЭЗ наладзіць замежнае вяшчаньне на Беларусь? Навошта дэпартаваць замежных журналістаў, а айчынных — перавыхоўваць на «хіміі» на падставе абвінавачаньняў у зьнявазе гонару й годнасьці прэзыдэнта?

«Закон суровы, але гэта закон». Маўляў, ня важна, што там пішуць «нячэсныя журналісты» ў «нячэсных выданьнях». Важна, каб яны прытрымліваліся закону і не выходзілі за яго рамкі. Цудоўна! Толькі як тады быць са свабодай слова і забаронай цэнзуры СМІ, зафіксаванымі ў Канстытуцыі? Яе таксама не чытаюць жыхары Беларусі? Але няведаньне закону не пазбаўляе ад адказнасьці.

### Лёгкая цяжарнасьць

**Біблію таксама чытаў далёка ня** кожны, але ці ставіць гэта пад сумнеў біблейскія ісьціны й запаветы? Аднак аўтар згаданай інтэрнэт-публікацыі ставіць пад сумнеў каштоўнасьць свабоды слова на той падставе, што хатнія гаспадыні ці ўладальнікі легкавікоў больш любяць слухаць музыку, чым доўгія размовы. Але немагчыма быць крыху цяжарным. Свабода слова альбо існуе, альбо яе няма. А ўжо як выкарыстаць яе — дзеля высакародных мэтаў ці ў мэтах распаўсюджваньня чалавеканенавісьніцкіх ідэй — залежыць ад саміх людзей. Людзі маюць права абараняцца ад чалавеканенавісьнікаў, забойцаў і тэрарыстаў. Аднак для гэтага існуюць закон, карны апарат і самае галоўнае — суд, які толькі й можа вырашаць, ці парушае закон або правы іншага чалавека тая або іншая публікацыя. Калі заткнуць рот прэсе, становіцца непатрэбным і суд, і парлямэнт. Які сэнс у іх існаваньні, калі пра тое, што гавораць дэпутаты ці што робіцца ў судзе, усё адно ніхто не даведаецца?

Калі ў турме ў Гуантанама да зьняволеных ужываліся катаваньні, як і ў Абу-Грэйб, гэта ляжа чорнай плямай на рэпутацыю ўраду ЗША. Такія дзеяньні ня могуць быць апраўданыя ніякімі спасылкамі на нацыянальную бясьпеку й барацьбу зь міжнародным тэрарызмам. Фанатыка ня зломяць ніякія катаваньні, а невінаваты чалавек можа прызнацца пад страхам у тым, чаго ніколі не рабіў.

Урэшце, чалавек існуе для нацыянальнай бясьпекі ці нацбясьпека для чалавека? Гэтым пытаньнем задаліся дэпутаты палаты грамад брытанскага парлямэнту, калі правалілі законапраект, прапанаваны прэм'ер-міністрам, што даваў магчымасьць трымаць у зьняволеньні падазроных у тэрарызьме без прад'яўленьня абвінавачаньня тры месяцы. Ні папулярнасьць Тоні Блэра, ні партыйная дысцыпліна (супраць законапраекту галасавала частка лейбарыстаў) не засланілі ад дэпутатаў сэнсу важнасьці захаваньня правоў чалавека.



Успомніце імёны, якія згадваюцца ў дзяржаўных газэтах на самых бачных месцах, і ўявіце, што прайшло сто гадоў. Якія з гэтых імёнаў застануцца вартымі таго, каб іх помнілі?

Калі адзін з брытанскіх часопісаў напісаў, што ў турме ў Гуантанама ахоўнікі апаганілі Каран, публікацыя выклікала масавыя хваляваньні ў мусульманскіх краінах. Праўда, інфармацыя не пацьвердзілася, і рэдакцыя пастанавіла, каб падобнага роду важныя паведамленьні друкаваліся толькі з дазволу галоўнага рэдактара ці яго намесьніка. Але тут гаворка вялася пра неабходнасьць правяраць інфармацыю, а не пра забарону.

Хіба ў Расеі цэнзура інфармацыі, зьвязанай зь дзеяньнямі тэрарыстаў і антытэрарыстычнымі апэрацыямі, дапамагла прадухіліць нядаўнія крывавыя падзеі ў Нальчыку ці гарантуе ад паўтарэньня падобнага ў будучыні?

У колішнім СССР тэракт у маскоўскім мэтро, арганізаваны армянскімі нацыяналістамі, наглуха замоўчваўся прэсай. Празь дзесяць гадоў пасьля таго тэракту ўзарваўся Нагорны Карабах, з чаго пачаўся развал СССР. Ня робячы ніякага параўнаньня зь нядаўнімі выбухамі ў Віцебску, даводзіцца канстатаваць, што цяперашнія ўлады паводзяць сябе ў дачыненьні да свабоды слова гэтаксама, як паводзіла сябе савецкае кіраўніцтва — акурат да таго моманту, пакуль ня выбухнуў Чарнобыль.

### Праблема кухаркі

У свабоды слова ёсьць і адваротны бок. Масавы чытач чытае толькі тое, што яго цікавіць. І журналіст піша пра тое, што цікавіць чытача яго выданьня. Як заўважыў адзін брытанскі выдавец, чытачы якой-небудзь «Санды кронікл», хутчэй за ўсё, нават і не здагадваюцца, што недзе ў Іраку ідзе вайна. Чытачоў гэтай газэты цікавяць адно пікантныя падрабязнасьці з жыцьця каралеўскай сям'і, рэцэпты печыва, спорт і надвор'е. Але ў Англіі існуюць дзясяткі іншых сур'ёзных выданьняў зь немалымі накладамі — такія, як «Дэйлі тэлеграф», «Гардыян» або «Індэпэндэнт», чытачоў якіх цікавіць палітыка.

У Беларусі ж паважныя дзяржаўныя газэты — зь вялікай колькасьцю каляровых здымкаў, стракатым дызайнам ды агромністымі загалоўкамі — паводле зьместу ўсё больш нагадваюць заходнюю бульварную прэсу, разьлічаную на самы прымітыўны густ.

Адваротны бок ёсьць, вядома, і ў дэмакратыі. Пра яго пісаў выдатны брытанскі пісьменьнік Джон Фаўлз. На яго думку, самы непрыемны бок дэмакратыі палягае ў тым, што ў выбарах удзельнічаюць усе — у тым ліку тыя самыя кухаркі, на якіх Ленін ускладаў вялікія спадзевы. Гэта значыць, што палітычная эліта грамадзтва й будучыня дзяржавы залежаць ад меркаваньня шырокіх мас, якія могуць памыляцца і купляцца на папулізм правадыроў. У выніку на самым версе могуць апынуцца ня самыя лепшыя й здатныя, а наадварот — самыя шэрыя, абмежаваныя, але хітрыя й больш зразумелыя простаму люду асобы. Аднак развітая дэмакратыя таксама нідзе й ня зводзіцца толькі да працэсу выбараў. Ёсьць і іншыя галіны ўлады, сыстэма мэханізмаў стрыманьня — усё тое, што ў Беларусі адсутнічае. Паказальна, што А.Лукашэнка пры ўсёй быццам бы неабдымнасьці сваёй асабістай улады нядаўна яшчэ больш пашырыў яе, дадаўшы сабе права аднаасобна прыпыняць паўнамоцтвы судзьдзяў Канстытуцыйнага суду, а таксама прызначаць на гэтую пасаду.

### Сталін і дыскурс

У Беларусі пакуль захавалася тое, чаго нельга імгненна пазбавіць ніводную нацыю нават пры самай страшнай тыраніі. Гэта «думаючая меншасьць», якая паводле азначэньня заўсёды знаходзіцца ў апазыцыі да ўлады. Прычым яна ёсьць нават у шэрагах уладнай эліты, і з гэтым нічога нельга зрабіць, як няможна забараніць сам працэс думаньня.

Можна, як гэта зрабіў Ленін у 1920-я, пасадзіць усіх філёзафаў на параход і адправіць за акіян. Можна, як гэта зрабіў Сталін у 1930-я, перастраляць амаль усіх беларускіх настаўнікаў, навукоўцаў і літаратараў. Дзеяньні, што прынесьлі катастрафічны эфэкт. «Думаючая меншасьць» у беларускім грамадзтве цяпер складае меншую праслойку, чым дзе-небудзь у Эўропе. Цемрашальства ў сёньняшняй Беларусі працвітае ў самым непрыстойным выглядзе. Толькі ў сёньняшняй Беларусі рэдактар дзяржаўнай газэты можа пасьміхацца са словаў «дыскурс», не разумеючы яго сэнсу. Трэба думаць, словы «антытэза», «постмадэрнізм» або «гіпэртэкст» павінны выклікаць у яго прыступы нястрымнага рогату.

Але думаючая меншасьць усё-такі ёсьць. Трэба зазірнуць, напрыклад, на сайт радыё «Свабода» і прачытаць на ім хаця б адзін з выпускаў «Вострай брамы» Сяргея Дубаўца. Для таго, каб спрачацца з аўтарам перадачы, недастаткова ведаюць слова «дыскурс» або ўмець вышчарацца ды пасьміхацца. Для гэтага трэба як мінімум карыстацца клясычным беларускім правапісам, ведаць гісторыю Беларусі, яе літаратуру, філязофію. Трэба любіць прадмет, аб якім ідзе гаворка. І трэба яшчэ ўмець думаць і ўмець спрачацца.

А цяпер пайдзіце на вуліцы і правядзіце апытаньне: колькі людзей слухае «Вострую браму»? Колькі людзей ведае С.Дубаўца? Колькі зь іх ведаюць ці чыталі Акудовіча, Бабкова, Разанава? Колькі зь іх ведаюць беларускую мову? Колькі вераць у Бога? І што, на іх думку, ёсьць ісьціна? Аднойчы, між іншым, у гэтых людзей ужо пыталіся — ці патрэбна ім нацыянальная сымболіка? Большасьці выбарцаў, пазбаўленых элемэнтарных ведаў, яна да лямпачкі. Што й пацьвердзіў рэфэрэндум.

Калі ў чалавека ў галаве нуль інфармацыі — гэта яго асабістая праблема. Але, як казаў Станіслаў Ежы Лец, калі скласьці мільёны нулёў, вынік атрымаецца жахлівы.

На заканчэньне правядзём экспэрымэнт у думках: успомніце ўсе тыя імёны, якія згадваюцца ў дзяржаўных газэтах на самых бачных месцах, штодня гучаць па радыё і тэлебачаньні, і ўявіце, што прайшло сто гадоў. Якія з гэтых імёнаў застануцца вартымі таго, каб іх помнілі? Думаю, адказ відавочны нават для тых, хто сёньня гэтыя імёны ўслаўляе.

У рэанімацыі, калі стала крыху лягчэй, цяжэй за ўсё было прызвычаіцца да дзьвюх рэчаў — неабходнасьці прылюдна мачыцца ў вутку і да стогнаў іншых хворых. Праз некаторы час, праўда, прывыкаеш да ўсяго.

Толькі вось старая алькагалічка, якая ляжала побач, здаецца, дастала ўсіх, у тым ліку мэдперсанал. Увесь час, з ранку да вечара, яна няспынна паўтарала толькі адно слова, якое спачатку цяжка было разабраць. Гэта было слова «б…». Пажылы лекар, перахапіўшы мой позірк у бок жанчыны, з сумам заўважыў: «Вось і ўсё, што засталося ад ейнага жыцьця. У яе цыроз печані…» Потым лекар запытаўся: «Хто вы паводле прафэсіі?» Крыху падумаўшы, я адказаў: «Нячэсны журналіст». Лекар на імгненьне сумеўся, потым усьміхнуўся й падміргнуў… Жыцьцё працягвалася.

## ЛІСТЫ ЗЬ ЛЕСУ

# «Максімка»



**ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ**

«Максімка» — шклоачышчальнік на аснове этылавага сьпірту. Таксычны. Пры пападаньні на адкрытую паверхню скуры прамыць праточнай вадой». Гэта напісана на 5-літровіках, якія расейцы велікалуцкім дызэлем завозяць у Алешчу і прадаюць па 20 тыс. рублёў. Але няма пад Алешчай даўн-таўну небасягаў, на мыцьцё вокнаў якіх спатрэбіўся б аб'ём штотыднёвых расейскіх паставак. Праточнай вадой «Максімку» разбаўляюць да належнага градусу й разьліюць у бутэлькі з-пад ліманаду ці мінэралкі — і вось ён, самы даходны бізнэс у Сітна-сіці.

«Максім Максімыч», «Максімільян», «Максімус» — валадар наваколья. Ні гарэлка, ні самагонка ня вытрымаюць канкурэнцыі зь ядраным пойлам, якое ўмомант «зрывае дах» і паўлітра якога для мясцовых «сьпіртавозаў» абыходзіцца таньней за хлеб. Зрэшты, жывых грошай за «Максімыча» тут амаль ніколі ня плацяць. Бяруць «на доўг» (напрыканцы месяцу аддаюць паўзаробку), часьцей прапаноўваюць бартэр: колькі слоікаў салянкі або трыста грамаў кілбасы, якіясь рэчы…

На сьвята тут звычайна ўжываюць крамнае *віно*: «Крыжачок», «Вішнёвы сад», «Васілісу». Гэта, у параўнаньні з тэхнічным сьпіртам, — пітво высакароднае, п'ецца чаркаю. А «Максімка» — напой будзённы: «прыняць», «дагнацца», адзначыць «дзень рускай балалайкі» ці «першы аўторак тыдня»… І п'юць ужо кубкам або ўвогуле «з рыла».

У Малым Сітне — 19 пунктаў, дзе прадаецца «Максімка». Сьпіс ляжыць у сельсавеце, участковы — у курсе. Але гандаль ідзе безупынна. А то ж: у любога каляніяльнага рэжыму спойваньне заўжды лічылася найбольш эфэктыўным спосабам падпарадкаваньня абарыгенаў і нэўтралізацыі магчымага пратэсту. І той, хто гандлюе, і той, хто п'е (а разам яны ў вёсцы складаюць большасьць), ведаюць, што кожная спроба адстаяць свае правы сустрэне абгрунтаванае абвінавачаньне ў распаўсюдзе ці рэгулярным ужываньні «Максімкі». «Самі ж п'яце, — цынічна нагадвае мясцовая ўлада, — ніхто вас не прымушае». Ад безвыходнасьці люд глушыць яшчэ больш. Труціцца. Вешаецца. Вымірае. Эпілепсія, якая разьвіваецца ад пастаяннага піцьця «Максімкі», на алешчынскай эстакадзе — звычайная зьява. Калі пахмельны раскрыжоўшчык з заведзенай бэнзапілой раптам разварочваецца — ты жахаесься ад невідушчага позірку. Калі малады мужык падае на бярвеньне, разьбівае ў кроў галаву й калоціцца без прытомнасьці; калі маці чацьвярых дзяцей, што адкочвае крукам ствалы на эстакадзе, у прыпадку валіцца на кучу сьмецьця — народ абыякава паціскае плячыма: «Максімка». Цудоўныя беларускія тыпажы, вобраз і падабенства Божае, па меры алькагольнай дэградацыі набываюць яўныя рысы ідыятызму. Людзі гніюць зажыва, пачынаючы з галавы. Дзеці нараджаюцца разумова адсталыя ці з псыхічнымі расстройствамі.

Адны рэпрэсіўныя захады становішча не паправяць. Апроч нармальнай мяжы з Расеяй, апроч буйных штрафаў за распаўсюджваньне зельля, апроч татальнай інфармацыйнай прафіляктыкі тут трэба нешта большае. Трэба зьнішчыць прычыну, якая штурхае люд да запою. Вярнуць беларусам сэнс жыцьця. Веру ў Бога. Любоў да Радзімы. Сваю справу.

Спыніць трыюмфальнае шэсьце «Максімкі» можна толькі адным чынам.

Перамагчы ў 2006-м.

*Малое Сітна*

## УДАКЛАДНЕНЬНЕ

У «НН» №42 пры наборы «Ліста зь лесу» аўтарства Паўла Севярынца была дапушчана памылка. У сказе: «Дзякуй Богу, дапамагаюць наведнікі і праваабаронцы...» слова «бог» было надрукавана з малой літары. Памылку выпраўляем: аўтар менавіта дзякуе Богу, а не ўжывае пабочную канструкцыю.

# 50 допытаў Анжалікі Борыс

**Анжаліку Борыс зноў выклікалі ў аддзяленьне міліцыі ў Горадні. Гэта ўжо пяцідзясяты сёлета допыт старшыні Саюзу палякаў, не прызнанай беларускімі ўладамі.**




PHOTO.BYMEDIA.NET

**Галадоўка салідарнасьці з Аўтуховічам**

10 лістапада міліцыянты затрымалі нумар недзяржаўнай **«Местной газеты»** з матэрыяламі пра **Мікалая Аўтуховіча**. Распаўсюдніцу **Маргарыту Макавецкую** аштрафавалі ў судзе на 10 тыс.руб. за гандаль у неналежным месцы й канфіскавалі 400 асобнікаў газэты.

Жыхары Ваўкавыску **Юры Лявонаў** (дырэктар фірмы «Ніка–Транс»), **Людміла Парэмбская** (сакратарка фірмы), **Іван Янушкевіч**, **Міхаіл Семярыч** (кіроўцы фірмы) і беспрацоўны, былы супрацоўнік падатковай інспэкцыі **Ўладзімер Асіпенка** абвясьцілі 14 лістапада бестэрміновую галадоўку ў знак падтрымкі М.Аўтуховіча. Адпаведныя заявы яны падалі на імя старшыні райвыканкаму Савельева. Сам прадпрымальнік галадае за кратамі.

**Ператрус у актывіста ТБМ**

У Сьветлагорску міліцыянты 12 лістапада правялі ператрус на кватэры актывіста ТБМ **Вадзіма Богдана** ў адсутнасьць гаспадара. Міліцыянты назвалі прычынай ператрусу інфармацыю пра наркотыкі, але шукалі друкаваныя матэрыялы й памнажальную тэхніку. Канфіскавалі бюлетэні да Дня салідарнасьці й каля 30 асобнікаў газэты «Рэгіянальныя навіны». У ордэры было няправільна ўказана імя («Уладзімер» заміж «Вадзім»).

**Гавін — апраўданы, але падазраваны**

Першага старшыню Саюзу палякаў Беларусі **Тадэвуша Гавіна** 8 лістапада выклікалі ў міліцыю ў справе праверкі дзейнасьці **Анжалікі Борыс**: Гавіна пыталіся, як разьмяркоўвалася пры ім замежная дапамога. У гэтай жа справе 14 лістапада на допыт выкліканыя А.Борыс, ейны намесьнік **Юзаф Пажэцкі** ды яшчэ тры актывісты СПБ.

Вярхоўны суд 8 лістапада пастанавіў скасаваць рашэньне судзьдзі Кастрычніцкага раёну Горадні ад 12 жніўня, якое прызнавала Гавіна вінаватым у дробным хуліганстве й асуджала на 15 сутак арышту. Тады Гавіна, які ўжо сядзеў пад арыштам, абвінавацілі ў хуліганстве ў дачыненьні да іншага пакаранага. Цяпер ён зьбіраецца судзіцца з гарадзенскім судзьдзём і патрабаваць маральнай кампэнсацыі.

**Статкевіч на хатнім рэжыме**

Палітвязьня **Міколу Статкевіча** адміністрацыя баранавіцкай спэцкамэндатуры 11 лістапада перавяла на хатні рэжым: цяпер ён можа жыць у бацькі.

**Газэты адбіваюцца**

Недзяржаўная газэта **«Народная воля»** 10 лістапада падала ў гаспадарчы суд Менску пазоў супраць РУП «Белпошта», якое адмовілася ўключаць выданьне ў падпісны каталёг на 2006 г.

У Горадні ў той самы дзень пасьля амаль гадавога перапынку выйшла газэта **«Биржа информации»** — нумар друкаваўся ў Смаленску, бо беларускія друкарні адмовіліся.

Мінінфармацыі 9 лістапада вынесла папярэджаньне рэдакцыі недзяржаўнай газэты **«Згода»** за распаўсюджваньне зьвестак, якія зьневажаюць гонар і годнасьць кіраўніка дзяржавы, у шэрагу матэрыялаў.

Супрацоўнікі паштовых аддзяленьняў Пінску «ня раяць» выпісваць недзяржаўную газэту **«Мясцовы час»**, бо паштары ня будуць разносіць яе падпісчыкам ужо з новага году.

14 лістапада РУП «Белпошта» выключыла з падпіснога каталёгу недзяржаўную **«Рэгіянальную газету»**: падставай стала запазычанасьць у… 66 210 руб.

Недзяржаўная **«Газета для вас»** (Івацэвічы) 14 лістапада атрымала інфармацыю, што яе маюць выселіць з памяшканьня райбыткамбінату, якое рэдакцыя арандавала апошнія тры гады. Ініцыятарам скасаваньня арэнды, паводле зьвестак рэдактаркі Лідзіі Цалуйкі, выступае райвыканкам.

**Завадзкай адмовілі**

Судзьдзя Валеры Есьман з суду Цэнтральнага раёну Менску 11 лістапада не задаволіў скаргу **Сьвятланы Завадзкай** на сьледчых раённай пракуратуры. Жанчына абскарджвала адмову завесьці крымінальную справу ў дачыненьні да амапаўца Юр'я Давідовіча, які ўдарыў яе па твары. У судзе выявілася, што на стужцы заміж моманту ўдару запісаная перадача з ОРТ. Прадстаўнікі бюро ОРТ у судзе пацьвердзілі, што на стужцы, якую перадавалі яны, гэтага запісу не было. Завадзкая мае скардзіцца ў Менскі гарадзкі суд.

**Затрымалі сына Леванеўскага**

У Горадні 13 лістапада падчас распаўсюду газэты «Биржа информации», бюлетэню «Предприниматель» і ўлётак затрыманы **Ўладзімер Леванеўскі**, сын палітвязьня Валер'я Леванеўскага. У пастарунку ў яго канфіскавалі ўсю друкаваную прадукцыю, пратакол затрыманьня не складалі.

**БТ непадсуднае**

Прэзыдыюм Менгарсуду 9 лістапада адмяніў рашэньне суду Першамайскага раёну, каб Белтэлерадыёкампанія абвергла непраўдзівую інфармацыю, распаўсюджаную ў праграме «Панарама» наконт слонімскага **ГА «Воля да разьвіцьця»** ды ягонага кіраўніка **Міхася Варанца**. Прысуд на карысьць слонімцаў быў вынесены 14 лютага, аднак БТ не абвергла пададзенай інфармацыі нават пасьля касацыйнай скаргі, за што 24 жніўня было аштрафаванае. Пасьля пратэсту зь Вярхоўнага суду было вырашана, што выказваньне журналіста Мікалая Мельячэнкі «мае характар меркаваньня».

**Зьбілі журналіста**

У Барысаве 8 лістапада зьбілі журналіста незалежнай газэты «Барысаўскія навіны» **Алеся Абрамовіча**. Калегі не выключаюць, што напад мог быць выкліканы публікацыямі ў прэсе.

**Маўзэр папаў пад гарачую руку**

Актывіст незарэгістраванай арганізацыі «Зубр» **Ўладзіслаў Бародка** й актывіст АГП **Дзяніс Залуцкі** 8 лістапада былі затрыманы падчас распаўсюджваньня незарэгістраванай газэты «16»; у іх канфіскавалі 400 нумароў газэты, налепкі да Дня салідарнасьці й значкі «Люблю Беларусь». «Зуброўца» **Яўгена Суворава**, які фатаграфаваў падзеі ў аддзяленьні праз акно, таксама затрымалі.

Падчас расклейкі ўлётак да Дня салідарнасьці ў ноч з 12 на 13 лістапада затрыманы «зуброўцы» Я.Сувораў і **Андрэй Баскораў**.

У тую ж ноч міліцыянты затрымалі ўдзельнікаў гурту **«Таварыш Маўзэр»** на чале з кіраўніком гурту **Янам Маўзэрам**, якія расклейвалі афішы свайго будучага канцэрту.

**Арышт камуністкі**

7 лістапада ў Гомелі падчас раздачы газэты «Товарищ» міліцыянты затрымалі **Марыю Багдановіч,** канфіскаваўшы ў яе 72 газэты й 69 улётак. 11 лістапада яе выклікалі ў пракуратуру Цэнтральнага раёну: у дачыненьні да актывісткі апазыцыі распачалі крымінальную справу паводле арт.172, ч.8 («Незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ»), бо ўлёткі, укладзеныя ў газэты, пракуратура палічыла незарэгістраваным дадаткам. М.Багдановіч пагражае штраф 225 тыс.руб.

**Салігорскія вянкі**

У Салігорску 7 лістапада сябар БНФ **Павал Батуеў**, сябар АГП **Уладзімер Лемеш**, чальцы руху «Маладыя дэмакраты» **Дзяніс Карноў** і **Аляксей Валабуеў** прынесьлі да помніка Леніну вянкі з калючага дроту. Хлопцаў адпусьцілі з аддзяленьня міліцыі празь дзьве гадзіны.

**Не пусьцілі ва Ўкраіну**

Актывіста незарэгістраванай арганізацыі «Трэці шлях» **Паўла Марозава**, які ехаў ва Ўкраіну, 9 лістапада ня выпусьцілі зь Беларусі, не зважаючы на дазвольны штамп у пашпарце й адсутнасьць забароны на выезд за межы краіны. Памежнікі матывавалі гэта загадам зь Менску — з КДБ і пракуратуры.

**У Вялейцы**

Актывістаў дэмакратычнага руху **Ўладзімера Малярчука** й **Мікалая Суслу** затрымалі 12 лістапада ў Вялейцы: яны распаўсюджвалі на гарадзкім рынку бюлетэнь з заклікам падтрымаць Дзень салідарнасьці.

**Звольнены прафсаюзны актывіст**

Савет Свабоднага прафсаюзу Беларускага (СПБ) 14 лістапада ня даў згоды дырэкцыі ААТ «Заслаўесьвідравод» на звальненьне старшыні прафсаюзнай арганізацыі **Ўладзімера Феакцістава**. Дырэкцыя лічыць, што прафсаюзны актывіст «сыстэматычна не выконваў абавязкі», а прафсаюз зазначае, што ўсе дысцыплінарныя спагнаньні на Феакцістава накладаліся бязь ведаму прафсаюзу, што супярэчыць заканадаўству.

**АШ**



# Скрабец паўгоду ў турме

**14 лістапада экс-дэпутат Сяргей Скрабец пачаў чарговую галадоўку. Яго жонка паведаміла, што ў мужа падагрычны поліартрыт пры парушэньнях абмену рэчываў, Скрабец трывае моцныя боль і ня можа ступаць на правую нагу. Праваабаронцы прызнаюць С. Скрабца палітвязьнем.**

# Перамога «Новага Жыцьця»



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Вернікі пратэстанцкай царквы «Новае Жыцьцё» атрымалі тэхпашпарт, які сьведчыць, што памяшканьне, у якім царква ладзіць набажэнствы, — культавы будынак. У верасьні Менгарвыканкам адмовіўся быў прызнаваць культавым будынкам былы кароўнік на ўскраіне Менску, выкуплены пратэстантамі ў 2002. Пратэстанты адсталі сваю царкву.**


Юлія Дарашкевіч

**Ужо тыдзень Беларусь у тумане.**

# Невіртуальныя праблемы школьных бібліятэк

За вонкавай стабільнасьцю адукацыі тояцца праблемы. Сярод іх — стан школьных бібліятэк, найперш вясковых.

Першая чвэрць для бібліятэкара праходзіць пад знакам дакамплектацыі падручнікаў. Тады бібліятэкары зьвяртаюцца адзін да аднаго, мяняючыся тым, што ёсьць, і дзейнічаючы на мяжы адказнасьці. Некаторыя раяць бацькам дакупляць кнігі ў вялікіх гарадах, але нават за некамплектны набор даводзіцца плаціць поўны кошт. Існуе негалосная інструкцыя з раённых аддзелаў адукацыі забясьпечваць найперш платнікаў, і дзеці з малаамаёмных сем'яў, што маюць права на льготы, атрымліваюць кнігі па рэштквавым прынцыпе.

Дакамплектаваньне вясковых школ аднабаковае і беднае. Выпісваецца толькі праграмная літаратура. Даведачная літаратура, роля якой значна ўзрасла зь пераходам да новай сыстэмы адукацыі, амаль не абнаўляецца. Пра доступ у Інтэрнэт у вясковых школах і гаварыць не прыходзіцца. Прасьцей выдзяляць штогод фінансы на квоту для вясковых выпускнікоў пры паступленьні ў ВНУ.

Некалькі год, як урэзалі фінансаваньне на падпіску. Зь бібліятэк зьнiклі «Бярозка» і «Раніца», «Арэлі» і «Лесавік», якія зачытваліся дзецьмі да дзірак. Паводле вынікаў апытаньняў, толькі 20% вучняў могуць дазволіць сабе выпісаць дзіцячыя выданьні. Затое бібліятэка, як і настаўнікі, мусяць падпісацца на афіцыёз — ад «СБ» да раёнкі.

Большасьць вясковых школак ня маюць дастатковай колькасьці вучняў і як вынік — паралельных клясаў, а менавіта іх наяўнасьць дае магчымасьць бібліятэкару працаваць на поўную стаўку. Але працы ня менее. І абслугоўваньне чытачоў, і дакумэнтацыя, і рэгулярная справаздачнасьць…

Яшчэ вастрэйшым зьяўляецца пытаньне матэрыяльнага забесьпячэньня. Бібліятэкар — не настаўнік, ён ня можа дамовіцца з бацькамі наконт рамонту памяшканьня. Ахвотней праспансаруюць спартзалю, куды можна наведацца самім. Таму шпалеры ў бібліятэках не мяняюцца гадамі, падлога фарбуецца рэштай, што застаецца ад іншых кабінэтаў. Тое, якой бачаць бібліятэку дзеці, залежыць ад ініцыятывы і здароўя бібліятэкара.

Праблем — шмат, і іх трэба вырашаць.

**СП**

## СЬЦІСЛА

### Ахвяры лезуць на чыгунку

Штогод на чыгунцы гінуць дзясяткі дзяцей і дарослых. Вінаватыя амаль заўсёды самі ахвяры. Так, з пачатку году на аршанскім участку чыгункі зафіксавана больш за 20 праваправушэньняў. Найбольш падобных злачынстваў зроблена на трасе Ворша—Талачын. Гэта ў асноўным кіданьне камянёў па цягніках ды электрычках. Калі дадаць да хуткасьці цягніка ў 100—120 км/г хуткасьць кінутага каменя вагою 200—500 грамаў, дык выйдзе сукупная хуткасьць 180—200 км/г. Неаднойчы ад гэтага цярпелі ня толькі шыбы вагонаў, але й самі пасажыры. Ніяк ня выкараніць і звычку класьці на рэйкі розныя прадметы (бярвёны, камяні, жалеза). Шлях цягніка пры экстранным тармажэньні сягае да 800 мэтраў. Пасьля падобных выпадкаў машыністы вымушаны лячыцца ў мэдыка-рэабілітацыйных цэнтрах — прытым што ў машыністы не бяруць людзей зь нетрывалай псыхікай. Вандалізмам на чыгунцы займаецца моладзь ад 7 да 17 гадоў. Таму й пакараньні ім за зьдзейсьненае зусім невялікія, а чыгунка працягвае заставацца зонай павышанай рызыкі.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

### Тыповы інтэлігент

9 лістапада ў Полацку на будынку гарадзкой паліклінікі зьявілася мэмарыяльная дошка ў гонар вучонага-біяхіміка Юр'я Астроўскага (1925—1992). Гэты стваральнік Інстытуту біяхіміі ў Гарадні пачынаў навуковую дзейнасьць ў лябараторыі полацкай больніцы. Ва ўрачыстасьці ўзялі ўдзел прадстаўнікі Акадэміі навук, кіраўніцтва гораду. Астроўскі вядомы і як патрыёт сваёй бацькаўшчыны, прыхільнік нацыянальнага адраджэньня, аматар беларускай культуры і гісторыі. У 1980-х ён быў адным з кіраўнікоў патрыятычнага клюбу «Паходня». Цяпер ягоную справу — мэдычную і нацыянальную — працягвае ягоны сын, прафэсар Гарадзенскага мэду.

**Васіль Кроква, Полацак**

### «Саюздрук» пра Фаму і Ярому

Горацкі журналіст Эдуард Брокараў атрымаў першы адказ на заўвагу з патрабаваньнем узнавіць продаж у шапіках «Саюздруку» газэты «Народная воля». Такія патрабаваньні ён рэгулярна запісвае ў кнігах заўваг кіёскаў, бываючы ў розных гарадах. У Воршы кіраўнік аддзяленьня «Саюздруку» адказаў, што газэта не прадаецца па ўказаньні вышэйшай арганізацыі, але яе можна выпісаць на пошце. Але ж газэта выкінута з падпіснога каталёгу на 2006 год.

**Горацкі**

### Прэзыдэнцкі гадзіньнік спыніўся на 12-ці

Цікавы сувэнір можна прыдбаць у адной з крамаў — гадзіньнік з выявай «усенароднавыбранага». Напэўна, па задуме яго стваральніка ён павінен адлічваць шчасьлівы час беларускай стабільнасьці. Але чамусьці ў гандлёвай кропцы гадзіньнік спыніўся. Прычым стрэлкі сымбалічна спыніліся на лічбах 10 і 2. У суме — 12 год. Можа гэта не выпадкова?

**«Бармiца», Глыбокае**

ТЭНДЭНЦЫІ

# За якога Мілінкевіча вёска прагаласавала б

За незалежнага кандыдата вяскоўцы прагаласуюць, толькі калі ён будзе мець канкрэтную і жыцьцёвую праграму.

Вяскоўцы — гэта ня толькі даяркі ды трактарысты. Гэта й настаўнікі, мэдработнікі, прадпрымальнікі, што маюць свае інтарэсы і погляды.

Калгасьнікі, якія амаль не чытаюць прэсы, нават дзяржаўнай, са страхам чакаюць перамен і ня бачаць альтэрнатывы існуючаму ладу, які дазваляе трошкі прынесьці з працы камбікорму, што паможа выгадаваць кабанчыка, каб потым заплаціць за «бясплатнае» навучаньне дзяцей. Яны баяцца, што прыйдзе *нехта* і ўсё парушыць. «Без Лукашэнкі мы даўно б паздыхалі з голаду, а так ён нам дае красьці і на сябе не забывае» — кажа мая суседка. Дзеці, гледзячы на бацькоў, гадуюцца згодна зь лёзунгам «Каб заўсёды жыць у шчасьці, трэба…». А ўсё ж людзі ня вырадкі. І большасьць была б рада бачыць альтэрнатыву дробным крадзяжам, легальны і добры заробак. Ніхто ня хоча быць аднойчы засьпетым на гарачым, страціць і без таго малааплатную працу.

Хто-ніхто марыць мець уласную зямельку. Ня факт, што і калгаснае начальства ў захапленьні ад «адраджэньня вёскі» з усімі выдаткамі. Шмат хто з спэцыялістаў чакае зьмен у гаспадараньні. І хочуць самі вырашаць, што, дзе і калі сеяць ды каму і па якой цане прадаваць. Знаёмы аграном марыць пра нямецкую дысцыпліну: «Каб я мог звальняць усіх «сініх» ды занадта лянівых, то лепшага й не хацеў бы. Ну хіба яшчэ каб кепскія землі вывесці з карыстаньня, не марнаваць паліва ды насеньне...»

Пра тое ж гавораць і вясковыя прадпрымальнікі. Гэтым толькі б спрасьціць працэдуру рэгістрацыі ды адрэгуляваць падатковую сыстэму, даць магчымасьць працаваць на сябе. Яны, як ніхто, чакаюць зьменаў. Большасьць за працай ня мае часу на палітыку ды газэты, затое ў гутарцы вясковыя камэрсанты, дый жыхары невялікіх гарадкоў, выяўляюць жывы інтарэс да палітычных падзей. Не канкрэтызуючы, хто ім замінае, просяць аб адным: «Абы нам не мяшалі ды падаткамі не душылі, а мы ўжо самі неяк пражывём».

Самы незайздросны лёс — у вясковай інтэлігенцыі. Настаўнікі, мэдыкі — заўсёдныя чальцы выбарчых камісій, і ім добра вядома, які лёс напаткаў выбары з рэфэрэндумам. Гэтым людзям у большасьці ня трэба нічога тлумачыць, усё яны разумеюць. Яны чакаюць, можа, без энтузіязму, перамен і сьвежых твараў у тэлевізары ды прэсе. Аднак той, каго яны чакаюць, мусіць запэўніць, што гэтым разам усё будзе інакш — празрыста і зразумела.

Настаўніцтва стамілася ад паказушнасьці і фармальнасьці навучальнага працэсу, засільля праверак, прымусовых суботнікаў ды падпісак на дзяржпрэсу. Яны хочуць спакойна працаваць і мець з гэтага годны заробак. «У панскай Польшчы, — кажа настаўнік гісторыі — з настаўнікам першым віталіся. І думаў ён толькі пра працу, не клапоцячыся пра агарод ды сьвіней».

Яшчэ вясковых жыхароў яднае адно — прага відовішчаў. Пэрманэнтных гулянак хапае: «дажынкі», сьвяты вёсак — а бібліятэкі з кіназаламі ў занападзе. «Раней арцісты часта езьдзілі, дык аж клуб ад людзей трашчаў. А цяпер няма нічога, толькі дзіскацекі гэтыя для маладых круціць», — кажа старэнькая бабуля, якая ня гледзячы на гады ня страціла прагі да цікавостак. Моладзі застаецца сьпіваць на «гапатэках». А яна, моладзь, што прыйдзе галасаваць, хоча найперш жыць паўнавартасным жыцьцём, а не існаваць.

**Сямён Печанко, Карэлічы—Менск**



# Згубленыя ў восені

**АНАТОЛЬ ІВАШЧАНКА**

Сёлета я ня маю восені. Заўважаю, нават чую яе пах, але ня маю. Восень маўклівымі дэкарацыямі праходзіць за шыбінамі аўто. Нібы на сэансе ў аўтакінатэатры, які зацягнуўся.

Жалезная скрыня на колах неяк цішком ператварылася ў маё другое жытло, што зьмяшчае ў сабе страўню і нават бібліятэку. Да нядаўняга часу — пакуль не пакінуў яе на гадзіну на неахоўнай стаянцы ля будаўнічага рынку (паблізу ад плякату, які настойліва заклікаў гэтага не рабіць) — зьмяшчала й фанатэку… Цяпер еджу, падмармычваючы нешта сабе пад нос. Чамусьці найчасьцей па маім унутраным радыё «круцяць» Земфіру.

Заўжды можна пазнаць аўто, якое сталася другім жытлом. Па гармідары на заднім сядзеньні. Па перапоўненай попельніцы… З маёй попельніцы тырчыць пакецік з арахісам. Задняе сядзеньне заваленае кнігамі й будматэрыялам. Паміж ручніком (у сэнсе, ручным тормазам) і пасажырскім сядзеньнем — нязьменная бутэлька якой-небудзь газаванай бурды.

Езьдзіць па Менску штогод усё весялей. Стоячы ў заторы, назіраю, як адна спадарыня на навюткім «мэрсэдэсе»-кабрыялеце падразае нешта надзьмутае, танаванае і бліскучае. Віскат тармазоў, і апошняе ўяжджае ў задні бампэр «мэрсу». Ня моцна. За рулём «надзьмутага» таксама апынаецца маладая жанчына. Яна падыходзіць да крыўдзіцелькі й штосілы лупіць кулаком ёй у голаў (на бяду, працьз сьпёку кабрыялет быў адкрыты). Затым пераможна сядае да сябе і зьяжджае.

Восень зрэдзьчасу прыходзіць да мяне на госьці. Так, аднаго разу яна завітала на дзесяць хвілін разам зь сябрам. Сябар прачытаў новы верш пра кастрычнік і пакінуў у попельніцы недапалак. Сваю восень ён ашчаджае.

Але прычына маёй страты восені (праўдзівей, страчанасьці ў восені) — не ў двухмесячным «дні сурка», урытмаваным паміж працай і рамонтам. Рэч у тым, што гэтае восені ня маеш і ты. Нашае першае восені…

Пад вокнамі твайго цяперашняга жытла, на асфальце, двухмэтровымі літарамі нехта напісаў: «Дзякуй за сына!!!» Я ж прыношу табе букет вільготнага кляновага лісьця й гэты, складзены за рулём, верш.

120
Ідзеш па МКАД.
За паваротам — неба
раскрые свае абдоймы
табе і твайму аўто.
Зьлева — вэлюм смугі
сьцякае з распаранай хмары,
перафарбоўваючы
ў ружовае лес і аблокі.
(Які ў Яго «Photoshop»?)
З калёнак вакол і знутры
ірвецца гітарнае сола
і завісае ў паветры
разам з падступнаю думкай:
пад гэтымі песьняй і небам,
дайшоўшы да ста сарака,
разьбіцца–распасьціся ў хлам —
ня горшы расклад. Толькі вось
шкада, няма поруч цябе.

БІБЛІЯТЭКА

# Каралеўства Бабкова

Кнігай **Ігара Бабкова** «Каралеўства Беларусь. Вытлумачэньне ру(і)наў» распачалася сэрыя «Галерэя Б» у выдавецтве «Логвінаў».

Першая сустрэча новага выданьня з чытачамі адбылася 9 лістапада на пасяджэньні паэтычнай «Галерэі Б». «Каралеўства Беларусь» — кніга паэтычных эсэ, якія друкаваліся ў «НН», «Дзеяслове», «ARCHE», «Фрагмэнтах», «Крыніцы». На вокладцы — таямнічае прыстасаваньне, падобнае адначасова й на фотаапарат, і на дзьвярную ручку. Своеасаблівае запрашэньне ці то зайсьці, ці то проста паглядзець на Каралеўства Беларусь. Бабкоў даўно паказаў сябе прыхільнікам манархіі: першая яго кніга называлася «Solus Rex». Новая — узор таго, якім каралеўствам можа выглядаць Беларусь — «краіна без культурнага алібі»…

Паказваючы навінку, аўтар паўіранічна растлумачыў: «Тут магло быць ваша прозьвішча». Наступнымі ў сэрыі павінны ўбачыць сьвет кнігі Валянціна Акудовіча, Марыі Барадзіной, Анатоля Івашчанкі, Андрэя Адамовіча. Пляны ў «Галерэі Б» выглядаюць вельмі прывабна. Уздымаючы келіх шампанскага за «Каралеўства Беларусь», Бабкоў з аптымізмам зазначыў, што разьлічвае, прынамсі, на пяць падобных вечарын на год.

**Бабкоў Ігар.** Каралеўства Беларусь. Вытлумачэньні ру[і]наў. — Менск: Логвінаў, 2005.




Каб не паўтараць зьмешчанага ў кнізе, Ігар Бабкоў прачытаў сваё апавяданьне «Восень у Горадні». А пры канцы сустрэчы прэзэнтаваў усім прысутным «Каралеўства Беларусь». Андрэй Хадановіч «адхапіў» сабе нават два асобнікі: другі ён паабяцаў падарыць «ідэальнаму чытачу або чытачцы Ігара Бабкова».

**АВ**

ЧЭСЛАЎ МІЛАШ

### Каляды

Нядобрыя анёлы,
Запляміце вы стойла,
Хоць срэбныя ў вас крылы,
Іх густа кроў пакрыла.
О, матка, над зямлёю
З чырвонаю расою
Ляцелі мы штосілы
І замачылі крылы.
Нядобрыя анёлы,
З абдзертых крыл упала
На лоб яму крапліца
Густая, як жывіца.
О матка, глянь, што стала,
З чала Яго зазьзяла
Крыві крапліца ўшыркі
Дзівосным бляскам зыркім.
О матка, глянь, што стала,
Яна ўгары зазьзяла,
Над цёмнай ноччу земскай
Ёсьць зоркай бэтлеемскай.
Gloria, gloria in excelsis Deo.

*Варшава, 1942*



# Іншага канца сьвету не бывае

## Галасы бедных людзей

### Песенька пра канец сьвету

У дзень канца сьвету
Пчала кружляе над кветкай настурцыі,
Рыбак напраўляе блішчастыя сеці.
Весела скачуць у моры дэльфіны,
Вераб'і маладыя чапляюцца рыны,
І вуж мае з золата скуру, якую й павінен мець.
У дзень канца сьвету
Полем ідуць пад парасонікамі кабеты,
Выпівоха засынае з краю газону,
Прадаўцы гароднiны крычаць на вуліцах сонных,
І лодка зь ветразем жоўтым да выспы падплывае,
Пілíканьне скрыпак у паветры трывае
І зорную ноч адмыкае.
А тыя, хто чакаў бліскавіц і перуноў,
Расчараваныя.
А тыя, хто чакаў знакаў і архангельскіх трубаў,
Ня вераць, што ўжо надыходзіць.
Пакуль сонца й месяц вісяць над ігрушай,
Пакуль чмель наведвае ружу,
Пакуль родзяцца ружовыя дзеці,
Ніхто ня верыць, што ўжо надыходзіць.
Толькі стары дзядок, каторы быў бы прарокам,
Але не прарок, бо іншы занятак мае,
Кажа, падвязваючы памідоры:
Іншага канца сьвету не бывае,
Іншага канца сьвету не бывае.

### Прадмесьце

З картамі рэчка ўпадае
Ў гарачы пясок,
Зьбялелае сонца нырае
Ў гарачы пясок,
Фэлек пры банку, Фэлек здае нам,
І зьліплую талію бляск працінае,
Гарачы пясок.
Зламаны цень коміна. Рэдкая траўка.
Далей адамкнуты крываваю цэглаю горад.
Крушні рудыя, сплецены дрот на прыстанках.
Сухое рабро заржавелага кузава.
Сьвеціць кар'ер.
Пустая кварта закапана
Ў гарачы пясок.
Кропля дажджу згарнула
Гарачы пясок.
Янак пры банку, Янак здае нам,
Грамы ляцяць, і ліпні, і траўні,
Грамы другі год, грамы і кварты,
І бляск праз чорныя сыплецца карты
Ў гарачы пясок.
Далей адамкнуты крываваю цэглаю горад,
Адзіная хвоя за домам жыдоўскім,
Сыпучыя ў пустцы сьляды, а пустэль аж да краю.
Пыл вапняны, вагоны паўзуць.
А ў вагонах чыясьці жальлівая скарга.
Вазьмі мандаліну, на мандаліне
Ўсё гэта сыграеш,
Эх, пальцам аб струны.
Пекная песенька,
Поле бясплоднае,
Выпіта шклянка,
Болей ня трэба.
Вунь па дарозе йдзе весела дзіва,
З корку пантофлі, чубчык завіты,
Ходзь жа, дзяўчынка, пабаўся з намі.
Поле бясплоднае.
Сонца заходзіць.

*Варшава, 1943/44*

### Скарга паняў мінулага часу

Нашы сукні з брыжамі падзерліся ўшчэнт на дарогах,
Перлы ў бездань гісторыі ўпалі й памеркнулі ў зямлі,
Разагнаў рэшткі спаленых стужак вятрыска па водах,
З нашых пальцаў пярсьцёнкі нядобрыя людзі зьнялі.
Нашы дзіва-прычоскі, ў якія майстры заплятаі
Зоркі срэбныя, яркія райскія пёры, півоні,
Спрахлі й попелам паабсыпаліся ў шэры суцём.
А калі з мора ўстала зара і абсягі зазьзялі,
Галяком па прыступках мы ў новым ішлі Бабілёне,
Штось прыпомніць спрабуючы з зморшчаным,
хмурым чалом.

*Гошыца, 1944*

### Песенька пра парцаляну

Ружовыя сподкі, гаршчэчкі,
Квяцістыя філіжанкі
Ляжаць на беразе рэчкі,
Там, дзе прайшліся танкі.
Над вамі ветрык віецца,
Зь пярыны пух цярушыць,
На чорны сьлед кладзецца
Зламаны цень ігрушы.
Дол, куды я ні гляну,
Крохкай пенай засланы.
Нічога мне так, прабачце,
Ня шкода, як парцаляны.
Ледзьве займецца на раньне
Над кругаглядам пляскатым,
Там, дзе гудуць раскаты,
Спадачкаў чую бражджаньне.
Сны майстроў залатыя,
Застыглыя лебедзяў пёры,
Плывуць у падземныя норы,
Дзе іх забыцьцё акрые.
Мінаю, устаўшы рана,
Гэта ўсё, ўсхваляваны.
Нічога мне так, прабачце,
Ня шкода, як парцаляны.
Да самага сонца прастора
Скарлупкамі густа ўкрыта.
Скрыпіць пад ботам бадзёра
Пласт парцаляны разьбітай.
Забаўкі, што колісь кідкай
Сваёй весялілі барвай,
Цяпер, ах, заплямлены брыдкай
Запеклай чырвонай фарбай.
На доле сьвежаўскапаным
Ляжыць вушка, дзенца ад збана.
Нічога мне так, прабачце,
Ня шкода, як парцаляны.

*Вашынгтон, 1947*

### Адбіткі

Стаптаны мурог, а над лугам аблокі.
Стаптаны мурог, а над ім — калёна блакіту.
А на даляглядзе сінія значыць крокі
Дняпро або Вісла на ўлоньні з граніту.

Такі краявід адбіваецца ў чыстай вадзе:
Зруйнаванае места, а над местам — аблокі.
Зруйнаванае места, а над ім — калёна блакіту.
А на даляглядзе мінае свае парогі
Гісторыі рэшта, або вясна міту.
Мёртвая мыш-палёўка й жукі-грабары
На сьцежцы, якой сямігодняя радасьць імчыць.
Расьсьмяяныя твары, вясёлка на круглым мячы
І жоўты бляск красавіка або траўня, што льецца
згары.
Такі краявід адбіваецца ў чыстай вадзе:
Пабітае племя, у панцырах далакопы,
Тысячагодняя радасьць бяжыць па сьцяжыне,
Поле валошак квітнее там, дзе акопы,
І ўсё на сьвеце ахутана цішаю сіняй.
Такі краявід адбіваецца ў чыстай вадзе.

*Варшава, 1942 — Вашынгтон, 1948*

### Заіле

Гугнявіш млосна ці бярэш сызморам,
Старонкі чэрнячы пустых выданьняў,
Узвый, калі наўспак абгрунтаваньням
Сьвет бухне ружай, трэсьне мэтэорам.
Пакуль жывіце. Плён лухты зьнікомы
І ваш спадзеў драмаць ва ўтульнай багне
Паэт, што ўласна з вас сьмяецца, прагне
Засунуць у крышталік нерухомы.
Тады, як мухі, будзеце ў бурштыне,
Расчараваныя ўсьцяж, як відаць па міне,
На пузках малітоўна склаўшы лапкі.
Крывыя пыскі, джалы, шпагі, звады
Блісьнуць знутры, калі камень з шуфляды
Хтось выне з рознай драбязы прабабкі.

*Вашынгтон, 1950*

### Нататнік: Пэнсыльванія

«Ва Ўсходняй Эўропе заўжды штось благое,
Ва Ўсходняй Эўропе заўжды штось ня тое,
Ва Ўсходняй Эўропе заўжды ўсё старчма,
Жыў-быў чалавек — і праз хвілю няма.
Забудзь яе, хто б ні зьбіваў цябе з тропу,
І маўчы, што родам з Усходняй Эўропы».
Так пані Бэйкер да дачкі казала Катрыны
І каву сабе налівала з блішчастай машыны.
Муж пані Бэйкер празываўся Пекар,
Хоць здабываў чорны вугаль зь зямлі ўжо
чвэрць веку.
Ціхі то быў чалавек, сялянскага сэрца,
А народжаны дзесьці паблізу Мельцу.
Бацька пані Бэйкер на саксах калісь вандраваў,
Палі брандэнбурскія жаў і араў.
Матка пані Бэйкер пасьвіла авечкі
У падгалянскай вёсцы ля соннай рэчкі.
Граў ёй на золку сьцюдзёным ражок пастушы,
Які пані Бэйкер, прынамсі, не ўзварушыць.
Абпёршыся локцем на падаконьне й
смакуючы каву,
Яна за акном асеньнюю бачыць апраўу:
Зялёныя дахі з палоскай нэону наверсе,
Запраўка «Amoco», побач запраўка «Esso».
І там, дзе кастрычнік зыначыў клёны,
Стаіць на гарах лес цёмна-чырвоны,
Зьлёгку зацягнуты сіняй смугою. Здаецца,
Бачны ён цераз магічнае шкельца.
Звалаў пад лесам вялікія шэрыя плечы
Да занядбанай фартэцы падобныя ў нечым.
Лябёдка пад'ёмніка кружыць няспынным рухам
І пыхкае скльчаны ветрам дымок без аддухі.
Дробныя хаткі бягуць ніжэй, па ўзбочцы,
Бы выцінанка лобзікам, што цешыць вочы.
А ў дрэвах, дзе канчаецца ўжо наваколльле,
Горнае мястэчка над рэчкай сьвіціцца праз
гольле.

*Вашынгтон, 1950*

**З польскай пераклаў Алег Мінкін**

**Чэслаў Мілаш** (1911, Шатэйні, Віленшчына — 2004) — вялікі майстра літаратуры, польскі паэт, празаік, эсэіст, крытык і перакладчык. Ляўрэат Нобэлеўскае прэміі (1980).

**АЛЕСЬ АРКУШ**

УСЯСЛАЎ

**П**ерадзе шыхтоў ваярскіх,
**Е**днасьць дэманструючы і сьмеласьць,
**Р**адзімы сьцяг трымаючы ў руках,
**А**днекуль, як з самое аблачыны,
**М**істычна князь Усяслаў зьявіўся на кані.
**О**! Як прыгожа ён узьняў свой меч!
**О**! Як высока ўзьляцелі родныя аблокі!
**О**! Як сувора ў дзідах вецер адгукнуўся!
**Г**ул па шыхтох панёсься: Усяслаў!!!
**А**днолькава загрукалі ў грудзёх крывіцкіх сэрцы.



# Складаныя дачыненьні Купалы і Коласа



**УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ**

«Я старэйшы… — перадае Колас быццам бы жартаўлівыя словы Купалы пры іх першай сустрэчы, — я ўжо сваёй маці ўсьміхаўся, а ты яшчэ і разу ў калысцы ня вякнуў».

«Той-сёй можа падумаць, што паміж мною і Купалам сапраўды ляжала нейкая няпрыязьнь, — прагаворвае Колас, нібы наперад пярэчачы такому меркаваньню. — І нібыта вынікала яна праз спаборніцтва за першае месца».

Так, «той-сёй» можа такое падумаць…

Купала з Коласам пазнаёміліся, калі кожнаму было па трыццаць. Гэта нават на сёньня людзі не юначага ўзросту, а ў 1912 годзе — сталыя мужыкі. Перасьпелыя для сяброўства…

У адносінах паміж імі відавочна адно: Колас *стараўся* сябраваць. Чаго ня скажаш пра Купалу.

У траўні 1938-га Купала хварэе на крупознае запаленьне лёгкіх — і Колас амаль месяц штодня (!) наведвае яго ў шпіталі. А ў 1939-м, 23 лютага, Колас піша ў лісьце да Сяргея Гарадзецкага: «З тыдзень таму назад была тэлеграма ад Лазоўскага — прыслаць верш да XVIII зьезду партыі. Напісаў, паслаў праз Янку. А 21.02 зноў атрымліваю тэлеграму з напамінам пра высылку вершу к 25.02. Выходзіць, што Янка не перадаў…»

Колас сур'ёзна занепакоены… Бо гэта не драбяза… Лазоўскі мог і ня выслаць напамінальнай тэлеграмы, а далажыць пра невыкананьне высокага даручэньня.

Купала падводзіў Коласа не аднойчы… Не наўмысна, праз *асаблівасьць* (як заўважае Колас) *натуры,* але падводзіў. Колас дараваў, трываў. Ня вытрываў, калі Купала не пераслаў яму ліста ад сына, які бязь вестак прапаў на фронце.

Невядома, ці быў насамрэч той сынаў ліст, але Колас свой напісаў.

«Ташкент, 17 верасьня.

Дарагі Янка!

Можа, і ня варта было б пісаць табе пісьмо, бо ты ў вялікім клопаце аб сабе самім ня помніш болей нікога і на пісьмы нікому не адказваеш. Ты ў гэтым бачыш асаблівасьць сваёй натуры і, відаць, такая «асаблівасьць» расцэньваецца табою як нешта надзвычайнае, уласьцівае толькі Янку Купалу. Іначай нельга найсьці тлумачэньне таму, што ты ня дужа спяшаесься адказаць на маё пісьмо. Чатыры дні таму назад прыслаў мне пісьмо Пятрусь Броўка. Ён даведаўся пра мой адрас з таго пісьма, што я пісаў табе. Вось і бярэ мяне крыўда. І асабліва крыўдна мне, што ўзяўся ты, як піша Пятрусь, пераслаць мне пісьмо ад Юркі. А гэтага пісьма, як і ад цябе, усё няма. Ці ведаеш ты, што такое для бацькі і маткі сын, асабліва ў такі час?.. Не, Янка, ты гэтага ня ведаеш, або ў цябе няма нармальнага чалавечага сэрца. А ты ж паэт. Паэт жа, калі ён сапраўдны паэт, ёсьць рэха людзкіх пачуцьцяў, а не чарапаха, зашыўшыся ў свой тоўсты футляр, зрэдку высоўваючы сваю галаву, каб паглядзець, ці няма чым пажывіцца. Ты, Янка, ня злуйся: нічога ня зробіш, а праўда вочы коле…

Гэта маё апошняе к табе пісьмо. Пісаць і ня мець адказу на свае пісьмы — гэта тое самае, што гукаць у чыстым полі, дзе няма живое душы. Жыві здаровы. У цябе для гэтага ёсьць магчымасьці.

Бывай, Янка, здаровы.

Якуб Колас».

Ня вытрываў — і ня толькі крыўду з-за сына, а ці ня ўсё, што гадамі тузала, вярэдзіла, балела, — выказаў…

Апошні раз яны спаткаліся ў сакавіку 1942 году ў Казані, адкуль Колас напісаў жонцы ў Ташкент: «8.ІІІ. за сталом у аднаго з нашых знаёмых сустрэўся зь Янкам. Нічога асаблівага не гаварылі, не сварыліся і не дружылі».

Пасьля такога ліста — і «нічога асаблівага не гаварылі»? Так не бывае, ня можа быць. Калі ж так было, дык толькі ў адным выпадку: Колас свайго апошняга ліста да Купалы ня выслаў. Напісаў і ў стол паклаў. Гэта ў ягоным характары.

Праблема іх сяброўства ў тым, што Купала адносіўся да Коласа, як паніч да мужыка — і гэта ня самае сымпатычнае з таго, што было ў Купалу.

Пасьля сьмерці Купалы Колас піша ў лісьце (8. 07.1942) да ягонай жонкі: «Дарагая Ўладзіслава Францаўна!.. Ня верыцца мне, што ўжо ня сяду я болей побач зь Янкам за адным сталом. Але што паробіш? Так, відаць, судзіла ўжо доля. Ніколі ня думаў таксама я, што страта Янкі такім вострым нажом пройдзе па сэрцы…»

Прайшла, не магла не прайсьці… Усё, што ёсьць побыт, пазабывалася, зьнікла, засталося толькі тое, што над побытам. Паэзія, пра якую ўжо да скону будзе гаварыць Колас толькі ў зьвязку з Купалам, аддаючы яму перавагу і перад усімі, і перад сабой.

Высакародны чалавек.

Мужык.

**АДАМ ГЛЁБУС**



# Невялікае пра вялікіх

### Хакусай

Працаваць да зьнямогі, да поўнай страты энэргіі, да дрыжыкаў ва ўсім целе я навучыўся ў Кацусіка Хакусая. Ён працаваў да страты прытомнасьці. Прачытаўшы пра тое, я сам пачаў маляваць цэлымі днямі. Я першым прыходзіў у мастацкую вучэльню і апошнім сыходзіў. У прадуктовай краме куплялася булачка за 7 капеек. Яна зьядалася разам з чорным начным паветрам…
*14.02.2005, 17:37*

### Сакрат і напісанае

Чамусьці ў паводзінах Сакрата вылучаюць той факт, што ён не натаваў сваіх думак. Ён сапраўды нічога не запісваў, але напісаў Сакрат шмат, бо валодаў здатнасьцю пісаць свае думкі праз іншых.
*14.03.2005, 22:26*

### Леанарда і плесьня

Мы кавалкі сонечнага сьвятла, загуслага на кароткі час, рухомыя формы сонечнай энэргіі. Гэта так, калі бачыць сьветлае. А насамрэч мы плесьня, балотная плесьня на паверхні зямной кулі. Першы, хто заўважыў і выявіў плесьневую сутнасьць чалавечага існаваньня, быў Леанарда.
*16.03.2005, 14:55*

### Мадыльяні і цуркатаньне малака

Захапленьне ілюзорнымі каштоўнасьцямі і спакусьлівасьцямі мастацкіх вобразаў так зацягвае ў калейдаскапічны сьвет адлюстраваньняў, што часам надоўга забываесься пра смак рэальнасьці, пра жыцьцё нармальнае і грунтоўнае. Насамрэч я заўсёды любіў і люблю водар сьвежага малака, што цуркамі зьбягае з вымені ў вядро. Люблю духмянасьць гароду пасьля спорнага дажджу. Люблю простае сялянскае жыцьцё з гаспадаркаю, дзе авечкі ў цяпле вечаровага сонца выбягаюць са статку і бягуць да цябе, ведаючы, што іх чакае кавалак хлеба. Дзіўна, але багемны парыжанін Амэдэо Мадыльяні выказаў падобную думку: «Я не работнік і не гаспадар. Мастак мусіць быць вольны, не навязаны на ланцуг. Адзіны, хто вядзе нармальнае жыцьцё, — гэта селянін, земляроб».
*25.03.2005, 12:18*




Падпіска на «ARCHE»

**Часопіс «ARCHE»: з Новага году — штомесяц! Падпісны індэкс 00345.**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Малахоўскі, Рагнед. Беражніца: Вершы.** — Менск: Мастацкая літаратура, 2005. — 75 с. — (Дэбют).

У анатацыі да дэбютнага зборніка выдавецтва адзначае «разьмерна-стрыманую, бяз рэзкіх нежыцьцястойкіх наватарскіх хістаньняў» паэзію маладога аўтара. Сам паэта піша: «А побач — шматпакутная Радзіма, Паволі сонца хіліцца ад бору». Ад гэтых праклятых тэмаў беларускія аўтары ня могуць адысьці нават у лірычных зборніках. Што гэта — спэцыфіка беларускага жанру? Ужо потым, прадзіраючыся праз публіцыстыку, разумееш, што стваральнік кніжкі — сучасны аўтар. Значыць, адказваючы на пастаўленае вышэй пытаньне, мы скажам: «Таксама адзнака часу».

**Цімінская, Марыя. На струнах маёй душы: Зборнік вершаў.** — Менск: Тэхналёгія, 2005. — 98 с.

Напачатку гэтая кніжка таксама падаецца пэсымістычнай. Але паступова разумееш: аўтарка, народжаная ў 1937 г., сапраўды шмат убачыла ў жыцьці. Але заключная частка зборніка здольная зьбянтэжыць — у «Прыпеўках» паэтка проста «пахуліганіла».

**АДз**

# Беларуская «Мара»

Беларускамоўныя самотнікі атрымалі свой куток для знаёмстваў у сеціве. Праект «Мара» www.mara.by зьявіўся дзякуючы высілкам інтэрнэт-дзеяча Фэда (Хведар Караленка), творцы лічыльніка «Акавіта» і фэн-сайту «Песьняроў».

Як толькі рэсурс знаёмстваў запрацаваў, Фэд дадаў туды і сваю анкету: «І не шкадую: ужо займеў цікавае знаёмства». Стваральнік «Мары» давярае віртуальным стасункам: «Калі наладжваецца цікавая перапіска, у рэальным жыцьці людзі маюць вялікія шанцы паразумецца».

Патрэба ва ўласнабеларускім сайце знаёмстваў насьпела даўно. Попыт у Інтэрнэце на такія рэчы вялікі, а беларусы раней карысталіся расейскай сыстэмай «Мамба»: на ўсіх сайтах адны і тыя ж анкеты, а дызайн такіх праектаў амаль аднолькавы. Хведар вырашыў стварыць уласнабеларускую сыстэму. Найперш для разьвіцьця Белнэту — каб ён выглядаў поўнафарматным і цэльным.

І беларускамоўныя адгукнуліся на стварэньне свайго клюбу. З кожным днём анкет на сайце становіцца ўсё болей — за месяц працы на сайце зарэгістраваліся болей за 100 чалавек (кантактаваць можна, толькі калі атрымаеш пароль). Надалей Фэд плянуе ўвесьці дадатковыя сродкі кантактаваньня (чат). Пакуль жа працуе форум, які чытаецца з прыемнасьцю: амаль усе наведнікі выдатна валодаюць мовай і абыходзяцца бяз пошласьцяў.

Пакуль колькасьць анкет, пададзеных на «Мару» мужчынамі, утрая большая за дзявочую. Пошук на сайце можна весьці па некалькіх напрамках, улічваючы кожны фактар — ад узросту да колеру валасоў і вачэй. Таму стваральнікі праекту ўпэўнены: хто шукае — той знойдзе. У свой час.

**Сяргей Будкін**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Фэстываль «Лён» прайшоў 10 лістапада ў Беларускім цэнтры мод, што ў Менску. У час футраў і сукна льняныя ўборы выглядалі апошнім «бывай» мінулага лета.**

## «БеСТ» мае беларускую вэрсію

Дзяржаўны тэлефонны апэратар «БеСТ» адразу стварыў свой сайт у дзьвюх вэрсіях: па-беларуску і па-расейску. За беларусізацыю сайтаў кампаніяў Velcom і МТС давялося сваім часам пазмагацца. Што праўда, беларуская вэрсія грашыць некаторымі памылкамі («цякучае апытаньне»). Затое, напрыклад, месяцы называюцца ў поўнай адпаведнасьці зь беларускай традыцыяй — «травень», а ня «май».

**АШ**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Шаўчук наведаў кватэру Быкава

**Юры Шаўчук, саліст расейскага рок-гурту «DDT», перад канцэртам у Менску наведаў кватэру Васіля Быкава і сустрэўся з удавою пісьменьніка. «DDT» завяршыў тур па гарадах Беларусі, прысьвечаны 25-годзьдзю існаваньня калектыву. Асабліва Шаўчуку спадабаліся беларускія вёскі: «такие красивые» — ён нават хацеў бы пераехаць жыць сюды.**

## СПОРТ СЬЦІСЛА

### Другія

У мінулыя выходныя ў Фінляндыі наймацнейшыя хакейныя каманды Эўропы змагаліся за Кубак Кар'ялы. У гэты час нацыянальная зборная Беларусі брала ўдзел у другім этапе розыгрышу турніру для камандаў другога эшалёну — «Эўрапейскім хакейным выкліку». У турніры, што прайшоў на новай радзіме Славаміра Адамовіча, апроч беларусаў і гаспадароў брала ўдзел таксама зборная Даніі. Беларусы якраз і перамаглі датчан зь лікам 4:1, аднак прайгралі нарвэжцам зь лікам 0:4. У выніку занялі другое месца.

Наступны этап Эўравыкліку з удзелам суайчыньнікаў мае прайсьці ў лютым у Менску з удзелам Украіны, Эстоніі і Польшчы. У гэты ж час наймацнейшыя каманды сьвету будуць браць удзел у Белай Алімпіядзе ў Турыне.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Як летась

Берасьцейскі гандбольны клюб імя А.Мяшкова завяршыў выступленьні ў Лізе чэмпіёнаў. На рахунку БГК адна перамога і пяць паразаў. У апошняй гульні, што прайшла 13 лістапада, берасьцейцы ў менскім Палацы спорту перамаглі плоцкую «Віслу» зь лікам 28:22. Аднак матч ужо нічога не вырашаў.

### Піраміда ў Менску

У сталіцы прайшоў фінал Кубку Эўропы па більярдным спорце ў разрадзе «піраміда». Перамог украінец Аляксандар Бойка, які ў фінале абыграў яшчэ аднаго прадстаўніка Ўкраіны Арцёма Маісеенку. Трэцяе месца — у беларуса Аляксандра Касьцюкаўца. Падчас фінальнага этапу прайшоў таксама турнір па «біліі» — адмысловым більярдным шоў на прызы жодзінскага майстра па вытворчасьці кіёў Сяргея Каюкова.

Галоўнае спаборніцтва сэзону — чэмпіянат сьвету з 23 па 27 лістапада ў Казахстане.

**AP, belapan.com, belta.by**

ІНФАРМАТАР



Юлія Дарашкевіч

## Кадравыя агенцтвы Беларусі

Пошук працы спэцыялістамі

**«XXI стагодзьдзе-кансалт»**
218–14–56, 218–13–93, 218–13–94
www.xxiconsult.com
office@xxiconsult.com

**«2В»**
206–58–09 (для працадаўцаў)
206–63–81 (для рэзюмэ)
2v2001@mail.ru

**«Alpina consult»**
228–73–26, 228–73–25, 228–73–21
www.alpina–consult.com
job@alpina.by

**«Тут і цяпер»**
вул.Чапаева, 5, к.421
217–00–62, 236–39–11
www.zis.by
consulting@zis.by

**«Inter business consult»**
вул.Ціміразева, 65, офіс 609
209–60–86, 209–61–25
ibc@solo.by

**«Квадрат»**
226–54–74, 289–30–15
http://kvadrat.net
kvadrat@nsys.by,
personal@kvadrat.net

**«Калекцыя адкрыцьцяў»**
223–77–05, 206–47–55
www.ko.by
ko@konet.ru

**«Кансалтынгавае праектаваньне»**
пр.Ф.Скарыны, 19
228–16–65, 228–16–73, 220–34–74
www.cp2000.net/recruiting
div02@nsys.by

**«Магніфік»**
254–80–00
vibor@it.org.by

**«Служба рэзюмэ»**
вул.Маскоўская, 6–25
220–40–56
647–10–38 (аддзел рэкрутынгу)
eurobast@tut.by

**«Партнэр»**
пр.Міру, 18а, офіс 61, 212030, Магілёў
(0222)22–94–64, (0222)22–93–91, 477–32–67
logo@mail.telecom.mogilev.by

**«Пэрспэктыва»**
вул.Фабрыцыюса, 9–16
222–88–31, 222–20–24, 222–88–03

**«Прававы экспэрт»**
вул.Варвашэні, 77–420
237–84–48, 237–78–18
client2004@yandex.ru
rezume04@yandex.ru

**«Практыкум»**
вул.Інтэрнацыянальная, 11–123
220–62–05, 223–51–50
www.practicum.by
resume@practicum.by

**«ProfiGroup»**
231–32–61
rekrut@prof.by

**«Псаміт»**
вул.Гікалы, 9, к.09
239–89–87, 239–84–72, 239–89–64
psammit@anitex.by

**«Рэфэрэнт»**
269–11–53, 266–19–02
referent@iptel.by

**«Сакрэт посьпеху»**
вул.Мясьнікова, 27, офіс 1
220–04–65, 220–70–60, 220–41–28, 660–41–28
www.sekretuspeha.com
contact@sekretuspeha.com

**«Салпол-БПК»**
297–37–66, 776–92–94
www.solpol.net
rec@solpol.net

**«Стаф-юні»**
213–30–61, 284–35–27
www.stuffuni.com
staffuni@tut.by

**«Юпас»**
вул.Першамайская, 77, Магілёў
284–92–06, 284–74–37
(0222) 25–60–48, (0222) 25–60–47
shipjob@mail.ru

КАІСА

# Аргентынская ўзнагарода

У пачатку лістапада ў Аргентыне прайшоў чарговы кангрэс ІКЧФ — Міжнароднай фэдэрацыі завочных шахмат. Дэлегат Беларусі ня браў удзелу ў дыскусіях і выбарах: голас нашай краіны быў даверany Сяргею Гродзенскаму, кіраўніку расейскай Асацыяцыі гульні праз перапіску. На кангрэсе выбралі новага прэзыдэнта ІКЧФ — ім стаў Махамэд Самраўі, грамадзянін Нямеччыны альжырскага паходжаньня. Нямеччына — краіна, дзе гульня ў шахматы праз перапіску папулярная як мала дзе, таму выбар аказаўся даволі заканамерны.

Прыемнай нечаканасьцю Кангрэсу — у тым ліку для самога ляўрэата — было ўганараваньне міжнароднага гросмайстра, аўтара «НН» Зьмітра Лыбіна сярэбраным мэдалём імя Бэртль фон Масаў за ўнёсак у разьвіцьцё завочных шахмат. Сп.Лыбін жыве ў Менску, яму 42 гады. З падачы трэнэраў Артура Белавусенкі і Ўладзімера Някрасава ён захапляецца гульнёй праз перапіску амаль тры дзесяцігодзьдзі, гуляў нават у войску (бяз дошкі!). У беларускай фэдэрацыі адказвае за сувязі з замежжам — ён і быў тым самым дэлегатам Беларусі, які не паехаў за акіян. Актыўна і пасьпяхова выступае ў спаборніцтвах рознага ўзроўню, аж да турніру прэтэндэнтаў на першынство сьвету. Не забываецца і на студэнтаў Беларускай акадэміі музыкі, дзе выкладае інструмэнтоўку, чытаньне аркестравых партытур, складаньне. Сам складае фартэпіянныя творы, выконваючы іх на міжнародных фэстывалях.

Нядаўна на турніры, прысьвечаным стагодзьдзю Фэдэрацыі завочных шахмат Даніі, Зьміцер Лыбін адолеў Ёрна Слота, восьмага чэмпіёна сьвету ў гульні праз перапіску. «Як гэта і бывае на высокім узроўні, ён не зрабіў яўнай памылкі, а толькі тры недакладнасьці ў манэўрах слана. Замест хадоў у партыі лепш было гуляць 15. Ce3, 18. Cc5, 19. Ce3», — міралюбна зазначыў пераможца.

**Ё.Слот — З.Лыбін, 2004—2005.** Абарона Грунфэльда [D76]

1. d4 Kf6 2. c4 g6 3. Kf3 Cg7 4. g3 0–0 5. Cg2 d5 6. cd Kd5 7. 0–0 Kb6 8. Kc3 Kc6 9. e3 Te8 10. d5 Ka5 11. Kd4 Cd7 12. e4 c5 13. Kf3 e6 14. Cg5 f6 15. Cf4 ed 16. ed g5 17. Ce3 Kbc4 18. Cc1 Kd6 19. h4 g4 20. Kh2 f5 21. Cg5 Фb6 22. Tb1 Kac4 23. Фc1 Фa5 24. Ch6 Cf6 25. Cf4 b5 26. Cd6 Kd6 27. Фf4 Ce5 28. Фg5+ Cg7 29. a3 b4 30. ab cb 31. Ta1 Фd8 32. Фd8 Tad8 33. Ka4 Tc8 34. Tfd1 f4 35. gf Tf8 36. Kf1 Tf4 37. Ke3 Cd4 0–1.

Павучальна прасачыць, як чорныя фігуры і пешкі з усіх бакоў ціснуць на цэнтар белых, — прахадная на d5, надзейна заблякаваная, аказалася слабасьцю. Хады 16…g5, 19…g4 вымагалі далёкага разьліку, бо з «агульных меркаваньняў» рушыць пешку, што прыкрывае караля, небясьпечна. Мабыць, беларускі гулец кіраваўся запаветам Уладзімера Каратевіча «Рабі нечаканае, рабі, як не бывае, рабі, як ня робіць ніхто, — і тады пераможаш». У фінальнай пазыцыі сілы белых настолькі разьяднаныя, што ад насоўваньня той самай пешкі на g3 няма прымальнай абароны. Напэўна, пасьля гэтай партыі абарона Грунфэльда, і без таго папулярная ў асяродзьдзі сучасных гульцоў, ператворыцца ў гіт беларускіх завочнікаў.

**ВР**

P.S. Мы папрасілі сп.Лыбіна паказаць узнагароду, аднак ляўрэат пакуль не атрымаў свайго мэдаля, названага ў гонар выдатнай аргіназаткі, жонкі трэцяга прэзыдэнта ІКЧФ Вэрнэра фон Масаў. Кажа, паедзе па яго ў Маскву да доктара Гродзенскага.



**Як бы вы згулялі?**

Зэміш—Німцовіч, Капэнгаген, 1922. Ход чорных.

**Адказ:** 1...b6! і белым няма чым хадзіць. Амаль як у партыі Слот —Лыбін.

ВАРТА БАЧЫЦЬ

### Пятніца, 18 лістапада

**БТ, 22.00**

«Улада агню».

Вялікабрытанія—Ірляндыя—ЗША, 2002, рэж. Роб Баўман.

Фантастычны баявік.

2020 год. На Зямлі пануюць цмокі, Лёндан спалены, людзі хаваюцца ў руінах. І толькі паляўнічыя на цмокаў пад кіраўніцтвам Куіна і Ван Зана здольныя выратаваць чалавецтва.

Відовішчная й вынаходлівая фантастыка. Адмысловыя эфэкты стварылі Алекс Бартш і Давід Гацье (яны таксама спрычыніліся да здымак «Сакрэтных матэрыялаў»). У ролях: Мэцью Макконахі («Кантакт»), Крысьціян Бэйл («Амэрыканскі псыхапат»), Ізабэла Скарупка («Агнём і мячом»).

**АНТ, 22.25**

«Герой».

Кітай, 2002, рэж. Чжан Імоў.



Гістарычны ўсходні баявік, прыпавесьць.

Да першага кітайскага імпэратара прыходзіць воін, які зьнішчыў усіх засланых да ўладара забойцаў. Невядомы расказвае пра свае перамогі, але імпэратар падазрае пастку…

Неймаверна прыгожая й філязофская карціна Чжана Імоў («Чырвоны гаалян»). Шэрыя й чырвоныя колеры імпэрскай арміі, нябесная й сьветлая прырода, мэдытацыя баёў — і пакута помсты…

### Субота, 19 лістапада

**АНТ, 14.10**

«Ізноўгуд, ці Каліф на гадзіну».

Францыя, 2005.

Камэдыя па матывах комікса Рэнэ Гасыні і Жана Табары.

Кепскі візір Ізноўгуд зьбіраецца захапіць трон і сапсаваць 250-е вясельле каліфа. Але візір не ўлічыў, што наіўныя прынцэсы ня ўмеюць хаваць тайны.

Папулярнага ў Францыі Ізноўгуда прыдумаў пісьменьнік Р.Гасыні — аўтар Астэрыкса й Абэлікса.

У казачным блёкбастэры здымаліся больш за 8 тысяч актораў.

Сярод спэцэфэктаў — джыны, паветраныя дываны, магрыбскія чараўнікі, гаваркія жабы — і фрывольны францускі гумар.

**БТ, 16.35**

«СВ. Спальны вагон».

Расея, 1989, рэж. Уладзімер Хаціненка, Віялета Сядова.

Камэдыя сытуацый, фантасмагорыя.

У спальным вагоне чатыры пасажыры высьвятляюць, што калісьці моцна насалілі адзін аднаму.

Глючны перабудовачны фільм, дзе вадзёвільная гісторыя ўмалімоненая зданямі Сталіна, Альфрэда Хічкока, кароваю ў цягніку — і праваднікам-прэпаратарам.

У ролях: Уладзімер Ільлін, Сьвятлана Кручкова, Яўген Сьцяблоў.

**«Лад», 18.25**

«Сьвежына з салютам».

Беларусь, 2001, рэж. Іван Паўлаў.

Камэдыя.

На Каляды ў вёску прыяжджае сын аднаго з герояў. Сваякі зьбіраюцца закалоць кабанчыка…

Каляніяльная камэдыя, дзе беларушчына зьведзена да этнаграфічнага гета. Але фільм цалкам па-беларуску.

**АНТ, 22.05**

«Кіднэпінг».

Расея, 2003, рэж. Вольга Марчанкова–Перуноўская.

Крымінальная драма.

Маладыя гангстэры скралі дачку дырэктара рэклямнага агенцтва й запрасілі за яе мільён даляраў.

Фільм паставіла беларуская рэжысэрка В.Марчанкова («Паскораная дапамога»), а адну з роляў сыграў Анатоль Кот.

### Нядзеля, 20 лістапада

**БТ, 23.00**

«Шчырае прызнаньне».

Францыя, 2004, рэж. Патрыс Леконт.

Сэнтымэнтальны трылер.

Таямнічая незнаёмка перабліла офіс з пакоем псыхааналітыка і даверыла самыя інтымныя тайны няпрыкметнаму клерку Ўільяму.

Аўтар лірычных фільмаў Патрыс Леконт намінаваны на «Залатога мядзьведзя» Бэрлінскага кінафэстывалю. Намінацыя на Эўрапейскую кінапрэмію ў катэгорыі «Прыз глядацкіх сымпатый».

**Андрэй Расінскі**

## ПРЭЗЭНТАЦЫІ




У пятніцу, **18 лістапада**, у бібліятэцы Дому літаратара (вул.Фрунзэ, 5) адбудзецца прэзэнтацыя кнігі выбраных твораў **Кастуся Акулы** «Россыпы», прысьвечанай 80-годзьдзю аўтара. Слова пра аднаго з выбітных прадстаўнікоў літаратуры беларускага замежжа скажуць вядомыя літаратуразнаўцы і пісьменьнікі: **Вольга Іпатава, Алесь Пашкевіч, Уладзімер Арлоў**... Удзел бяруць беларускія барды. **Пачатак а 18-й.**

## ІМПРЭЗЫ

**Клезмэр-фэстываль**

**23—24 лістапада** ў Палацы культуры прафсаюзаў (пр.Скарыны, 25) пройдзе міжнародны фэстываль габрэйскай этнічнай музыкі. «Klezmer Шок», Майкл Альпэрт (ЗША), Поль Бродзі (Нямеччына), «Dobranotch» (Расея), Аляксей Розаў (Расея), «Minsker Kapelye» (Беларусь), Іван Жук (Расея), Яніз Іцхак (Ізраіль). Квіткі: 9 000—27 000.

## ТЭАТАР

**Опэра**

*(На сцэне Беларускай дзяржаўнай філярмоніі)*

**18** (пт) — канцэрт сымфанічнага аркестру Беларускай опэры.

**Купалаўскі тэатар**

**19** (сб) — «Сымон-музыка».
**21** (пн) — «Чычыкаў».
**23** (ср), **24** (чц) — «Тутэйшыя».
**25** (пт) — «Чорная панна Нясьвіжу».
**26** (сб) — сьвяточны вечар, прысьвечаны 85-годзьдзю тэатру імя Янкі Купалы.
**27** (ндз) — «Кім».

**Ранішнія спэктаклі**

**27** (ндз) — «Ажаніцца — не журыцца».

**Дзённыя спэктаклі**

**20** (ндз) — «Сымон-музыка».

**Малая сцэна**

**27** (ндз) — «Адчыніце кантралёру!».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**17** (чц) — «Майстар галаданьня».
**18** (пт) — «Жанчыны Бэргмана».
**19** (сб) — «Паўночная цішыня».
**20** (ндз), **27** (ндз) — «Адэль».
**22** (аўт) — «Трыбунал».
**23** (ср) — «Адвечная песьня».
**24** (чц) — «Кабала сьвятош».
**25** (пт) — «Містэр Розыгрыш».

**Тэатар Горкага**

**17** (чц), **26** (сб) — «Вольны шлюб».
**18** (пт) — «Тэрмінова патрабуецца… самагубца».
**19** (сб) — «Суцяшальнік удоў».
**20** (ндз) — «Дзядзькаў сон».
**22** (аўт) — «Адзіны спадчыньнік».
**23** (ср) — «Выпадковы вальс».
**24** (чц) — «Прыбытковае месца».
**25** (пт) — «Ніначка».

**Тэатар лялек**

**17** (чц) — «Боская камэдыя».
**18** (пт) — «Чайка. Спроба прачытаньня».

**Тэатар кінаактора**

**17** (чц), **18** (пт) — «Востраў нашай надзеі».
**19** (сб) — «Айсэдора, танец любові».
**20** (ндз) — «Пігмаліён».

## ВЫСТАВЫ

**Напярэдадні Калядаў**

**З 23 да 26 лістапада** ў НВЦ «Белэкспа» (Я.Купалы, 27) пройдзе XII Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Турбізнэс-2005».

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**«Трыклініі»** (218-25-73)
**17** (чц) 18.00 — «Pre-party».
**18** (пт) 21.00 — «successful»: dj Strike (Кіеў), dj Woodoo (Кіеў), dj Yavorski.
**19** (сб) 18.00 — «Pre-party».

**«Bronx»** (288-10-61)
**17** (чц) 22.00 — «Arabic Thursdays»: dj Mitya.
**18** (пт) 22.00 — жывая музыка: Тані Фарэда / dj Grizzly.
**19** (сб) 22.00 — «Fashion Party II»: dj Matt Brown (Вялікабрытанія), dj Arsenti Tchouprina, dj Top.
**20** (ндз) 19.00 — нядзельны кінасэанс.

**«Izюм»** (206-66-18)
**17** (чц) 23.00 — «R'n'birthday izum»: dj Baks (Масква).
**18** (пт) 23.00 — «Fire party» — Изюм 1 Year: dj Анрылаў (Масква), dj Smith.
**19** (сб) 24.00 — dj Losev (Масква).
**20** (ндз) 21.00 — жывая музыка.

**«Madison»** (219-00-10)
**17** (чц) 22.00 — «Lady's Thursday»
**18** (пт) 23.00 — канцэрт «A'Studio».
**19** (сб) 23.00 — dj Nice.
**20** (ндз) 23.00 — «Staff party».

**«Presto»** (232-54-49, 232-15-79)
**18** (пт) 23.00 — «San-Francisco calling»: dj Grizzly, dj Bergamo.

**«X-Ray»** (223-93-55)
**18** (пт) 23.00 — dj Top.
**19** (сб) 22.00 — dj Grizzly.

**«Белая вежа»** (336-70-75)
**18** (пт) 23.00 — dj Dee.
**19** (сб) 1.00 — dj Alex.
**20** (ндз) 23.00 — жывая музыка: «Acoustic Band» / dj Alex.

**«WestWorldClub»** (239-17-98)
**19** (сб) 23.00 — Resident dj.

## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Трымайся да канца»***: **18** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **19, 20** (сб, ндз) 19.00.
«Сардэчна запрашаем у Рай!»: **18** (пт) 16.20; **19, 20** (сб, ндз) 14.00, 16.20.
«Doom» (прэм'ера): **19, 20** (сб, ндз) 13.00 (іл), 15.00, 17.00, 21.00.
«Стоенае»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (пт) 18.40, 20.40.
«Напятая цеціва»*** («Кінафармат 4х4»): **19** (сб) 18.40, 20.40.
«Пярэваратні»*** («Кінафармат 4х4»): **20** (ндз) 18.40, 20.40.

**«Бярэсьце»** (272-87-91)
«Місія «Сэрэніці»: **18** (пт) 18.50 (іл), 21.10; **19, 20** (сб, ндз) 14.00, 16.30, 18.50, 21.10.

**«Дом кіно»** (266-35-26)
«Легенда Зора» (прэм'ера, 2с): **18** (пт) 16.30 (іл), 19.00, 21.30; **19** (сб) 19.00, 21.30.
З **20 лістапада** — кінафэстываль «Лістапад-2005». Конкурсны прагляд фільмаў фэстывалю.

**«Дружба»** (240-90-13)
«9-я рота»***: **18—20** (пт—ндз) 16.00 (іл), 21.00.
«Місія «Сэрэніці»: **19, 20** (сб, ндз) 18.30.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Сардэчна запрашаем у Рай!»: **18** (пт) 14.20, 16.40, 19.00, 21.10; **19** (сб) 14.20 (іл), 16.40, 19.00, 21.10.
З **20 лістапада** — кінафэстываль «Лістапад-2005». Конкурсны прагляд фільмаў фэстывалю.

**«Масква»** (203-14-48)
«Сардэчна запрашаем у Рай!»: **18** (пт) 19.00, 21.10; **19, 20** (сб, ндз) 14.30 (іл).
«Doom» (прэм'ера): **19, 20** (сб, ндз) 17.00, 19.00, 21.00.

**«Мір»** (288-22-33)
«9-я рота»***: **18—20** (пт—ндз) 16.30, 19.00.
«Кроў за кроў»***: **18—20** (пт—ндз) 21.30.
«Doom» (прэм'ера): **19, 20** (сб, ндз) 16.00, 22.30.
«Пярэваратні»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (пт) 16.00, 18.30, 20.30.
«Стоенае»*** («Кінафармат 4х4»): **19** (сб) 18.30, 20.30.
«Час разьвітаньня»*** («Кінафармат 4х4»): **20** (ндз) 18.30, 20.30.

**«Перамога»** (203-77-66)
«9-я рота»***: **19** (сб) 14.10 (іл); **20** (ндз) 13.40 (іл), 16.20.
«Напятая цеціва»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (пт) 17.00, 19.00, 21.00.
«Час разьвітаньня»*** («Кінафармат 4х4»): **19** (сб) 17.00, 19.00, 21.00.
«Стоенае»*** («Кінафармат 4х4»): **20** (ндз) 19.00, 21.10.

**«Піянэр»** (227-64-87)
«Перакладчыца»***: **18** (пт) 14.30, 16.30; **19, 20** (сб, ндз) 16.30.
«Правілы сэксу-2: хэпі-энд»: **18—20** (пт—ндз) 18.30, 21.00.

**«Цэнтральны»** (200-34-16)
«Місія «Сэрэніці»: **18** (пт) 11.00, 13.20; **19** (сб) 11.00 (іл), 13.30; **20** (ндз) 11.00 (іл), 13.20.
«Час разьвітаньня»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (пт) 15.30, 17.30, 19.30, 21.30.
«Пярэваратні»*** («Кінафармат 4х4»): **19** (сб) 15.50, 18.30, 21.00.
«Напятая цеціва»*** («Кінафармат 4х4»): **20** (ндз) 15.30, 17.30, 19.30, 21.30.

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці
(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 гадоў не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 гадоў.




## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Тэатар**

**Тэатар юнага гледача**

**17** (чц) — «Палачанка».
**18** (пт) — «Паліяна».
**19** (сб) 11.00, 14.00 — «Неймаверныя прыгоды Мішуткі і яго сяброў у краіне казак».
**19** (сб) 19.00 — «Маленькія трагедыі».
**20** (ндз) 11.00, 14.00 — «Шлях на Бэтлеем».
**20** (ндз), **27** (ндз) — «Гісторыя каханьня Паласатага Ката і сэньярыты Ластаўкі».
**25** (пт) — «Сястра мая Русалачка».
**26** (сб) 10.30, 13.00 — «Залатое сэрцайка».
**26** (сб) 16.00 — «Паліяна».
**27** (ндз), 11.00, 14.00 — «Папялушка».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**19** (сб), **26** (сб)— «Воўк-мараплавец».

**Тэатар лялек**

**19** (сб) — «Кот у ботах».
**20** (ндз) — «Тры парсючкі».
**24** (чц), **25** (пт) — лялечны канцэрт «На стол пададзена!».
**26** (сб) — «Чараўнік Смарагдавага гораду».
**27** (ндз) — «Чырвоны каптурок».

**Кіно**

**«Аўрора»**
«Ліла і Стыч»: **18** (пт) 14.30; **19, 20** (сб, ндз) 12.00.

**«Бярэсьце»**
«Скарб Амазонкі»: **18** (пт) 15.00.
«Карпарацыя монстраў»: **19, 20** (сб, ндз) 12.00.

**«Дом кіно»**
«Табе патрэбна шчаня?»: **18** (пт) 14.00 (адкрыцьцё кінафэстывалю дзіцячага і юнацкага кіно «Лістападзік-2005»).
«Маленькія ўцекачы» («Лістападзік-2005»): **19** (сб) 14.00.
«Італьянец» («Лістападзік-2005»): **19** (сб) 16.00.

**«Дружба»**
«Прыгоды піратаў у краіне агародніны»: **18** (пт) 12.00, 14.00; **20** (ндз) 11.00, 13.00.
«Зорка Вэнэра»: **19** (сб) 11.00.
«Сардэчна запрашаем у паўналецьце»: **19** (сб) 13.00.

**«Масква»**
«Гуляй як Бэкхэм»: **18** (пт) 15.00; **20** (ндз) 12.00.

**«Мір»**
«Мой брацік — сабачка»: **19, 20** (сб, ндз) 14.00.

**«Перамога»**
«Хадзячы замак»: **18** (пт) 14.40; **19, 20** (сб, ндз) 11.30.

**«Піянэр»**
«Бэтховэн-2»: **18** (пт) 11.00; **19, 20** (сб, ндз) 10.30.
«Вэліянт: птушыны спэцназ»: **18** (пт) 12.50; **19, 20** (сб, ндз) 14.30.
«Табе патрэбна шчаня» («Лістападзік-2005»): **19** (сб) 12.20.
Зборнік мультфільмаў («Лістападзік-2005»): **20** (ндз) 12.20.

## КІНО НА DVD

**Master Records**

**«Белая зямля»**

Крымінальная трагікамэдыя, ЗША, 2005, рэж.**Марк Майлад.**

У ролях: **Робін Ўільямз, Ўудзі Гарэлсан, Холі Гантэр.**

Каб атрымаць страхоўку, герой выдае знойдзены труп за зьніклага брата. Але па нябожчыка заяўляецца пара бандытаў. Потым — сам брат.

Менск, Кісялёва, 12, 643-21-08




### Скокі пад дуду

**25 лістапада** ў кавярні Палацу моладзі (Старавіленскі тракт, 41) адбудзецца танцавальная вечарына «Скокі пад дуду». Іграе і навучае танцам капэля Алеся Ляся. Жывое гучаньне старажытных інструмэнтаў, народныя танцы ва ўтульнай кавярні. Пачатак а 18-й. Квіткі: 4 тыс. рублёў.

Даведкі праз тэл.: 262-02-90, 8-029-253-07-95

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

**«Хадзячы замак»**
(«Hauru no ugoku shiro»)

Японія, 2004, каляровы, 119 хв.

**Жанр:** анімэ, казачна-паэтычныя прыгоды паводле раману Д.Джоўнз.

**Адзнака:** 9 (з 10).

### Но ўгоку шыра

Злая Вядзьмарка Пусткіператварыла 18-гадовую Сафі ў старую, прыраўнаваўшы гераіню да чараўніка Хаўла. Старая Сафі наймаецца ў палац Хаўла прыбіральшчыцай і дамаўляецца з хатнім агеньчыкам Кальцыфэрам аб дапамозе.

У японскай анімацыі ёсьць жанр фантастычных фільмаў, дзе дзеяньне адбываецца ў XIX ст. і рэтрамашыны суседнічаюць з чарадзействам. Фэнтэзі брытанкі Даяны Джоўнз зьявілася сыравінай для японскага шэдэўру Хаяа Міядзакі з кактэйлем магіі й тэхналёгіі, дзе самалёты віктарыянскай эпохі лётаюць з прывідамі.

Але самае незвычайнае і дзівоснае — мэханічны Замак, з іржавымі комінамі, сталёвым языком і на курыных лапках. У адрозьненьне ад хаты бабы-ягі, Палац не саромеецца тэхнікі, любіць павандраваць ды з улікам памераў мае ня дзьве, а чатыры лапы.

Міядзакі стварыў ня проста чараўнічую прыпавесьць. Фільм — паэтычная антываенная казка. У краіне магіі й рэтрамоды ідзе вайна, страшная й бессэнсоўная, дзе чараўнікі мабілізаваныя на вайсковую службу. Але зло тут не перамагае. Нават злая ведзьма стане бясшкоднай бабулькай з пацешнымі звычкамі.




Фільм — псыхалягічная дакладнасьць, неймаверная прамалёўка дэталяў, ашаламляльная фантазія — і цяпло дабрыні.

Карціна, якую ні ў якім разе ня варта прапускаць.

**Андрэй Расінскі**

# Aux armes, citoyens!

ЛЕВЫМ ВОКАМ



Пагромы — адзіны сродак для беларускіх чыноўнікаў прабіць жалезную візавую заслону. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

У сакавіку майго знаёмага абламалі з францускай візай. Спаткаў яго пасьля на «Ўзвышшы», дзе ён, запіваючы крыўду, роў: «Ня трэба нам бераг турэцкі!» У сп.Чаргінца не такія моцныя нэрвы. Замест таго каб мужна нажэрціся пасьля таго, як яго кінулі зь візай у ЗША, аўтар «Вам — заданьня» заклікаў МЗС больш жорстка падыходзіць да пытаньня аб наданьні права ўезду ў краіну замежным палітыкам.

Эфэкт дэмаршу наўрад ці будзе моцны. Калі дапусьціць, што Тоні Блэр вядзе дзёньнік, ня думаю, што на мінулым тыдні ў ім зьявіўся запіс: «10.11.05. Пасьля заявы Чаргінца ніколі ў жыцьці не змагу ўбачыць сваіх куміраў з «Зорнага дыліжансу».

На месцы «неўязных» я б зьвярнуўся да вопыту абарыгенаў парыскіх прадмесьцяў. Хіба яны не такая ж каста «недатыкальных», як і нашы мандарыны? Так яны й жылі ў сваім гета, пакуль не пачалі ўзбухаць. Натуральна, цяпер іх праблемы заўважылі. Пагромы — адзіны сродак для чыноўнікаў прабіць жалезную візавую заслону. Хочаце ў Шэнген? У такім разе выпускі «Эўраньюс» сама меней месяц павінны пачынацца рэпартажам: «Працягваюцца антышыракаўскія пагромы ў менскім прыгарадзе Дразды. Паводле чутак, іх прычынай стала няшчаснае здарэньне: кававарка францускай фірмы «Moulinex» стукнула токам аднаго з дэпутатаў палаты прадстаўнікоў. Гэта стала апошняй кропляй для зацюканых эўрапейскімі санкцыямі беларускіх кіраўнікоў. Начамі дэпутаты палаты і члены ўраду, узброіўшыся клюшкамі, бегаюць па квартале і паляць тачкі. Спэцназ бясьсільны».

Натуральна, спачатку заходняя прэса будзе асьвятляць пагромы ў Драздах у тым жа духу, у якім «Саўбелка» асьвятляе хваляваньні ў Францыі. Пісаць, што «пагромшчыкам у ЭЗ трэба аднаго: палапаць бляндынак». Каб замаўчаць праўду, у ход пойдзе байка аб рэлігійнай змове. «Банды пажылых праваслаўных атэістаў сёньня тэрарызуюць Дразды. Заўтра — каталіцкая Эўропа?» Які-небудзь хвацкі пісака, як і яго калега ў «СБ», закліча вырашыць пытаньне «хірургічным сродкам» — дэпартаваць драздоўскую шпану з Эўропы на гістарычную радзіму — у Кенію, дзе ў Алдувайскай даліне, як лічыцца, зьявіўся першы гома сапіенс.

Аднак, паколькі ў эўрапейскім дыскурсе пераважаюць сэнтымэнтальныя левыя, хутка настрой зьменіцца. Пачнуцца перамовы, падачкі і нарэшце доўгачаканыя, прыемна пахнучыя візы.

Дык што, сп.Чаргінец, будзем далей заявы прымаць ці ў краму — купляць клюшкі?



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**У аўторак музыка «N.R.M.» і «Гарацкіх» Піт Паўлаў шукаў дзяўчыну, каб зьняць у кліпе на сваю песьню «Кілбасіць і плюшчыць». На кастынг у менскую кавярню «Д'ом» прыйшлі аж 24 прэтэндэнткі. Скончылася ўсё фуршэтам. Ці выбраў каго Піт — невядома.**

## ЖАРТ

Д'Артаньян хацеў паехаць па падвескі для каралевы, але ў перадмесьцях Парыжу арабы спалілі яму каня.

## К О Ш Т Ы

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на с. 24

**Рэклямныя расцэнкі:**

— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.
За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 4000 руб.
Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 $см^2$ — 650 руб.
Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.
Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764.
На зваротным баку блянка паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».

**Даведкі праз т. (017) 284-73-29**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншуем Міколу Астрэйку** з Днём народзінаў і зычым, каб мужнасьць ніколі не пакідала яго ў змаганьні за Беларусь!

**Любага мужа** і тройчы тату Міхася Лебедзя і яго маму віншуем з Днём народзінаў! Жадаем зорнай пасьпяховасьці і сонечнага цяпла. Сям'я Лебедзяў

### КАНТАКТЫ

**Студэнт** (II курс Міжнароднага экалягічнага ўнівэрсытэту) шукае працу вечарамі, у выходныя. Т.: 509-67-35. Кастусь

**Пазнаёмлюся** зь беларускамоўным менчуком-удаўцом 50—55 гадоў, які ня мае глябальных невырашальных праблем і марыць пра новую сям'ю. А/с 217, Менск-114

### КРЫЖАВАНКІ

**Спадарства!** З 2006 г. выдавецтва «Магазин кроссвордов» пачынае выпуск беларускамоўнага выданьня «Крама крыжаванак». Дасылайце свае прапановы і крыжаванкі на адрас рэдакцыі. Даведкі праз тэл.: 214-95-65

### АНТЫСНІД

**2 сьнежня** ў клюбе «Рэактар» адбудзецца АнтыСНІДаўскі фэст з удзелам гуртоў «ТТ-34», «Куклы», «Partyzone» і інш. Пачатак у 18.00. Кошт квіткоў: 10 000 (танцпол), 15 000 (столік). Т.: 649-08-88, 766-24-25

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Прапаную**: «Беларускі клясычны правапіс», «Нашу Ніву» (факс. выд.), «Матэматычную энцыкляпэдыю», дзіцячыя кніжкі, пісаныя клясычным правапісам, камплект падручнікаў па старабеларускай, старарускай мовах і іншае. Т.: 753-91-96

**Даведнік** «Архівы Рэспублікі Беларусь», «Историография и генеалогия Беларуси X—XXI веков». Т.: 753-91-96

**Пэрыёдыка**: шматгадовы камплект часопісаў «Крыніца», розныя нумары «Студэнцкай думкі», «ARCHE», газэты «Новы час», «Нашага слова», беластоцкай «Нівы», што-небудзь падару. Т.: 753-91-96.

**Прадам кнігі**: «Беларускі арнамэнт» Кацара, «Змагарныя дарогі» К.Акулы, «Споведзь» Л.Геніюш; з сэрыі «Беларускі кнігазбор» — «Летапісы і хронікі», Ян Баршчэўскі, Гётэ, «Філяматы і філярэты»; «Беларуска-расейскі слоўнік» Байкова, Некрашэвіча; Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі, 2-гі, 5-ты тамы ды шмат іншага. Т.: 753-70-05

**Газэты**: «Наша Ніва», «Ніва» (беластоцкая), часопісы: «ARCHE», «Друвіс», «Хрысьціянская думка», «Спадчына» (старыя і новыя нумары); кнігі, тэрміналягічныя слоўнікі, музыка ды фільмы на CD, мультфільмы на касэтах на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак—пятніца (15.00—19.20). Т.: 707-40-01

**Прадам энцыкляпэдыі**: «Археалёгія і нумізматыка Беларусі», «Этнаграфія Беларусі», «Археалёгія Беларусі» (2-гі, 4-ты тамы), «Расейска-крыўскі слоўнік» В.Ластоўскага, слоўнік Байкова і Некрашэвіча. Т.: 234-93-71, 707-40-01 (Сяржук)

**Выйшлі новыя дыскі «**БМА Group»: Данчык — «Я ад вас далёка», «Палац» — «Folk Modern», «Kriwi» — «Гэй Лёлі», Кася Камоцкая — «Акустыка» і інш. Прапануем заробак распаўсюднікам зь Менску і рэгіёнаў. Па пытаньнях набыцьця дыскаў зьвяртайцеся: тэл.: 649-08-88, e-mail: w1979@tut.by, а/с 5, 220085, Менск

### ПРАЦА

**Тэрмінова патрэбны** будаўнік і электрык бяз шкодных звычак, ва ўзросьце да 25 гадоў, якія пражываюць у Менску. Т.: 755-80-01

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17.00. Т.: 235-18-72. Юры

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

### Не пашэнціла небаракам зь яечняй

На **Даўгінаўскім тракце**, недалёка да Менску, завяліся такія майстры, што пераймаюць людзей на дарозе. Аднэй ноччу пераняλі яны гаспадара, каторы ехаў да Менску, і адабралі ў яго 70 яек ды паставілі ў свой воз, на каторым было зложана некалькі снапоў крадзенага аўса. Пры гэтым яны ўзялі па абмылцы пугу таго гаспадара, а сваю аставілі ды згубілі два снапы аўса. Назаўтра гаспадар, у каторага быў украдзены авёс, па гэтых снапох знайшоў злодзеяў. Тады ўзяўся і той, у якога адабралі 70 яек, і хоць яны аддалі яму 20 рублёў, гэта не дапамагло, і іх павезьлі ў Менск у астрог. Не пашэнціла небаракам зь яечняй.

**Пераеждждж.**

### Паштовая скрынка

**Аньне Ст-ч, Барысаў.** Вы напісалі верш па-беларуску, а ліст у чужой мове. Пішыце па-беларуску — разьбяром!

Хто ня здолее адзін плаціць за «Нашу Ніву», хай знойдзе яшчэ колькі людзей і выпіша газэту хаўрусам.

**1910, №43.**


**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3411. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 20.00 16.11.2005.

Замова № 6566.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а